ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№4 (1015), КРАСАВІК, 2018
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка, эканоміка, культура
ISSN 0320-7544



# ПАРТНЁРЫ Ў ЛІЧБАВЫМ АСЯРОДДЗІ

АКЦЭНТ
СТАР. 22-29

INTERNATIONAL

# The Minsk Times

Socio-political Weekly

## Пра падзеі ў Беларусі і свеце

# Штотыднёвік, які чытаюць у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску
Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ




**14** **Звоняць званы Хатыні** Пяць, чатыры, тры, два, адзін... Зваротны адлік кіламетраў пасля з'езду з трасы Мінск — Віцебск толькі пачашчае сэрцабіццё перад сустрэчай з мемарыяльным ансамблем "Хатынь". Семдзесят пяць гадоў таму гэтым жа шляхам рухаліся ў бок вёскі са зброяй у руках гітлераўскія карнікі. Хатынь была сцёрта з твару зямлі, спалена разам з хатамі і жыхарамі




**18** **"Брава! Здарава! Малайцы!"**

**20** **Навошта экспарцёрам патрэбна нацыянальная вітрына** Беларусь актыўна рыхтуецца да Сусветнай выставы "ЭКСПА-2020", якая будзе праходзіць з кастрычніка 2020 па красавік 2021 года ў Дубаі

**24** **Калі канкурыраваць — то ва ўсім свеце**

**26** **Калі мяняюць карту на гаджэт** Пераход ад наяўных грошай да электроннай формы аплаты — сусветная тэндэнцыя

**30** **"Ветландс" — на карысць экалогіі** Пяцігадовы праект ПРААН з бюджэтам амаль у пяць мільёнаў долараў дапаможа Беларусі не толькі зрабіць кіраванне ляснымі і балотнымі экасістэмамі больш устойлівым у фінансавых адносінах, але і больш эфектыўным для захавання расліннага і жывёльнага свету

**34** **Батарэі просяць графіту** Літыевую залежнасць можна пераадолець, лічаць беларускія навукоўцы

**36** **Атамная станцыя ў Астраўцы: у люстэрку сучасных тэхналогій**

**38** **У беларускім Кувейце "чорнае золата" — ... белае**

**40** **Урачы на парозе эры адкрыццяў**

**48** **Цікавыя хронікі Вялікага** Вялікі тэатр Беларусі — гэта не толькі рэпертуарныя і прэм'ерныя спектаклі, але і многія іншыя цікавыя ды крэатыўныя праекты




**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 4 (1015), красавік, 2018**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия", ААТ "Белзнешэканамбанк"

**Рэдактар**
Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**"Беларусь.Belarus"** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай, кітайскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **"Беларусь. Belarus"** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия".
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10ª,
220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004.
Пр-т Незалежнасці, 79,
г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 22.03.18 г.
Выпуск у свет 29.03.18 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60х90 1/8.
Друкаваных аркушаў 7.
Гарнітура Міньён.

**Заказ №788**
**Агульны тыраж** — 2312 экз.
(на беларускай мове — 169)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а
г. Мінск, Беларусь, 220013.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24,
+375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by

**Падпісны індэкс** — 74820.

**Цана дамоўная.**

© **"Беларусь. Belarus"**, 2018

АД РЭДАКТАРА

# СВОЕАСАБЛІВЫ КРУГАЗВАРОТ ДАБРЫНІ

Што можа быць лепшым у красавіку, чым цёплае і пяшчотнае вясновае сонца. Яму варта толькі радавацца. Зрэшты, ёсць выключэнні. Памятаю, у той красавіцкі дзень я, як і многія ў сталіцы, ішоў па мінскіх вуліцах, атрымліваючы асалоду ад цудоўнага сонечнага надвор'я. Хто ведаў, што ад сонца тады, 26 красавіка 1986 года, трэба было хавацца куды толькі можна. Таму што грымнуў Чарнобыль! І сонца разам з нябачным радыяцыйным воблакам неслі рэальную пагрозу нашаму здароўю.

Так, прайшло цэлых трыццаць два гады з таго моманту. Але Чарнобыль не знік з нашай свядомасці. Мы памятаем загінулых ад няшчаснай атамнай аварыі. Пацярпелі людзі, зямля, для многіх змяніўся ўклад жыцця. Але ў канцы дваццатага стагоддзя чалавек знайшоў проціяддзе ад бушавання атама. У краіне змаглі прыняць тыя меры, якія не толькі нейтралізавалі небяспеку, але і дазволілі мабілізаваць рэсурсы, каб як мага эфектыўней мінімізаваць наступствы нябачанай па памерах тэхнагеннай катастрофы.

З тых часоў многае нівеліравалася ў памяці. Жыццё працягваецца. Але немагчыма забыць дабрыню неабыякавых людзей, якія ўспрынялі нашу бяду як сваю асабістую. З розных куткоў планеты прыйшла тады да нас дапамога.

Дзясяткі дабрачынных арганізацый ствараліся па ўсім свеце, каб падтрымаць тых, хто пацярпеў ад Чарнобыля. Гэта была сапраўдная людская салідарнасць — канкрэтная, адчувальная. Беларускіх дзяцей прымалі на аздараўленне ў Еўропе, Амерыцы… З удзячнасцю ўспамінаю італьянскую сям'ю Петручы, у якіх адпачывала ўлетку і наша дачка.

А потым дачка, быўшы студэнткай, сама вазіла некалькі разоў дзіцячыя групы на аздараўленне ў Іспанію. І там сустракалася з такімі ж дабрадушнымі людзьмі, хто палічыў сваім абавязкам дапамагчы іншым. Мы пазнаёміліся з Рафаэлем, які раз у год спачатку прылятаў у Мінск з іспанскай Севільі, затым ехаў на цягніку ў Гомель і далей — у адзін з найбольш пацярпелых ад Чарнобыля раёнаў гэтай вобласці. І ўсё для таго, каб наведаць юную Віку, якая некалькі гадоў запар кожнае лета адпачывала ў іх сям'і. Усе мы тады параднілiся душэўна.

Бяда збліжае людзей — гэта вядома. Чарнобыль стаў не толькі нашым уласным, кроўным болем, ён мімаволі раскрыў на дзіва добрыя рысы ў спагадлівых людзей планеты. Яны сталі для нас роднымі і блізкімі, дзякуючы сваёй неабыякавасці, удзелу ў лёсе тых, хто трапіў у цяжкія абставіны.

Паступова Чарнобыль забываецца. Такая дыялектыка жыцця — час лечыць нават самыя цяжкія раны. Краіна сваёй воляй і з дапамогай сусветнай супольнасці (хоць яна спачатку і не вельмі адэкватна ацэньвала маштабы наступстваў атамнай аварыі менавіта для Беларусі), што называецца, змаглі мінімізаваць чарнобыльскі сіндром. Сёння нават у раёнах, пацярпелых ад аварыі, але там, дзе можна паўнацэнна жыць і працаваць, наладжаны побыт, удасканалена інфраструктура сацыяльнага забеспячэння. На новую прыступку ўзнята сістэма медыцынскага абслугоўвання. Аграрныя гаспадаркі ўзмацнілі кантроль за работай на зямлі, прымяняюць тэхналогіі вырошчвання чыстых прадуктаў.

Так, шмат у чым мы спадзяваліся на свае сілы. Але спатрэбіўся і сусветны досвед. Мімаволі аналізаваўся доўгі японскі стаж пражывання пасля атамных выбухаў у Хірасіме і Нагасакі. Нам дапамаглі патрэбным абсталяваннем, сваімі прафесійнымі парадамі спецыялісты з той жа Японіі. Гэтая дапамога была вельмі дарэчы. Сам жа прыклад мае непасрэдную зваротную ўзаемасувязь з паняццем дабрыні.

Усе мы перажывалі, калі пацярпела атамная станцыя Фукусіма-1. Мы хацелі хоць нечым дапамагчы японскім сябрам. Вядома ж, магутная ў індустрыяльным плане Японія і сама можа справуляцца нават з такімі тэхнагеннымі выклікамі. Але калі нашы медыя паведамлялі пра тое, што ў Беларусі адпачывалі японскія школьнікі з тых месцаў, можна было толькі парадавацца, што і мы змаглі працягнуць руку шчырай спагады сваім сябрам. Гэта і ёсць своеасаблівы кругазварот дабрыні.

Вось такое маё слова ў красавіку. Да новай сустрэчы, паважаныя чытачы.



**ВІКТАР ХАРКОЎ**





1

## АЎТАРЫТЭТ ПРЫХОДЗІЦЬ РАЗАМ З МАЙСТЭРСТВАМ

**Узровень беларускіх трансплантолагаў адзін з самых высокіх у свеце**

Дзесяць гадоў таму адбылася сапраўды знакавая падзея для айчыннай аховы здароўя: сіламі беларускіх урачоў была праведзена першая ў краіне трансплантацыя печані. Як паказаў час, менавіта гэта стала зыходным пунктам пачатку дынамічнага развіцця айчыннай трансплантaлогіі.

"Асабістая ўвага і падтрымка Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі, зладжаная работа ўсіх звёнаў аховы здароўя далі магчымасць нам за такі кароткі час дасягнуць максімальна высокіх вынікаў у гэтай сферы. Сёння мы па праву можам ганарыцца дасягнутым. Узровень беларускіх трансплантолагаў уражвае і без перабольшання з'яўляецца адным з самых высокіх у свеце", — гаворыць намеснік Прэм'ер-міністра Васіль Жарко.

У краіне удалося выбудаваць стройную сістэму высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі гэтага профілю ва ўсіх рэгіёнах краіны, на чале якой знаходзіцца Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр трансплантацыі органаў і тканак.



2

## ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ ЧАКАЮЦЬ ПРЫЗЫ

**У эфіры міжнароднага радыё "Беларусь" стартуе цыкл праграм "Маё прывітанне II Еўрапейскім гульням"**

Сумесны праект з фондам "II Еўрапейскія гульні 2019" прызначаны пашырыць колькасць людзей, якія даведаюцца пра маючыя адбыцца Гульні ў Мінску не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. "Падчас падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў у эфіры нашага радыё ў розных праграмах будуць выступаць арганізатары, госці, удзельнікі спартыўнага форуму. Міжнароднае вяшчанне радыё "Беларусь" вядзецца на дзевяці мовах, і на кожнай вядучыя раскажуць пра маючую адбыцца спартыўную падзею", — адзначыў галоўны дырэктар радыё Навум Гальпяровіч.

Праект таксама ўключае конкурс творчых фотаработ (сэлфі). Паводле яго ўмоў, фатаграфія павінна быць размешчана ў папулярных сацсетках і даслана на адрас: selfie@minsk2019.by альбо на афіцыйны сайт міжнароднага радыё "Беларусь" www.radiobelarus.by. Здымак павінен адлюстроўваць спецыфіку любімага віду спорту або спартыўнага аб'екта, дзе ажыццяўлялася здымка.

Гэта ўжо не першая маштабная акцыя, у якой прымае ўдзел радыё "Беларусь". Раней з поспехам праведзены мерапрыемствы да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, а акцыю "Прывітанне, Беларусь!" падтрымалі прадстаўнікі 18 краін.

3



## ДАРОЖНАЯ КАРТА ЭКСПАРТНЫХ ПАСТАВАК

**В'етнам зацікаўлены ў беларускай тэхніцы і малочных прадуктах**

Перспектыўныя пастаўкі абмяркоўваліся падчас рабочага візіту ўрадавай дэлегацыі Беларусі пад кіраўніцтвам намесніка Прэм'ер-міністра Уладзіміра Сямашкі ў В'етнам. Уладзімір Сямашка сустрэўся з Прэзідэнтам В'етнама Чан Дай Куангам, бакі абмеркавалі ўсе сферы двухбаковага супрацоўніцтва, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Чан Дай Куанг цёпла адзываўся пра свой візіт у Беларусь у чэрвені 2017 года і падкрэсліў важнасць рэалізацыі дамоўленасцяў па выніках візіту нараўне з падтрыманнем высокага ўзроўню ўжо наладжаных палітычных і эканамічных адносінаў паміж Беларуссю і В'етнамам.

Падчас візіту ў В'етнам Уладзімір Сямашка таксама правёў перагаворы са старшынёй Народнага камітэта Ханоя Нгуен Дык Чунгам, у ходзе якіх адбылося абмеркаванне ўмоў далейшых паставак беларускіх аўтобусаў для сталіцы В'етнама. Акрамя таго, в'етнамскім бокам выказана цікавасць да супрацоўніцтва па лініі паставак шырокага спектра беларускай аўтамабільнай тэхнікі, малочных прадуктаў і лекавых прэпаратаў, стварэння на тэрыторыі В'етнама сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці гэтых тавараў.

# Час адметных здзяйсненняў і новых планаў

**У Тбілісі прайшлі афіцыйныя мерапрыемствы візіту Прэзідэнта ў Грузію. Па выніках перагавораў кіраўнікі дзяржаў Аляксандр Лукашэнка і Гіоргій Маргвелашвілі пацвердзілі рашучасць развіваць не толькі эканамічнае ўзаемадзеянне, але і кантакты па ўсіх важных для нашых дзяржаў і народаў напрамках.**

Рыхтуючыся да камандзіроўкі ў Тбілісі, падняў уласны архіў запісаў амаль трохгадовай даўнасці. Тады ў красавіку 2015 года ў грузінскай сталіцы прайшла першая ў гісторыі дыпламатычных адносінаў афіцыйная сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Грузіі. Але ўжо ў той момант не было падстаў лічыць, што кіраўнікі дзяржаў прыглядаліся адзін да аднаго, ацэньвалі ступень магчымага ўзаемнага даверу. Размова адбылася вельмі цёплая і шчырая. Прама гаварылі аб праблемах як унутраных, так і знешніх. Пра тое, чым мы можам дапамагчы адзін аднаму ў іх вырашэнні. А ў якасці базавага арыенціра развіцця двухбаковага дзелавога ўзаемадзеяння абазначылі тавараабарот у 200 мільёнаў долараў.

Цяперашні візіт Прэзідэнта Беларусі ў Грузію, як сказаў па выніках перагавораў грузінскі кіраўнік Гіоргій Маргвелашвілі, рэзюмуе перыяд, які прайшоў з моманту папярэдняга наведвання краіны Аляксандрам Лукашэнкам. Што ў актыве?

— Па выніках мінулага года нашы краіны выйшлі на высокі ўзровень аб'ёму ўзаемнага гандлю каля 112-115 мільёнаў долараў, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка і тут жа дадаў: — Вядома, лічба невялікая. Але калі разумець тое, што некалі быў нуль, а на працягу двух-трох гадоў мы выйшлі на такі ўзровень, то гэта добры тэмп.

Такая дынаміка нараджае ўпэўненасць у дасягненні раней абазначанай мэты — 200 мільёнаў долараў. Яе падмацоўвае і інтэнсіўнасць кантактаў прадстаўнікоў дзелавых колаў. Перад афіцыйным візітам Прэзідэнта ў Тбілісі адкрыўся грузінска-беларускі бізнес-форум. Ён стартаваў з падпісання цэлага пакета дакументаў, якія замацоўваюць намеры аб супрацоўніцтве канкрэтных беларускіх прадпрыемстваў з грузінскімі партнёрамі. У іх ліку БелАЗ, МАЗ, МТЗ, "Белшына", канцэрн "Белнафтахім", прадпрыемствы харчовай прамысловасці — усіх не пералічыць. Падлік прыросту ўзаемадзеяння ўжо цяпер ідзе на дзясяткі мільёнаў долараў. Беларуская дэлегацыя ў цэлым правяла вельмі грунтоўную папярэднюю работу,

**Аляксандр Лукашэнка:**

***Я вельмі цаню шчырую атмасферу сустрэч тут, у Тбілісі, з маім калегам, членамі ўрада, на якіх адкрыта і шчыра абмяркоўваюцца ўсе пытанні нашага ўзаемадзеяння... Беларусь заўсёды будзе адкрыта для супрацоўніцтва з Грузіяй, і я падтрымаю любыя сумесныя праекты, накіраваныя на далейшае пашырэнне і паглыбленне нашых адносінаў***



БЕЛТА

за што ўдастоілася заслужаных слоў падзякі Прэзідэнта.

## Пра што думаюць нашы вяскоўцы пасля сустрэчы з Прэзідэнтам краіны

Важна тое, што мы не спыняемся толькі на ўзроўні простых гандлёвых аперацый. Гаворка ідзе пра паглыбленне прамысловай кааперацыі, стварэнне сумесных вытворчасцяў. Зборка беларускіх ліфтаў — толькі першы праект у чарзе наступных, якія ўжо ў даволі высокай стадыі прапрацоўкі. Але што яшчэ больш каштоўнае для грузінскіх партнёраў — гэта гатоўнасць беларускіх спецыялістаў дзяліцца ведамі, перадаючы грузінскаму боку тэхналогіі і навучаючы адпаведных спецыялістаў. І робім гэта мы абсалютна шчыра. Вось як пра гэта на перагаворах сказаў Прэзідэнт:

— Мы пачынаем тут ствараць навуковыя цэнтры. Напрыклад, навуковыя цэнтры па жывёлагадоўлі, раслінаводстве. Гэта тое, што трэба людзям. Без жывёлагадоўлі не можа быць ні сельскай гаспадаркі, а таксама ні мяса, ні малака. Гэта ядро, якое павінна быць у Грузіі сваё, яго трэба зараджаць на навуковай аснове, і мы паабяцалі гэта зрабіць. Я вельмі хачу, каб, ствараючы сумесныя вытворчасці па ліфтах, трактарах, аўтамабілях, складанабытавой тэхнікі — па кожным напрамку, — мы зрабілі ўсё, каб ён развіваўся. Для гэтага патрэбныя людзі. Кадры. Усім міністрам я сказаў: паколькі пэўны перыяд для Грузіі, будзем шчырыя, быў страчаны, так склалася сітуацыя, вам, вядома ж, няпроста, цяперашняму пакаленню палітыкаў. Давайце дапаможам падрыхтаваць кадры.

Гіоргій Маргвелашвілі адгукаўся аб такой стратэгіі з вялікай падзякай. Калі партнёрства рухае не толькі камерцыйны інтарэс, але больш высакародныя мэты, яго будучыня бачыцца яшчэ больш зразумелай і паспяховай. Менавіта таму галоўным выніковым дакументам перагавораў стаў падпісаны прэзідэнтамі дагавор аб асновах беларуска-грузінскага супрацоўніцтва. Гэта стратэгічны дакумент, які замацоўвае памкненне дзвюх краін развіваць узаемадзеянне на многія гады наперад.

Зразумела, і наша шчырая адкрытасць мае гістарычнае абгрунтаванне. Гэта своеасаблівая даніна той палітычнай падтрымцы, якую Грузія заўсёды нам аказвала на міжнароднай арэне. Аляксандр Лукашэнка ўспамінаў пра гэта з цеплынёй:

— Я ўдзячны кіраўніцтву Грузіі, Ураду, Парламенту за тую падтрымку, якую вы заўсёды аказвалі і аказваеце Бела-

стар. 6

стар. 5 русі на міжнародных пляцоўках — у межах АБСЕ, Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, на пляцоўцы "Усходняга партнёрства". Не было такога выпадку, каб Грузія не стаяла побач з Беларуссю ў самыя складаныя часы. І Міхаіл Саакашвілі, і цяперашняя ўлада — вы заўсёды мяне падтрымлівалі. Падтрымлівалі беларускі народ. І ў гэтым плане мы, вядома ж, абавязаны сваім братам-грузінам за тую каласальную салідарнасць, якую вы заўсёды праяўлялі ў дачыненні Беларусі.

У тым ліку і ў гэтым карані таго, што ў партнёрстве Мінск і Тбілісі не абмяжоўваюцца толькі гандлёва-эканамічнай праблематыкай. На пярэдні план выводзяцца і сацыяльна значныя тэмы, сказаў Прэзідэнт Беларусі:

— Можам падзяліцца сваімі распрацоўкамі ў сферы папярэджання і ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый. Набірае абароты ўзаемадзеянне паміж нашымі ўрачамі, медыцынскімі цэнтрамі, профільнымі навучальнымі ўстановамі. Сёлета з удзелам беларускіх спецыялістаў у Грузіі пачнецца рэалізацыя праграмы па трансплантацыі печані.

Ну і, зразумела, для ўмацавання дружбы важныя кантакты на бытавым узроўні паміж нашымі людзьмі. Тут сваю ролю павінны адыграць праекты ў сферы турызму, культурнага абмену. Залогам жа поспеху ўзаемадзеяння па ўсіх напрамках застаецца палітычная воля кіраўніцтва дзвюх краін. Прэзідэнт Беларусі рэзюмаваў афіцыйную частку работы ў Тбілісі так:

— Я вельмі цаню шчырую атмасферу сустрэч тут у Тбілісі з маім калегам, членамі ўрада, на якіх адкрыта і шчыра абмяркоўваюцца ўсе пытанні нашага ўзаемадзеяння. Менавіта такімі сёння і былі перагаворы з маім паважаным калегам і дэлегацыяй Грузіі. У беларуска-грузінскіх адносінах няма закрытых тэм і пытанняў. Наш дыялог на ўсіх узроўнях адрознівае шчыры давер і павага. Вы павінны памятаць, што там, у цэнтры Еўропы, у вас ёсць надзейная база, з якой вы не толькі можаце з кімсьці мець зносіны, але і гандляваць. Мы гатовыя да гэтага супрацоўніцтва, і я ўпэўнены, вы верыце ў мае словы таму, што мы ніколі вас не падводзілі. Беларусь заўсёды будзе адкрыта для супрацоўніцтва з Грузіяй, і я падтрымаю любыя сумесныя праекты, накіраваныя на далейшае пашырэнне і паглыбленне нашых адносінаў. Я вельмі хачу як чалавек, як грамадзянін і як кіраўнік дзяржавы, каб у вас было добра. Каб вы жылі мірна. Грузінскі народ заслугоўвае павагі і мірнага існавання на гэтай планеце. Гэта старажытны народ, які даў цывілізацыі шмат добрага. Мы гэта цэнім, будзем памятаць пра гэта заўсёды і заўсёды гатовыя працягнуць руку дружбы і дапамогі ўсім нашым братам у Грузіі.



Па завяршэнні афіцыйных перагавораў прэзідэнты наведалі Тбіліскі каньячны завод. Тут Аляксандру Лукашэнку падрабязна расказалі пра гісторыю прадпрыемства, а таксама пра розныя тонкасці тэхналогіі вытворчасці каньяку і яго правільнага ўжывання.

На гэтым прадпрыемстве захоўваецца адзін з найстарэйшых каньячных спіртаў 1893 года, які там лічаць нацыянальным набыткам. Яго даюць прадэгуставаць толькі высокім гасцям. Скарыстаўся прадастаўленай магчымасцю і Аляксандр Лукашэнка. Разам з Гіоргіем Маргвелашвілі яны ацанілі смакавыя якасці вытрыманага напою. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка сказаў тост за вялікі і мудры грузінскі народ і яго сыноў. У сваю чаргу Прэзідэнт Грузіі сказаў тост за беларускі народ. Прэзідэнты падпісалі бочкі каньяку, закладзеныя ў іх гонар. А таксама правялі купажыраванне (змешванне спіртоў розных вытрымкі для атрымання гатовага напою) і запячаталі яшчэ адну бочку да маючага адбыцца 25-годдзя дыпламатычных адносінаў Беларусі і Грузіі.

У другі дзень афіцыйнага візіту ў Грузію Прэзідэнт усклаў кветкі да мемарыяла героям, якія загінулі за адзінства Грузіі, сустрэўся з Каталікосам-Патрыярхам усяе Грузіі, Архіепіскапам Мцхецкім і Тбіліскім, Мітрапалітам Піцунды і Цхум-Абхазеці Ільёй ІІ і правёў перагаворы з прэм'ер-міністрам Грузіі Георгіем Квірыкашвілі.

А першы дзень работы Прэзідэнта ў Тбілісі завяршыўся на вельмі сімвалічнай ноце. Аляксандр Лукашэнка падарыў свайму грузінскаму калегу Гіоргію Маргвелашвілі трактар. Гэтая



невялікая машына BELARUS-152 будзе вельмі карысная на прысядзібным участку грузінскага кіраўніка. Тут інтарэсы двух прэзідэнтаў поўнасцю супадаюць. Гіоргій Маргвелашвілі гэтак жа, як і Аляксандр Лукашэнка, вельмі захоплены дапаможнай гаспадаркай. Неяк сацсеткі нават абляцела яго фотасправаздача аб добрым ураджаі бульбы з беларускага насення. Беларуская тэхніка — Прэзідэнту Грузіі ў дапамогу. Выдатны тэст, тым больш што і спецыялісты цяпер вядуць перагаворы аб адаптацыі некаторых беларускіх трактароў да грузінскіх умоў для наступных продажаў і арганізацыі сумеснай вытворчасці.

## Ілія ІІ

Гутарку ж з Патрыярхам Прэзідэнт пачаў з успаміну аб першай сустрэчы. Падчас папярэдняга візіту Ілія ІІ сустрэў Аляксандра Лукашэнку словамі:

— Як жа доўга мы вас чакалі тут.

Гэтае прывітанне, прызнаўся Прэзідэнт, ён запомніў на ўсё жыццё:

— Я гэта памятаю і вельмі цаню тое, што вы заўсёды знаходзіце час сустрэцца са мною тут. А я вам абяцаю, што буду пастаянна прыязджаць у ваш цудоўны горад і краіну. І калі будзе на тое Божая воля і ваша, я абавязкова буду сустракацца з вамі. Для мяне гэта вялікая радасць і каштоўнасць. Вы вельмі паважаны чалавек не толькі ў Грузіі, але і ва ўсім праваслаўным свеце, і не толькі.

Патрыярху Аляксандр Лукашэнка перадаў словы прывітання ад нашых паважаных мітрапалітаў Філарэта і Паўла. Сказаўшы пры гэтым, што паміж нашымі народамі вельмі добрыя і цёплыя адносіны былі заўсёды:

— Вы для нас не чужыя людзі. Вы нашы сапраўдныя браты. І ў нас няма іншага выйсця, акрамя як будаваць самыя цёплыя і добрыя адносіны ўжо знаходзячыся не ў адной дзяржаве.

Прагрэс у развіцці беларуска-грузінскіх адносінаў за апошнія гады больш чым відавочны. У наяўнасці не проста ўзаемныя дзелавыя памкненні, але і чыста чалавечае жаданне сяброў быць патрэбнымі адзін аднаму. Прэзідэнт сказаў Патрыярху:

— Вы павінны ведаць, што мы заўсёды будзем з вамі побач. Мы гатовыя падзяліцца з вамі ўсім тым, што мы ўмеем рабіць.

За Беларуссю ўжо трывала замацаваўся статус краіны — донара бяспекі ў Еўрапейскім рэгіёне. Мір і спакой, як выказаўся Прэзідэнт, — наш брэнд. Вядома, гэта ганарова, але адначасова вельмі адказна і да многага абавязвае:

— Мы будзем рабіць усё для таго, каб не толькі ў нашых суседзяў, але каб такі свет і спакой былі ў любой іншай дзяржаве. І гатовыя ў гэтым напрамку зрабіць усё тое, што захочуць гэтыя дзяржавы, як гэта было і ў выпадку з Украінай.

## Георгій Квірыкашвілі

На сустрэчы з кіраўніком грузінскага ўрада было працягнута пачатае напярэдадні кіраўнікамі дзяржаў абмеркаванне перспектыўных тэм развіцця ўзаемадзеяння ў прыкладным ключы. Але пачаліся зносіны таксама на лірычнай ноце. Георгій Квірыкашвілі з цёплай падзякай успамінаў аб мужнай рабоце беларускіх ратавальнікаў на ліквідацыі пажару ў Баржомскай цясніне. Прэм’ер упершыню расказаў гісторыю, падобную да легенды, але гэта сучасная жыццёвая праўда:

— Хачу, каб гэта ведалі ўсе... Калі мы тушылі пажар, мне давялося асабіста кіраваць гэтай аперацыяй. Неяк збіраліся ўвечары, планавалі наступны дзень і да мяне падышоў свяшчэннік мясцовай царквы. У яго ў руках быў абраз Божай Маці. Ён папрасіў знайсці беларускіх лётчыкаў. Аказалася, камандзір экіпажа заходзіў у тую царкву. Хацеў купіць абраз, але настаяцеля не было, а без яго блаславення гэтага зрабіць было немагчыма. Тады лётчык набраў у бутэльку асвячонай вады і сказаў, што, калі будзе пралятаць над палаючым лесам, акрапіць яго святой

стар. 8



***Патрыярху Аляксандр Лукашэнка перадаў словы прывітання ад нашых паважаных мітрапалітаў Філарэта і Паўла. Сказаўшы пры гэтым, што паміж нашымі народамі вельмі добрыя і цёплыя адносіны былі заўсёды: — Вы для нас не чужыя людзі. Вы нашы сапраўдныя браты. І ў нас няма іншага выйсця, акрамя як будаваць самыя цёплыя і добрыя адносіны ўжо знаходзячыся не ў адной дзяржаве.***

***Прагрэс у развіцці беларуска***

стар. 7 вадой. Свяшчэннік шукаў пілота, каб падарыць яму абраз. Гэтая гісторыя для мяне застанецца залатой старонкай дружбы паміж беларускім і грузінскім народамі. Дзякуй. Мы вам вельмі ўдзячныя.

Прыгожая і кранальная гісторыя. Хто ведае, можа, з часам яна стане легендай аб вытоках моцнай дружбы беларусаў і грузін. А ў яе абавязкова ўплятуцца яркія ніткі не толькі подзвігу, але і паўсядзённай стваральнай працы. Прэзідэнт нагадаў пра асноўную сутнасць дамоўленасцяў на вышэйшым узроўні:

— Свайму віцэ-прэм'еру я сказаў: грузіны — нашы браты. Рабі ўсё, як у Беларусі. Калі мы нечым гандлюем, вучы людзей, каб яны маглі эксплуатаваць гэтую тэхніку, маглі нешта паўтарыць у Грузіі. Калі не пералічваць дакументы і кантракты, а ў цэлым ахарактарызаваць нашы дамоўленасці, то яны заключающца ў тым, што мы дамовіліся: не проста будзем гандляваць і ствараць сумесныя прадпрыемствы. Мы дамовіліся вучыць людзей. Я абяцаю: мы да гэтага гатовыя. Можна прадаць тэхніку, можна тэхналогіі сюды прывезці. Але калі не будзе кампетэнцыі ў мясцовых людзей займацца менавіта тым, што мы вам прапануем, перспектыў будзе мала. Мы хочам, каб грузіны — нашы браты — у нас, калі вам гэта будзе трэба, навучыліся эксплуатаваць, рамантаваць тэхніку, і, вядома ж, калі мы ствараем сумесныя прадпрыемствы, трэба развіваць лакалізацыю, чаго б гэта ні каштавала. Для гэтага патрэбныя кадры.

Прэзідэнт асабліва падкрэслівае: галоўнае, каб следам за тэхналогіямі ішлі людзі, якія ўмеюць імі карыстацца. Яны будуць падрыхтаваныя. У тым ліку і ў сферах сельскай гаспадаркі і вытворчасці прадуктаў харчавання:

Завяршыўся візіт яшчэ адной сустрэчай прэзідэнтаў. Гіоргій Маргвелашвілі асабіста прыехаў у аэрапорт, каб праводзіць свайго высокага госця і добрага сябра. Такая цырымонія пратаколам не прадугледжана. Па дыпламатычных канонах яна не абавязковая. А па чалавечым разуменні, калі адбылася, то яшчэ раз падкрэслівае тое, наколькі высока цэніць Тбілісі дружбу з Мінскам. Яна працягваецца і мацнее.

Дзяніс **Аляксееў**

*Падчас візіту ў Грузію Прэзідэнт даў інтэрв'ю журналістам грузінскага тэлебачання, паведамляе БЕЛТА. Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, сказаў:*

## Пра адносіны з Расіяй

— Я чакаю заўсёды пазітыву. З Прэзідэнтам Пуціным мы размаўлялі адразу ж пасля выбараў. І мы, зразумела, закранулі некаторыя злабадзённыя пытанні, якія трэба вырашаць і якія, можа быць, нават не прэзідэнтаў пытанні. Але мы іх абмяркоўвалі. У мяне добрыя адносіны з Уладзімірам Пуціным. Калі пытанні ўзнікалі і дзесьці накопліваліся, не было таго выпадку, каб мы не вырашылі сітуацыю. На жаль, накопліваюць пытанні і міністры, і ўрады з двух бакоў. Тады нам даводзіцца падключацца. На жаль. Такога быць не павінна. Але гэта жыццё, нікуды ад гэтага не дзенешся.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што пытанні ў беларуска-расійскіх адносінах звязаны з канкурэнцыяй, развіццём рыначнай эканомікі. Але ў сферы палітыкі такіх праблем паміж бакамі няма.

## Пра адносіны Грузіі і Расіі

— Мы закраналі і з Прэзідэнтам, і з прэм'ер-міністрам адносіны Грузіі і Расіі. Я ўпэўнены, калі на тое будзе воля грузінскага кіраўніцтва, Уладзімір Пуцін гэтую праблему будзе вырашаць. Ён жа добра разумее, што гэта не праблема паміж народамі. Яна павінна быць вырашана на ўзроўні ўладаў. І я ўпэўнены, што, калі вы будзеце больш настойлівыя і адкрытыя адзін з адным у гэтым дыялогу, праблема будзе вырашацца. У Прэзідэнта Пуціна, я гэта заўважыў, у майго калегі і сябра, ён як быццам новае дыханне атрымаў. Я ўпэўнены, што пытанні, якія існуюць у Расіі не толькі з Беларуссю, але, дапусцім, з Грузіяй, ён поўны рашучасці вырашаць.

## Пра "Усходняе партнёрства"

На пытанне аб тым, чаму ён не паехаў асабіста на саміт "Усходняга партнёрства" ў Брусэль у канцы мінулага года, Аляксандр Лукашэнка адказаў так:

— Мы звычайна загадзя плануем такія паездкі, і рыхтаваўся наш Міністр замежных спраў. Чаму я павінен не давяраць Міністру? Ён і паехаў на гэты саміт. Думаю, прыйдзе час і я пабуду на гэтым саміце.

Прэзідэнт растлумачыў, што гэта будзе залежаць ад таго, якія там будуць абмяркоўвацца пытанні і які будзе адчувальны вынік.

— У мяне назбіралася шмат прапаноў і пытанняў, якія трэба абмяркоўваць нам у Еўрапейскім саюзе. Гэта іх праблемы, і нашы праблемы, і расійскія, і нават, можа быць, грузінскія. У мяне ёсць сваё бачанне. Надыдзе час — я пра гэтае бачанне скажу. Ёсць што сказаць.

## Пра дыялог з ЕС

— У мяне няма да ЕС абсалютна ніякіх патрабаванняў. Я проста хачу, каб нас паважалі. Сёння ёсць праблема ў ЕС з Украінай. Не толькі ў Расіі, але і ў ЕС... І Беларусь, гэтыя амаль тысяча кіламетраў, засталася беспраблемным калідорам для ЕС, з аднаго боку, і для Расіі і Кітая — з другога. І для Грузіі. Мы хочам, каб ЕС гэта бачыў і цаніў. Дапусцім, каб у эканоміцы не было аднабаковых мер, тарпедавання нашых тавараў у ЕС. Абкладваюць пошлінамі, яшчэ нешта. Праўда, у гэтым дачыненні ўжо ёсць некаторы рух.

## Пра дэмакратыю

— Мы ўмеем падручнікі чытаць і мы бачым дэмакратычную Грузію (без гумару), дэмакратычную Еўропу. Мы ўсё бачым. І станоўчае, і недахопы. Але мы маем свае нацыянальныя асаблівасці. І вы (ЕС. — Заўв. рэд.) павінны іх разумець, і не трэба нас штурхаць у спіну. Гэта не патрабаванні, а мае пажаданні. Я еўрапейцам пра гэта гавару. Мы незалежная дзяржава са сваёй знешняй палітыкай. А сутнасць нашай знешняй палітыкі — шматвектарнасць, і другое — не ствараць праблем нашым суседзям.




БЕЛТА

# ВЫЗНАЧЭННЕ ЭКАНАМІЧНАГА МАРШРУТУ

**Гандаль паміж Беларуссю і Грузіяй ужо некалькі гадоў набірае добры тэмп. У планах — павялічыць тавараабарот да 2020 года да 200 мільёнаў долараў. Вынікі 2017-га паказалі, што ў наступным годзе да гэтай лічбы можна будзе наблізіцца ўшчыльную. А затым, вядома, трэба будзе павышаць планку, і ў гэтым зацікаўленыя абедзве дзяржавы. Ужо цяпер ёсць прыклады паспяховага двухбаковага супрацоўніцтва, якія даказваюць, што нам ёсць што прапанаваць адзін аднаму.**

Старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч, віцэ-прэм'ер Беларусі Міхаіл Русы і першы віцэ-прэм'ер — міністр эканомікі і ўстойлівага развіцця Грузіі Дзмітрый Кумсішвілі на беларускай выставе ў Тбілісі

Асноўная частка беларускага экспарту ў Грузію — гэта менавіта высокатэхналагічная прамысловая прадукцыя. Але краіны таксама зацікаўленыя і ў кааперацыі. Бонусы ад сумесных праектаў відавочныя — стварэнне працоўных месцаў, пашырэнне рынкаў. Цяпер у Тбілісі актыўна развіваецца сумесная вытворчасць ліфтаў. У жніўні мінулага года беларускі "Магілёўліфтмаш" стаў часткай кансорцыума "Грузінскі ліфт". Ужо сабрана некалькі дзясяткаў ліфтаў, а ў 2018-м плануецца вырабіць да 200.

Зборачную вытворчасць у Грузіі плануе адкрыць і Мінскі трактарны завод. Гэтае пытанне будзе абмяркоўвацца ў бліжэйшыя дні ў Тбілісі. Цяпер МТЗ пастаўляе трактары "BELARUS" у Грузію праз свайго афіцыйнага партнёра ў рэгіёне — кампанію "Гермес", расказаў намеснік маркетынг-дырэктара па камерцыйнай рабоце на рынках краін СНД Аляксандр Казакевіч:

— "Гермес" ажыццяўляе не толькі рэалізацыю трактароў, але таксама забяспечвае гарантыйнае і сэрвіснае абслугоўванне тэхнікі, актыўна ўдзельнічае ў міжнародных тэндарах, сельскагаспадарчых выставах, дэманстрацыйных паказах. У гэтым годзе МТЗ падпісаў камерцыйны кантракт з "Гермесам" на пастаўку трактароў "BELARUS" на суму большую за 340 тысяч долараў. Дадаткова падчас візіту дзяржаўнай дэлегацыі Беларусі ў Грузію плануецца заключыць кантракт на суму звыш 860 тысяч долараў.

Сярод перспектыўных праектаў — пастаўкі беларускіх электробусаў. У экалагічным транспарце зацікаўленыя Тбілісі і Батумі. Для таго каб абмеркаваць, як хутка па грузінскіх дарогах будуць ездзіць нашы электробусы, кіраўніцтва "Белкамунмаша" асабіста прыляцела ў Тбілісі на бізнес-форум.

Акрамя тэхнікі, пастаўляюцца ў Грузію і беларускія прадукты харчавання. Дарэчы, знайсці нашы тавары для грузіна цяпер будзе нескладана — толькі ў Тбілісі ўжо працуюць дзве сеткі магазінаў з беларускімі прадуктамі. Аналагічныя грузінскія гандлёвыя сеткі ў бліжэйшы час павінны з'явіцца і ў нашай краіне.

Важна, што ў грузінска-беларускіх адносінах ёсць узаемнасць. Нягледзячы на адлегласць, у нас шмат пунктаў судакранання. Напрыклад, абедзве краіны геаграфічна і ўжо эканамічна звязваюць усход і захад. Грузія гэтак жа, як і Беларусь, удзельнічае ў кітайскай ініцыятыве "Вялікі шаўковы шлях". Таксама наша краіна можа прапанаваць грузінскім партнёрам выхад на рынак ЕАЭС. Грузія, у сваю чаргу, можа дапамагчы беларускім прадпрыемствам замацавацца ў Еўрасаюзе дзякуючы дзеючаму пагадненню аб асацыяцыі з ЕС.

У плане лёгкасці вядзення бізнесу Грузія — адна з самых прывабных краін. Улады свядома пайшлі па шляху спрашчэння ўсіх адміністрацыйных працэдур для прадпрымальнікаў. І цяпер у рэйтынгу Сусветнага банка Doing Business Грузія знаходзіцца ў першай дзясятцы разам з Сінгапурам, ЗША і Вялікабрытаніяй. І гэты досвед будзе цікавы нашай краіне, якая таксама ідзе па шляху лібералізацыі бізнесу.

Вольга **Здановіч**

# ДРУЖБА ЎМАЦОЎВАЕ АДНОСІНЫ



## Гэты факт на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам падкрэсліў член Цэнтральнага ваеннага савета, член Дзяржсавета, міністр абароны Кітайскай Народнай Рэспублікі Вэй Фэнхэ

У Мінску з рабочым візітам знаходзіўся член Дзяржсавета, міністр абароны Кітайскай Народнай Рэспублікі Вэй Фэнхэ. З ім правёў сустрэчу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Варта адзначыць, што толькі з 2013 па 2017 год адбылося сем візітаў кіраўніцтва Мінабароны Беларусі ў КНР і 11 разоў дэлегацыі кіраўніцтва ваеннага ведамства Кітая наведалі Беларусь. На планавай аснове праводзяцца сумесныя трэніроўкі падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі і падраздзяленняў паветрана-дэсантных войскаў Кітая. Дзве трэніроўкі праведзены ў Беларусі, адна — на тэрыторыі КНР. З 2000 года ўжо 277 кітайскіх ваеннаслужачых атрымалі дыпломы Ваеннай акадэміі Беларусі. У сваю чаргу ў навучальных установах Народна-вызваленчай арміі Кітая прайшлі навучанне на бязвыплатнай аснове 77 ваеннаслужачых Узброеных Сіл Беларусі.

Так, згодна з прадстаўленай да сустрэчы інфармацыі, перспектыўныя напрамкі ваеннага супрацоўніцтва дзвюх краін сёння ўключаюць як навучанне кітайскіх ваеннаслужачых у Ваеннай акадэміі і на ваенных факультэтах вышэйшых навучальных устаноў Мінабароны Беларусі, так і навучанне беларускіх ваеннаслужачых ва ўстановах адукацыі КНР, правядзенне сумесных вучэнняў і трэніровак. Акрамя таго, Кітай неаднаразова прадастаўляў Беларусі бязвыплатную ваенную дапамогу. Напрыклад, у кастрычніку 2017 года было падпісана пагадненне аб прадастаўленні такой дапамогі на суму 4,5 мільёна долараў. Цяпер узгадняецца пералік маёмасці, якая будзе пастаўляцца.

У цэлым у ваенна-тэхнічнай сферы паміж Беларуссю і Кітаем заключана пяць міжнародных дагавораў. А каардынацыя двухбаковага ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва ажыццяўляецца ў рамках работы Беларуска-Кітайскага камітэта па супрацоўніцтве ў галіне ўзбраення і ваеннай тэхнікі.

У цэлым Кітай адыграў рашаючую ролю ва ўзмацненні абараназдольнасці Беларусі, лічыць Аляксандр Лукашэнка, пра што ён і заявіў на сустрэчы з членам Цэнтральнага ваеннага савета, членам Дзяржсавета, міністрам абароны Кітайскай Народнай Рэспублікі Вэем Фэнхэ. “Вы дапамаглі нам стварыць самыя сучасныя касмічныя падраздзяленні, адправіць на арбіту самы сучасны спадарожнік. Мы з вамі стварылі ў Беларусі самы сучасны цэнтр кіравання палётамі. Вы дапамаглі нам стварыць самае сучаснае ракетнае ўзбраенне для беларускай арміі. На падставе гэтага, я думаю, мы стварылі больш сучасныя ўзоры ракетнага ўзбраення, якія зацікавяць ужо і вашу армію. Я ўдзячны вам за тую бязвыплатную дапамогу, якую вы аказваеце нашай арміі”, — сказаў у прыватнасці кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь у даўгу не застанецца. “Вы гэта павінны ведаць, і ўсё кіраўніцтва Кітая павінна пра гэта ведаць, — сказаў ён. — Вы нам падставілі плячо ў самы складаны час, калі ўвесь Захад увёў санкцыі супраць Беларусі. Мы гэта памятаць будзем доўга. У вас ёсць тут надзейныя сябры”.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што рад сустрэчы: “Я перш за ўсё хачу павіншаваць вас з паспяховым завяршэннем усіх палітычных кампаній і баталій у КНР і канстатаваць факт стабільнасці ў палітычных і сацыяльных адносінах у Кітайскай Народнай Рэспубліцы”, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі папрасіў асабіста перадаць Старшыні КНР Сі Цзіньпіну самыя добрыя віншаванні і пажаданні.

Звяртаючыся да міністра абароны Кітая, Аляксандр Лукашэнка таксама павіншаваў Вэя Фэнхэ з прызначэннем на найвышэйшую пасаду не толькі ва ўрадзе Кітая, але і з тым, што ён стаў на чале адной з наймагутнейшых армій свету.

“Хачу падзякаваць у вашай асобе кіраўніцтву КНР за тую неацэнную эканамічную, фінансавую падтрымку, якую вы аказваеце Беларусі. Асаблівая ўдзячнасць вам за тое ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва, якое склалася паміж нашымі краінамі”, — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Кітайскі міністр у сваю чаргу адзначыў вялікія поспехі Беларусі на шляху дзяржаўнага будаўніцтва. “Вы ўнеслі важкі ўклад у развіццё двухбаковай дружбы. Нашы краіны з’яўляюцца добрымі сябрамі і партнёрамі. І пад вашым кіраўніцтвам са Старшынёй Сі Цзіньпінам нашы краіны ўжо сталі жалезнымі братамі”, — сказаў Вэй Фэнхэ.

Ён падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за магчымасць сустрэчы і перадаў прывітанне і добрыя пажаданні ад імя Старшыні КНР Сі Цзіньпіна.

Уладзімір **Хромаў**



# Надышла пара ўзгадняць падыходы

**Беларусы вельмі цёпла ставяцца да братоў-сербаў. Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са спецпрадстаўніком Прэзідэнта Сербіі, намеснікам старшыні ўрада — міністрам унутраных спраў Сербіі Небайшам Стэфанавічам**



"Няма неабходнасці для якіх-небудзь уступных слоў, таму што ў нас бліскучыя адносіны з вашай краінай, інакш і быць не можа. Мы добра ведаем адзін аднаго — Сербія і Беларусь. Нашы народы вельмі дружныя, у нас складаліся заўсёды вельмі добрыя адносіны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я думаю, вы, знаходзячыся ў Мінску, яшчэ раз пераканаецеся ў тым, што мы вельмі цёпла ставімся да нашых братоў-сербаў".

Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі ведаюць, з якімі праблемамі сёння сутыкаюцца ў Сербіі. "Думаю, і вы добра ведаеце пытанні, якія нам даводзіцца вырашаць. Складана вам, няпроста і нам. Але мы жылі і будзем жыць, таму што мы славяне, мы старажытныя народы і ўмеем пераадольваць цяжкасці, калі яны ёсць, і пераадольваць іх разам", — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка і Небайша Стэфанавіч падрабязна разгледзелі актуальныя пытанні супрацоўніцтва паміж краінамі, шляхі развіцця міждзяржаўных адносінаў.

Як паведамлялася, раней адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі з Прэзідэнтам Сербіі Аляксандрам Вучычам. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі цяперашні стан і перспектывы развіцця адносінаў паміж Беларуссю і Сербіяй, у тым ліку шляхі павелічэння ўзаемнага тавараабароту. Пры гэтым бакі адзначылі супадзенне пазіцый краін у сферы палітыкі, па пытаннях рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня.

Аляксандр Вучыч запрасіў Аляксандра Лукашэнку зрабіць афіцыйны візіт у Сербію. Прэзідэнт Беларусі прыняў гэтае запрашэнне. Канкрэтныя тэрміны візіту будуць узгоднены па дыпламатычных каналах.

Спецпрадстаўнік Прэзідэнта Сербіі, намеснік старшыні ўрада — міністр унутраных спраў Сербіі Небайша Стэфанавіч пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам расказаў журналістам пра мэту сустрэчы з беларускім лідарам і падрабязнасці праведзенай размовы.

"Я перадаў асабістае запрашэнне Прэзідэнта Вучыча Прэзідэнту Лукашэнку на працягу наступных некалькіх месяцаў наведаць Сербію. Для нас гэта будзе вельмі важны візіт. Мы будзем сустракаць Аляксандра Лукашэнку як самага дарагога госця, і нам хацелася б падчас гэтага візіту закрануць як мага больш і эканамічных, і палітычных тэм", — сказаў Небайша Стэфанавіч.

Спецпрадстаўнік сербскага лідара падкрэсліў, што яго краіне важна развіваць эканамічнае ўзаемадзеянне з Беларуссю. Ён адзначыў, што ёсць шмат галін, у якіх краіны могуць пашырыць супрацоўніцтва, павялічыць тавараабарот і выйсці на трэція рынкі.

Небайша Стэфанавіч таксама праінфармаваў кіраўніка беларускай дзяржавы аб сітуацыі ў Сербіі, асобна ён закрануў апошнія падзеі ў Косаве. "Для Сербіі вельмі важна прадоўжыць блізкія і брацкія адносіны з Беларуссю і ў сувязі з гэтым поўнасцю і дакладна інфармаваць нашых партнёраў пра ўсё, што адбываецца ў нашай краіне", — растлумачыў міністр.

Аляксей **Фядосаў**

*Вялікая Айчынная вайна пакінула беларускаму народу цяжкую спадчыну — памяць пра страшныя трагедыі людзей, якія сталі сведкамі і ахвярамі жудасных злачынстваў фашызму. Сёння мы аддаём даніну памяці жыхарам Хатыні, спаленай нацыстамі 75 гадоў таму.*

*22 сакавіка 1943 года ў жыццё маленькай вёсачкі прыйшла бяда. Акупанты, якія цярпелі паражэнне на франтах, вынеслі смяротны прысуд мірнаму насельніцтву. Карнікі не злітаваліся над старымі, жанчынамі і немаўлятамі. У агні загінула 149 чалавек.*

*Мы ніколі не змірымся з жахам бацькоў, на вачах якіх паміралі дзеці. Нам ніколі не забыць страх і бездапаможнасць дзіцяці, якое шукае абароны ў дарослага і не разумее, за што забіраюць у яго жыццё. Нам не даравацьгора бацькі, які выжыў, але страціў свайго сына, і слёз хлопчыка, які знайшоў паратунак пад целам забітай маці.*

*Успамінаючы Хатынь, мы ўспамінаем тысячы па-зверску знішчаных вёсак. Аплакваючы ахвяр гэтых жудасных падзей, аплакваем кожнага трэцяга жыхара Беларусі, які загінуў падчас Другой сусветнай вайны. Гэты боль назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах як памяць пра жорсткія злачынствы супраць чалавечнасці. І няма ім апраўдання.*

*Вельмі дарагой цаной дасталася свабода роднай зямлі нашаму народу. Гістарычную памяць пра тыя страшныя гады мы беражліва захаваем і перададзім дзецям як імунітэт супраць любой ваеннай агрэсіі ды нацыяналістычнай варожасці. Як разуменне таго, што нішто на свеце не варта адабранага чалавечага жыцця.*

*Свет зноў забывае гэтыя ўрокі. Ваенныя пагрозы, тэрарыстычныя атакі, міжканфесійныя спрэчкі ды міжнацыянальныя канфлікты запаўняюць старонкі гісторыі XXI стагоддзя новымі незлічонымі ахвярамі. І сучасны твар зла, часам схаваны за маскай добрых намераў, — такі ж агідны, як і нацызм. Ідэі звышдзяржаўнасці і пераважання нацый знаходзяць чарговых паслядоўнікаў і вядуць да новых бед.*

*Мы, беларусы, носьбіты геннай памяці нечалавечых пакут народа, які выстаяў у Вялікай Айчыннай вайне, гаворым усім: "Няхай самотны бой званоў Хатыні гучыць і перасцерагае ад паўтарэння страшнай трагедыі. Няхай іх металічны плач данясецца да тых куткоў Зямлі, дзе сёння забылі пра тое, што жыццё — гэта дар божы, мір — самая вялікая каштоўнасць. Мы павінны гэта памятаць заўсёды!"*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр **Лукашэнка**



АЛЯКСАНДР КУШНЕР

# НІКОЛІ НЕ

Ніколі пры жыцці гэтай вёскі ў ёй не было так шматлюдна, як праз гады пасля яе трагічнай гібелі. Але цяпер, 22 сакавіка, тут быў асаблівы наплыў людзей. Каля 700 чалавек прыехала сюды, каб аддаць даніну памяці загінулым. "Няхай ніколі не змоўкнуць Хатыні званы" — мітынг-рэквіем з такой назвай адбыўся на мемарыяльным комплексе, узведзеным у Лагойскім раёне. Менавіта тут роўна 75 гадоў таму — 22 сакавіка 1943 года — гітлераўскія карнікі ды іх паслугачы знішчылі беларускую вёсачку...

Слёзы былі ў многіх прысутных. І, думаю, не толькі павясноваму яркае сонца і пранізлівы да касцей зімовы мароз былі таму прычынай. Бадай, толькі ў Хатыні пачынаеш усведамляць усур'ёз маштаб і бесчалавечнасць трагедыі, якая разгарнулася тут. Асабліва чытаючы імёны і ўзрост многіх хатынцаў — 2 гады, 3, 7, 11... Усе яны — 149 чалавек, у тым ліку 75 дзяцей — згарэлі ў адным хляве ці былі расстраля-



Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава: "Для любой беларускай сям'і гэтая трагедыя ніколі не ўціхне".

# СЦІХНЕ ГЭТЫ БОЛЬ…

ныя ў адчайнай спробе выратавацца. Праз 75 гадоў пасля таго страшнага дня металічныя сполахі звону, звычайна сумна-глухія, гучалі набатам, які прабіваў да самай душы. Заклікам не паўтарыць падобнае ў далейшым.

На жаль, хоць і ведаюць Хатынь ва ўсім свеце, чуюць яе не ўсе. З нагоды 75-годдзя хатынскай трагедыі Прэзідэнт Беларусі накіраваў зварот да суайчыннікаў, тэкст якога зачытала на мітынгу-рэквіеме Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава. Пазней, размаўляючы з журналістамі, яна расказала пра асабістае ўспрыманне трагедыі:

— Мне тэма Хатыні вельмі блізкая, таму што мае бацькі перажылі вайну яшчэ дзецьмі. Яны былі маленькімі, маці жыла ў акупацыі. І ўсякі раз, слухаючы яе аповеды, я разумею цану нашай перамогі. І цану той трагедыі, якая адбылася тут 75 гадоў назад. Мне падаецца, для любой беларускай сям'і гэтая трагедыя ніколі не ўціхне. Наадварот, чым старэйшы ты становішся, тым глыбей разумееш тыя пакуты, якія выпалі на долю нашага народа.

Таму і сёння вогненны лёс Хатыні не пакідае нікога абыякавым. Наталля Качанава заклікала цаніць тое, што маем:

— Мір, спакой, магчымасць працаваць, вучыцца, рэалізоўваць свае планы і задумкі. А хатынская трагедыя назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах, у нашай памяці. Мы павінны і абавязаны перадаць гэта наступным пакаленням, каб ніколі тое, што адбылося шмат гадоў таму на нашай зямлі, не здарылася зноў. Гэтага дапусціць мы не маем права. І павінны быць удзячныя той палітыцы, якая праводзіцца ў беларускай дзяржаве. Палітыцы міралюбнасці, дружбы з нашымі суседзямі, з краінамі ва ўсім свеце, якія праводзяць такую ж палітыку.

На мітынгу-рэквіеме ў Хатыні гучала ўсебеларуская малітва пра мір. Удзел у ёй прынялі кіраўнікі чатырох вядучых рэлігійных канфесій краіны — праваслаўнай, каталіцкай, мусульманскай, іўдзейскай. Як сведчанне міжканфесійнага міру і адзінства. Усе яны пажадалі, каб на благаслаўлёнай нашай зямлі больш ніколі не паўтараліся падзеі ваеннага ліхалецця. "Слухай, неба!" — раздавалася над мемарыялам. І неба чула — голас спаленай, але няскоранай беларускай зямлі.

Міхаіл **Аўяр'янаў**

# ЗВОНЯЦЬ ЗВАНЫ ХАТЫНІ

**Пяць, чатыры, тры, два, адзін... Зваротны адлік кіламетраў пасля з’езду з трасы Мінск — Віцебск толькі пачашчае сэрцабіццё перад сустрэчай з мемарыяльным ансамблем “Хатынь”. Семдзесят пяць гадоў таму гэтым жа шляхам рухаліся ў бок вёскі са зброяй у руках гітлераўскія карнікі. Хатынь была сцёрта з твару зямлі, спалена разам з хатамі і жыхарамі.**



НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

Расходзіцца белая заслона бяроз, і перад наведвальнікам паўстае высокая чорная фігура “Нязкоранага чалавека”. Стары, прататыпам якога стаў цудам выжыўшы Іосіф Камінскі, у вобразе забітага сына выносіць насустрач нам гора і трагедыю ўсёй краіны. Справа — сімвалічная страха гумна, у якім зажыва згарэлі жыхары вёскі. Злева — брацкая магіла загінуўшых з вянком памяці. Без папярэджванняў і прэлюдый мы адразу ж трапляем на месца трагедыі. Па агульнапрынятым стандарце, любы мастацкі твор кульмінацыяй не пачынаецца, а заканчваецца. У Хатыні гэты стандарт парушаны. І парушылі яго не столькі аўтары праекта — архітэктары Юрый Градаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін і скульптар Сяргей Селіханаў, — колькі сама гісторыя. Хіба папярэдзіў хто жыхароў вёскі пра тое, што іх чакала 22 сакавіка 1943 года? Усё адбылося знянацку.

— Карнікі падышлі да Хатыні каля трох гадзін дня. Адна рота замацавалася на ўскрайку лесу і адкрыла агонь па вёсцы. Астатнія рушылі ў абыход, акружаючы вёску, — дырэктар мемарыяльнага комплексу “Хатынь” Артур Зельскі расказвае пра падзеі таго дня, можа, у тысячны раз, а ў голасе ўсё роўна чуюцца хваляванне і боль. — У гэты час у вёсцы па-ранейшаму знаходзіліся партызаны, якія прыйшлі напярэдадні, каб правесці дыверсію на дарозе Лагойск — Віцебск. — Заўважыўшы праціўніка, партызаны сталі хутка пакідаць Хатынь. Паліцаі іх не пераследавалі, працягвалі акружаць вёску. Усё насельніцтва ад малога да вялікага выганялі з хат да гумна на ўскрайку вёскі, — Артур Зельскі паказвае на

месца, дзе сёння стаіць сімвалічная страха. — Выганялі сем'ямі ў чым былі. Не шкадавалі ні старых, ні жанчын з маленькімі і груднымі дзецьмі. Дзякуючы ўспамінам Віктара Жалабковіча, адзінага сёння сведкі, які вырваўся з полымя, вядома, што стаяў сонечны дзень, раставаў снег, беглі ручаіны. Маленькія дзеткі былі басанож, пераскоквалі з ножкі на ножку, бо снег балюча апякаў іх пятачкі. Расказваць, што адбылося пасля таго, як жыхароў сагналі ў гумно, цяжка. Бо там пачынаецца ўся трагедыя, якая працягвалася да самай ночы.

Словы тут і не патрэбныя. Замест экскурсавода пра трагедыю Хатыні расказваюць званы на абелісках-комінах, адкрытыя брамкі, вянцы зрубаў, пералічаныя імёны вяскоўцаў. Усяго 149 чалавек, з іх 75 дзяцей. Самаму малодшаму, Толіку Яскевічу, якога карнікі пазбавілі і першых слоў, і першых крокаў, было ўсяго 7 тыдняў.

Помнік-дакумент — так называюць мемарыяльны ансамбль "Хатынь", створаны амаль пяцьдзясят гадоў таму. І гэты дакумент сведчыць пра трагедыю не толькі Хатыні. Ідучы па галоўнай алеі мемарыяла, наведвальнік трапляе на сімвалічныя "Могілкі вёсак". 185 беларускіх вёсак раздзялілі лёс Хатыні — згарэлі і не адрадзіліся пасля вайны. Хатынь — 186-я. Яшчэ 443, увекавечаныя на "Дрэвах жыцця", паўсталі з попелу, атрымаўшы другое жыццё. Але і гэтыя страшныя лічбы толькі невялікая дробка з тых, што вядомыя на сёння. У электронная базе дадзеных Нацыянальнага архіва Беларусі — 9093 назвы вёсак, знішчаных у гады Вялікай Айчыннай вайны цалкам або часткова, з насельніцтвам і без жыхароў.

— Заўсёды пачынаю экскурсію з таго, што ўсе тыя лічбы, якія наведвальнік бачыць на мемарыяле, адпавядаюць часу стварэння помніка, — тлумачыць Артур Зельскі. — Мы не маем права нічога змяняць — ёсць ахоўная зона мемарыяла. Да таго ж гістарычны пошук працягваецца. Дакладных лічбаў па спаленых вёсках, загінуўшых у гады вайны людзях няма і па сённяшні дзень.

У той час, калі змест ансамбля застаецца некранутым, яго знешні выгляд пастаянна патрабуе ўмяшанняў.

— Помнік знаходзіцца пад адкрытым небам. Ён падвержаны ўсім стыхіям. Заўсёды нешта трэскаецца, ламаецца, крышыцца. Вось адрамантавалі нядаўна прыступкі, — паказвае Артур Зельскі на вынік. — Па іх штодзень праходзяць сотні, а то і тысячы людзей. Бетон не вытрымаў. Прыйшлося выламаць і заліць нанова.

Летась мемарыял наведала больш за 226 тысяч чалавек. Прычым Артур Зельскі заўважыў, што колькасць аўтобусных экскурсій памяншаецца і становіцца больш індывідуальных наведванняў:

— Гэта вельмі каштоўна для нас. Сем'і — найбольш удзячныя слухачы. Яны вельмі блізка ўспрымаюць гісторыю. Упэўнены, што менавіта праз сям'ю можна весці выхаванне і ўздзейнічаць на свядомасць чалавека.

Людміла **Мінакова**

***185 беларускіх вёсак раздзялілі лёс Хатыні — згарэлі і не адрадзіліся пасля вайны. Хатынь — 186-я. Яшчэ 443, увекавечаныя на "Дрэвах жыцця", паўсталі з попелу, атрымаўшы другое жыццё***




## ГІСТОРЫЯ НЕ ДАРУЕ АБЫЯКАВАСЦІ

**Кнігу да 75-годдзя трагедыі ў Хатыні надрукавалі на беларускай, рускай ды англійскай мовах у выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі"**

Аўтар кнігі, дырэктар мемарыяльнага комплексу "Хатынь" Артур Зельскі, па сутнасці, упершыню рэканструяваў храналогію таго памятнага дня, 22 сакавіка 1943 года, калі карнікі спалілі зажыва і расстралялі амаль усіх жыхароў Хатыні. Загінула 149 чалавек, у тым ліку 75 дзяцей. Артур Зельскі па крупінках збіраў інфармацыю, выкарыстоўваў дакументы Нацыянальнага архіва, не раз сустракаўся з адзіным сведкам тых падзей, які застаўся ў жывых, Віктарам Жалабковічам. Нават праз дзесяцігоддзі ўсплываюць новыя падрабязнасці жудаснай трагедыі. Гісторыкі дагэтуль задаюцца пытаннем: што паслужыла яе каталізатарам? Ёсць версія, што людзі, маўляў, пацярпелі з-за чэмпіёна берлінскай Алімпіяды, любімца фюрара Ханса Вёльке, забітага партызанамі. Але ў такім выпадку, як быць з сотнямі іншых вёсак, якія дашчэнту спалілі фашысты? Артур Зельскі перакананы: гэта была свядомая нацысцкая палітыка знішчэння мірных людзей. Абыякава чытаць і слухаць пра тое, як карнікі мучылі і забівалі маленькіх дзяцей, жанчын і старых, проста немагчыма.

Цяпер Артур Зельскі марыць аб тым, каб у Хатыні з'явіўся музей народнай памяці.

Не пералічыць, колькі ўсяго спраектаваў за жыццё заслужаны архітэктар і прафесар Міжнароднай акадэміі архітэктуры Юрый Градаў. Мемарыяльныя ансамблі "Прарыў" і "Кацюша", "Астролаг" у Магілёве, помнікі Янку Купалу і Якубу Коласу, станцыя метрапалітэна "Няміга"... Пачнеш пералічваць — абавязкова нешта ўпусціш. Але толькі не "Хатынь". Гэты мемарыяльны ансамбль займае асаблівае месца ў яго шматгранный творчасці. Менавіта за гэты праект Градаў разам з архітэктарамі Валянцінам Занковічам, Леанідам Левіным і скульптарам Сяргеем Селіханавым у 1970 годзе атрымаў Ленінскую прэмію ў галіне архітэктуры. У год, калі адзначаем 75-годдзе з дня трагедыі і 50 гадоў з моманту адкрыцця мемарыяла, наш карэспандэнт пагутарыла з Юрыем Градавым пра гісторыю праекта.




БЕЛТА

# ПАМЯЦЬ У КАМЕНІ

## Мемарыял "Хатынь" сучасны і праз паўстагоддзя пасля адкрыцця

***— Юрый Міхайлавіч, на момант стварэння мемарыяльнага комплексу "Хатынь" вам было крыху больш за 30 гадоў. Як вы з групай такіх жа маладых калег адважыліся на такі сур'ёзны праект?***

— Усе значныя тэмы ў той час праходзілі праз конкурсы. У мяне за плячыма ўжо быў даволі вялікі досвед у праектаванні. Перад тым як прыехаць у Мінск у 1960 годзе, пасля заканчэння Маскоўскага архітэктурнага інстытута два гады працаваў у сталіцы Кіргізіі — горадзе Фрунзэ. Там былі пабудаваныя мае першыя аб'екты. Занковіч і Левін на момант майго прыезду ў Мінск толькі скончылі БДУ і нейкі час працавалі пад маім кіраўніцтвам. Калі ў 1967 годзе аб'явілі рэспубліканскі конкурс на стварэнне мемарыяла ў Хатыні, у нас ужо было нямала сумесных работ. На разгляд было прадстаўлена каля дзесяці праектаў, многія з якіх паўтаралі ўжо вядомыя архітэктурныя рашэнні. Мы ж, пачуўшы трагічную гісторыю Хатыні, якая кранала да глыбіні душы, не сталі прыдумляць нічога новага — проста пераклалі яе на мову архітэктуры і скульптурнай пластыкі. Наш праект адрозніваўся ад усіх і быў прызнаны лепшым.

***— Таму вы і называеце "Хатынь" помнікам-дакументам?***

— Так, таму што мы нічога не прыдумлялі. Прататыпам для скульптуры "Нязкоранага чалавека" стаў Іосіф Камінскі, які цудам застаўся ў жывых, з паміраючым сынам на руках. Там, дзе праходзілі вясковыя вуліцы, захавалі дарожкі-падходы, дзе стаяла 26 хат, паставілі вянкі зрубаў з пячнымі трубамі, дзе было гумно, у якім зажыва згарэлі жыхары, паставілі страху, якая абрушылася. Проста прымусілі кожны элемент вобразна гаварыць. Страху знарок зрабілі масіўнай, каб адлюстраваць бяду, якая напаткала краіну. Брамкі пакінулі адчыненымі ў знак гасціннасці беларусаў. Вертыкалі, каб адысці ад прамой асацыяцыі з пячной трубой, завяршылі званамі. Калі ўпершыню пачулі гісторыю вёскі і прыехалі на месца трагедыі, над Хатынню гучаў спеў жаваранка.

Захацелася, каб ансамбль гаварыў. Так з'явіліся званы.

***— У савецкім манументальным мастацтве працвітала гігантаманія — Мамаеў курган, Курская дуга. У параўнанні з падобнымі аб'ектамі Хатынь выглядае даволі камерна.***

— Мы зыходзілі з маштабу простай вясковай хаты. Самы высокі элемент ансамбля — 6 метраў. Мы не сталі канкурыраваць з прыродай. Гэта сёння будуюць хмарачосы, гарады спаборнічаюць, хто ўзвядзе больш высокі будынак. Возьмем, да прыкладу, знакаміты храм Саграда Фамілія Антоніа Гаўдзі. Ён пабудаваў храм на метр ніжэй за барселонскую гару Манжуік — каб не спаборнічаць з Богам. Сама прырода ў Хатыні з яе мяккім ландшафтам, белымі стваламі бяроз, ляснымі абрамленнем дапамагае адчуць камерную сутнасць мемарыяла.

***— Афіцыйна ансамбль адкрыты 5 ліпеня 1969 года. Але гэта ўжо было другое адкрыццё помніка?***

— Упершыню мемарыял быў адкрыты ў 1968 годзе. Тады ж на адкрыцці першы намеснік старшыні Савета міністраў СССР Кірыл Мазураў прапанаваў надаць мемарыялу больш вобразнае гучанне — праз трагедыю адной вёскі паказаць трагедыю ўсяго беларускага народа. Так у ансамблі, не парушаючы яго гармонію, з'явіліся сімвалічныя могілкі вёсак, вечны агонь з трыма бярозкамі ў памяць пра кожнага трэцяга беларуса, які загінуў у вайне, і зрокава бясконцая "Сцяна памяці" ахвяр нацысцкіх канцлагераў.

***— Сёння ваеннае манументальнае мастацтва перажывае другое нараджэнне. Нядаўна, напрыклад, быў рэканструяваны "Прарыў" ва Ушацкім раёне. Хатынь патрабуе гэтага другога нараджэння?***

— У 2004 годзе пад эгідай Прэзідэнта ўжо была праведзена рэканструкцыя — шмат чаго трэба было паправіць. Сёння можна паспрабаваць вярнуцца да нейкіх нерэалізаваных ідэй. Яшчэ падчас зацвярджэння праекта пяцьдзясят гадоў таму мы прапаноўвалі паставіць на старых вясковых могілках крыж, увекавечыўшы памяць аб продках хатынцаў, — і сёлета такі крыж з'явіўся. Была ідэя зрабіць на ўзгорку ля сцяны з імёнамі ахвяр невялікую кіназалу, у якой можна было паглядзець нямецкую хроніку ваеннага часу. Ідэя разглядалася, але



АЛЯКСАНДР СТАДУБ

згасла з-за адсутнасці фінансавання. Сёння не позна да яе вярнуцца.

***— Разам з рэканструкцыяй помнікаў многія з іх проста знішчаюцца — у Польшчы, краінах Балтыі. Як вам падаецца, гэта гульня палітыкаў ці наша ўсеагульная абыякавасць да мінулага?***

— Уся справа ў палітыцы. У некаторых краінах, на жаль, на дзяржаўным узроўні замацоўваецца негатыўнае стаўленне да савецкага мінулага. Жадаючы пазбавіцца ад элементаў камуністычнай спадчыны, зносяцца помнікі савецкім воінам. Але ж гэта помнікі не камунізму, не савецкаму строю — а людзям, якія, рызыкуючы жыццём, вызвалялі захопленыя гітлераўцамі тэрыторыі. Усё залежыць ад кіраўніцтва краіны. Улада можа спыніць або ўзмацніць гэтую негатыўную з'яву.

—

Вы ў



ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

Беларусь пераехалі пасля заканчэння інстытута. А калі ўсвядомілі, што гэтая краіна стала для вас родным домам?

— Калі існаваў Савецкі Саюз, не было розніцы, дзе жыць і працаваць. Адчуваў сябе як дома і ў Кіргізіі, дзе працаваў пасля інстытута, і ў Беларусі. Дарэчы, ехаў у Кіеў праз Мінск, а паколькі вось-вось павінна была нарадзіцца дачка, тут і застаўся і ўсё жыццё прарабіў у інстытуце "Мінскпраект".

Людміла **Мінакова**




# "БРАВА! ЗДОРАВА! МАЛАЙЦЫ!"

**Якія ж усё-такі таленавітыя ў нас людзі! У гэтым яшчэ раз давялося пераканацца на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з творчай моладдзю, якая прайшла ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры. Амаль чатыры гадзіны душэўных шчырых зносінаў праляцелі непрыкметна. Наш карэспандэнт пабываў на гэтым мерапрыемстве і даведаўся, чым здзівілі Прэзідэнта юнакі і дзяўчаты і чаму сёння так важна падтрымліваць адораную моладзь.**

Маладзёжны тэатр невыпадкова выбралі месцам гэтай сустрэчы. Факты гавораць самі за сябе. За пяць гадоў каля 40 прэм'ер, а яшчэ паспяховыя фестывалі і гастролі ў Расіі, Украіне, Румыніі, Літве, Латвіі, Францыі і Германіі. На самай справе тут сканцэнтравана сапраўдная скарбніца талентаў. Але ў гэты дзень "Маладзёжка" прымала каля 300 гасцей з усёй краіны. Сярод іх лепшыя студэнты і выкладчыкі навучальных устаноў у сферы культуры, пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў і конкурсаў, лаўрэаты і стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта.

Аляксандра Лукашэнку ў холе тэатра сустракаў музычны калектыў "Валачобнікі" і хор Белдзяржакадэміі музыкі. Іх выступленне зачароўвае з першых секунд.

— А гаворыць, на "Еўрабачанне" няма каго пасылаць, — усміхнуўся Прэзідэнт.

Зрэшты, гэта быў толькі пачатак. Практычна ля кожнага павільёна Аляксандр Лукашэнка з непадробнай цікавасцю разглядаў музычныя інструменты, дзіўныя скульптуры, вырабы з керамікі, дэкаратыўныя пано з тканіны, шкла і металу, зробленыя таленавітымі майстрамі.

— Вы на гэтым проста можаце зарабляць грошы, — звярнуўся Прэзідэнт да рэктара ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аліны Корбут.

— Калі будуць заказы, мы гатовыя, — нікольні не збянтэжылася яна.

Тут жа студэнты выступілі з музычнымі нумарамі. Вакал Анастасіі Рабцэвіч з Белдзяржакадэміі музыкі настолькі ўразіў Аляксандра Лукашэнку, што ён папрасіў яе, што называецца, на біс выканаць яшчэ адну кампазіцыю.

— Брава! Здорава! Малайцы! — не скупіўся на кампліменты і пахвалы Аляксандр Лукашэнка.

Крыху пазней, выступаючы перад прысутнымі, Прэзідэнт са шкадаваннем канстатаваў, што вельмі сумна становіцца, калі разумееш,

што нашым сучаснікам, каб праславіцца на радзіме, трэба спачатку заявіць пра свой поспех за яе межамі.

— Нашы артысты оперы і балета, музыканты, народныя калектывы выступаюць на лепшых сусветных сцэнах. Іх ведае і цэніць замежная публіка. Але якія імёны шырока вядомыя ў нашай краіне? Чаму мы не ацэньваем па заслугах іх майстэрства да таго, як гэта зробіць замежная публіка? Гэта наша вялікая праблема. Карані яе ў набытым у 90-я гады лжывым пачуцці ўласнай непаўнацэннасці. Ёсць такая рыса ў нашага народа. Адораныя людзі павінны быць вядомыя і запатрабаваныя перш за ўсё на сваёй зямлі.

І калі самі пра сябе не паклапоцімся, ніхто іншы гэтага не зробіць. Сябе пачнём больш паважаць, сваіх — цаніць.

Прэзідэнт шмат гаварыў пра тое, як важна адрозніваць сапраўднае мастацтва ад фальшывага. Сёння інтэрнэт і тэлебачанне нашпігаваныя разнастайнымі “хітамі”, якія набіраюць мільёны праглядаў, але пры гэтым не маюць нічога агульнага з прыгажосцю і эстэтыкай. Менавіта з гэтай прымітыўнай “культуры” і пачаўся распад моцнай дзяржавы.

— За дваццаць з нечым гадоў перавярнулі ўсё грамадства, лічылі, што гэта лепш, гэта свабода. Вось атрымалі вынік. Таму для мяне вельмі каштоўная ваша творчасць, яна не такая, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка.

Адсюль і важнае пажаданне маладым людзям:

— Дзе б вы ні праявілі сябе — у літаратуры, акадэмічным мастацтве, кіно, на тэлебачанні, эстрадзе, у танцы, — вы будзеце дарыць людзям настрой, эмацыйна ўзбагачаць іх і, галоўнае, фарміраваць духоўны каркас нацыі. Важна не звярнуць на дарогу лёгкай славы і бяздумнага пераймання.

Поспех — гэта не толькі лаўры, авацыі, папулярнасць, але і вялікая сацыяльная адказнасць. Чалавек так устроены, што лягчэй успрымае негатыўную інфармацыю. Менавіта на гэтым часцей за ўсё робяць сабе імя пасрэдныя асобы. Гэта самы хуткі і просты спосаб звярнуць на сябе ўвагу. Таму ён такі спакуслівы. І небяспечны. Таму ад таго, як складзецца творчы лёс цяперашняга маладога пакалення, залежыць будучыня нашай краіны.

Ёсць і яшчэ адна праблема. У Беларусі створаны ўсе ўмовы для старту таленавітай моладзі. Аднак імёны пераможцаў разнастайных конкурсаў і праектаў нярэдка забываюцца адразу ж пасля таго, як заканчваецца іх выступленне. У Прэзідэнта сваё меркаванне на гэты конт:

— Прасоўванне сваіх талентаў — справа не толькі менеджараў і прадзюсараў, дзяржаўныя структуры не павінны заставацца ўбаку. Міністэрствам культуры, інфармацыі, адукацыі, а таксама сродкам масавай інфармацыі трэба яшчэ актыўней падключацца да пошуку і раскруткі маладых талентаў.

У Год малой радзімы самы час пераламаць сітуацыю. Адораныя людзі павінны быць вядомыя і запатрабаваныя перш за ўсё на сваёй зямлі. А для гэтага трэба ўзнімаць статус гарадоў і вёсак, дзе нарадзіліся і выраслі нашы вядомыя паэты, драматургі, мастакі, музыканты, зрабіць гэтыя населеныя пункты месцам культурных падзей, прыцягнуць туды замежных прыхільнікаў высокага мастацтва. Аляксандр Лукашэнка даручыў дзяржорганам прадставіць канкрэтныя прапановы, якія паставяць кропку ў гэтай тэме.

Запомніўся і яшчэ адзін цікавы момант. На сцэне побач з Прэзідэнтам сядзела лаўрэат многіх песенных конкурсаў, студэнтка ўніверсітэта культуры і мастацтваў Лізавета Запека. Чарнільнай ручкай па просьбе Прэзідэнта яна запісвала пытанні, якія задавалі студэнты. Пад заслону мерапрыемства Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на выпацканыя чарнілам рукі дзяўчыны.

— Цяпер я бачу, што моладзь чарнілам абсалютна пісаць не ўмее, — пажартаваў Аляксандр Лукашэнка і падарыў Лізе сувенірную пазалочаную ручку, упрыгожаную гербам Беларусі. Аказваецца, якраз такая ж ёсць у Сі Цзіньпіна, Пуціна і Назарбаева. На развітанне студэнты падарылі Прэзідэнту карціну “Малая радзіма” з выявай старой школы ў Александрыі.

Яўген **Конанаў**

**Падчас сустрэчы Прэзідэнт адказаў на пытанні маладых людзей.**

## Пра пачуццё справядлівасці

— Мая першая прэзідэнцкая праграма заключалася ў тым, каб адвесці народ ад прорвы. Мне хацелася змяніць жыццё і пабудаваць яго на прынцыпах справядлівасці. Для мяне галоўны прынцып у жыцці — гэта справядлівасць.

Аляксандр Лукашэнка назваў і іншыя якасці, якія трэба мець паспяховаму чалавеку. Перш за ўсё гэта талент і гатоўнасць шмат працаваць для таго, каб рэалізаваць свае здольнасці.

## Пра старонку ў сацсетцы

Студэнты спыталі ў Прэзідэнта, калі можна чакаць з’яўлення яго старонкі ў інстаграм?

— Гэта вялікая адказнасць, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі адкрыю старонку, то вымушаны буду мець зносіны. Там жа будуць тысячы зваротаў, пытанняў. У мяне не хопіць часу асабіста на гэта адказваць. Тыя з палітыкаў, хто мае гэтыя старонкі, карыстаюцца дапамогай сваіх памочнікаў. Але гэта несумленна. Таму я не спяшаюся гэта рабіць.

## Пра кінематограф

На пытанне пра любімыя віды мастацтва Аляксандр Лукашэнка сказаў, што больш блізкія яму кіно і музыка. Але ў аснове кінамастацтва павінна быць праўда і толькі потым камерцыйная выгада, перакананы Прэзідэнт.

## Пра творчыя ідэі

Прэзідэнт выказаў меркаванне наконт таго, ці можа перспектыўная творчая ідэя стаць залогам для крэдыту ў банку:

— Я гэтага хацеў бы. Можна паспрабаваць, калі ў вас ёсць такая каштоўная ідэя, якая прынясе заўтра грошы. І для банка гэта вельмі важна, каб менш было рызык.



# ЧАМУ ЭКСПАРЦЁРАМ ПАТРЭБНА НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ВІТРЫНА

**Наша краіна актыўна рыхтуецца да Сусветнай выставы “ЭКСПА-2020”, якая будзе праходзіць з кастрычніка 2020 па красавік 2021 года ў Дубаі. Што азначае для нас такі ўдзел, якія беларускі экспартны патэнцыял і роля дыпламатаў у яго пашырэнні, — пра гэта наша размова з дырэктарам Нацыянальнага цэнтра маркетынгу і кан’юнктуры цэн, Паслом Рэспублікі Беларусь Валерыем Садохам.**

***— Увага дзяржавы да пытанняў нарошчвання экспарту зразумелая і цалкам лагічная. Як і тое, што плячо нашым вытворцам падстаўляюць дыпламаты. А якая роля ўзначаленага вамі цэнтра?***

— У 2016 годзе па рашэнні Міністра замежных спраў работа нашага цэнтра была перафарматавана з улікам неабходнасці інфармацыйнай падтрымкі экспарту. Намі створана ўпраўленне міжнароднага супрацоўніцтва, з 1 студзеня 2017 года запушчаны новы партал Export.by — вітрына беларускіх тавараў у інтэрнэце, якая дазваляе ў любой дзяржаве ўбачыць увесь наш таварны асартымент. Ужо сёння на гэтым партале 5 тысяч прадпрыемстваў і 15 тысяч найменняў тавараў. На гэтым жа партале — створаныя пры садзейнічанні нашых пасольстваў краінавыя даведнікі. Экспарцёру дастаткова націснуць кнопку — і ён бачыць поўную інфармацыю аб рынку той ці іншай краіны, яе тарыфнай спецыфіцы, правілах афармлення неабходных дакументаў для экспарцёраў і шмат іншых карысных звестак. Сур’ёзна мы ставімся і да выставачнай дзейнасці, фарміравання іміджу нашай краіны за мяжой. Летась было праведзена пяць выстаў, у тым ліку тры Нацыянальныя экспазіцыі Рэспублікі Беларусь — дзве ў Расіі і адна ў Мазамбіку. У 2018-м мы правядзём ужо восем мерапрыемстваў: калектыўныя стэнды беларускіх прадпрыемстваў будуць прадстаўлены на выставах у Польшчы, Кыргызстане, Казахстане, Латвіі, нацыянальныя экспазіцыі — на выставах у Марока, ЗША, Кітаі, Расіі. Рыхтуемся да Сусветнай выставы “Экспа-2020” у Дубаі — менавіта наш цэнтр вызначаны Урадам у якасці аператара нацыянальнай экспазіцыі, канцэпцыя якой будзе ўяўляць з сябе “тры і”: інавацыі, інвестыцыі, індывід.

***— Удзел у такіх мерапрыемствах абыходзіцца нятанна. Яны акупляюць сябе?***

— Нельга манетазаваць імідж краіны, пераводзіць яго ў валютны ды іншыя складнікі. Імідж — нешта больш дарагое. Скажам, на выставе “ЭКСПА-2017”, якая праходзіла ў Астане, пабывала 23 мільёны наведвальнікаў. У Дубаі арганізатары чакаюць убачыць 25-30 мільёнаў. А футбольны чэмпіянат свету, напрыклад, наведваюць 3 мільёны... Акрамя таго, наш цэнтр — аператар 1-й Міжнароднай выставы імпартных тавараў і паслуг, якая будзе прахо-

дзіць у лістападзе ў Шанхаі. Гэта найбуйнейшая выстава, на якой будуць прысутнічаць імпарцёры з усіх кітайскіх правінцый. Мы вельмі разлічваем і на гэтае мерапрыемства, і на кітайскі рынак у цэлым.

***— Наша цікавасць да вялікага Кітая зразумелая. Але вы за сваю надзвычай насычаную дыпламатычную кар'еру працавалі ў многіх краінах. Былі паслом у В'етнаме, а таксама ў Тайландзе, Лаосе, Камбоджы і М'янме па сумяшчальніцтве. Чым цікавая Беларусь там?***

— В'етнам падпісаў пагадненне аб свабодным гандлі з ЕАЭС, што палепшыла канкурэнтныя перавагі беларускай прадукцыі на мясцовым рынку. Многія нашы прадпрыемствы — МТЗ, МАЗ, БелАЗ — паводзяць сябе тут больш грунтоўна: арганізуюць зборачныя вытворчасці, новыя працоўныя месцы і таму ствараюцца ўмовы для шматгадовага супрацоўніцтва. Не варта забываць і тое, што наша тэхніка, выробленая ў В'етнаме, можа бяспошлінна пастаўляцца ва ўсе краіны АСЕАН. Гэта ўнікальныя магчымасці — і пра іх варта думаць усім нашым прадпрыемствам. Акрамя таго, В'етнам імпартуе 80 працэнтаў неабходнай яму малочнай прадукцыі. Беларусь яе найбуйнейшы пастаўшчык. Калі раней пошліна на нашу малочку складала 15 працэнтаў, то цяпер — 2-3. У той жа час літр малака ў В'етнаме каштуе амаль удвая даражэй, чым у нашай краіне. А кілаграм сыру ў гандлёвай сетцы — да 25 долараў.

***— А што з другой часткай планеты? У канцы мінулага года Прэзідэнт анансаваў шэраг візітаў у краіны амерыканскага кантынента: нас запрашаюць як мінімум пяць дзяржаў.***

— У Паўднёвай Амерыцы ёсць МЕРКАСУР — агульны рынак, які аб'ядноўвае Аргенціну, Бразілію, Уругвай, Парагвай ды іншыя краіны. І раз мы ў тую ж Бразілію пастаўляем нямала калійных угнаенняў для павышэння ўраджайнасці ў сельскай гаспадарцы, то чаму б не наладзіць там вытворчасць нашай сельгастэхнікі? Хоць сусветны інтарэс да нашай прадукцыі бывае самым нечаканым. Нядаўна наш пасол у Аўстраліі паставіў пытанне: чаму на Export.by не прадстаўлены беларускі дзіцячы абутак? Аказалася, у Аўстраліі, дзе нямала кітайскага дзіцячага абутку, даведаліся пра высокую якасць нашага. І пачаў расці інтарэс да яго.

***— Тэма недастатковай кампетэнтнасці работнікаў аддзелаў маркетынгу не раз узнімалася "Народной газетой" у мінулыя гады. Сітуацыя мяняецца да лепшага?***

— У нас створаны Адукацыйны цэнтр, які рэалізуе адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у галіне знешнеэканамічнай дзейнасці і закупак. Акрамя таго, мы правадзілі маніторынг работы знешнегандлёвых службаў нашых прадпрыемстваў, у ходзе якога атрымалі інфармацыю пра тое, што ведаў замежных моў кіраўнікамі і спецыялістамі такіх службаў, як правіла, недастаткова. Радуе тое, што сёння ўсё больш маладых спецыялістаў валодаюць замежнымі мовамі, быць непераадольнай перашкодай моўны фактар перастаў. А вось неразуменне таго, што на дварэ XXI стагоддзе, засталося. І што электронны гандаль стаў паўсядзённасцю. Адкрыйце, напрыклад, сайт па продажы іншамарак у Мінску — там будуць усе мадыфікацыі ды цэны на іх. Многія ж беларускія прадпрыемствы дагэтуль перакананыя: раз у іх ёсць свой сайт, "нацыянальная вітрына" ім не патрэбная. Але не будзе сёння пакупнік шукаць інфармацыю на карпаратыўных сайтах, калі ёсць зводныя парталы! Я неяк звярнуў увагу на выставе ў М'янме, што шведскі аналаг нашага МАЗа прадаецца ў 1,8 раза даражэй, чым наш грузавы аўтамабіль. Пра такую розніцу павінны ведаць усе і ў любым пункце зямнога шара!

***— Трэба меркаваць, што і на Дэкрэт "Аб развіцці лічбавай эканомікі", які ўступіў у сілу, у вас асобыя віды?***

— Зразумела. Па-першае, наш цэнтр з'яўляецца аператарам афіцыйнага сайта для размяшчэння інфармацыі аб дзяржзакупках (icetrade.by) і электроннай гандлёвай пляцоўкі (goszakupki.by), 80 працэнтаў ад колькасці электронных працэдур закупак, якія праводзяцца ў нас, размяшчаецца менавіта на ёй. Мы выдаём электронны лічбавы подпіс як для беларускіх, так і для замежных гандлёвых кампаній для ўдзелу ў працэдурах закупак у Рэспубліцы Беларусь. Акрамя таго, мы збіраемся ў перспектыве ператварыць Export.by ў паўнацэнную электронную гандлёвую платформу, аналагічную кітайскай Alibaba ці амерыканскай Amazon. Такому развіццю будуць садзейнічаць уласны штат IT-спецыялістаў і наша супрацоўніцтва з кампаніямі, якія ўваходзяць у Парк высокіх тэхналогій. Бо экспарт — гэта не абстрактныя лічбы справаздач. Гэта развіццё ўсёй краіны, рост дабрабыту кожнага з нас.



# РЭВАЛЮЦЫЯ З ДАПАМОГАЙ ЛІЧБЫ

**Так, дэкрэт № 8 “Аб развіцці лічбавай эканомікі” ўступіў у сілу. Яшчэ да прыняцця гэтага дакумента яго называлі не інакш як рэвалюцыйным. У прынцыпе, так яно і ёсць. У краіне ствараюцца беспрэцэндэнтныя ўмовы для вядзення IT-бізнесу, што абяцае сур’ёзныя канкурэнтныя перавагі для ўсёй эканомікі. За кошт чаго гэта стане магчыма? Па растлумачэнні мы звярнуліся да аднаго з распрацоўшчыкаў дэкрэта, старшыні Экспертнага савета Парка высокіх тэхналогій Аляксандра КУРБАЦКАГА.**

## Пашырыцца спіс відаў дзейнасці рэзідэнтаў ПВТ

— Дэкрэт дае магчымасць рэзідэнтам ПВТ не толькі распрацоўваць праграмнае забеспячэнне, але і ствараць уласную высокатэхналагічную прадукцыю, — тлумачыць Аляксандр Курбацкі. — У пералік новых відаў дзейнасці ўваходзяць, напрыклад, сістэмы беспілотнага кіравання, авіяцыйных і касмічных тэхналогій, кіберспорт, біржы крыптавалют і многае іншае. Важна, што ў прадуктовай мадэлі бізнесу, якую падтрымлівае дэкрэт, на аднаго праграміста прыпадае некалькі спецыялістаў іншага профілю: бізнес-аналітыкі, маркетолагі, перакладчыкі, дызайнеры. Тым самым ствараюцца дадатковыя працоўныя месцы.

## Прадаўжаецца дзеянне існуючых ільгот у ПВТ

Дэкрэт прадоўжыў дзеянне спецыяльнага падатковаправавога рэжыму ПВТ да 1 студзеня 2049 года. У прыватнасці, гаворка ідзе пра паніжаную (да дзевяці працэнтаў) стаўку падаходнага падатку, вызваленне ад падатку на прыбытак і ПДВ. Акрамя таго, адменены візы для замежных грамадзян, якія наймаюцца на работу рэзідэнтамі ПВТ, а таксама для заснавальнікаў гэтых рэзідэнтаў. Дазвол на прыцягненне рабочай сілы з-за мяжы ім таксама не патрэбны

## Крыптавалюты, ICO і смарт-кантракты стануць легальнымі

Беларусь становіцца першай у свеце краінай з комплексным прававым рэгуляваннем бізнесаў на аснове тэхналогіі блакчэйн. Паводле слоў Аляксандра Курбацкага, у ПВТ змогуць працаваць крыптабіржы і крыптаабменнікі. А ў грамадзян і юрыдычных асоб з’явіцца магчымасць майніць, купляць, дарыць, абменьваць крыптавалюту. Пры гэтым да 2023 года дзейнасць па стварэнні, набыцці і адчужэнні токенаў не абкладаецца падаткамі.

— Акрамя таго, Беларусь легалізуе смарт-кантракты на краінавым узроўні. У аснове смарт-кантракта ляжыць праграмны код, які ствараецца і выкарыстоўваецца на аснове блакчэйн-тэхналогій. У дадзеным выпадку функцыі кантролю выканання дагавораў бярэ на сябе камп’ютарная сістэма, практычна выключаючы суб’ектыўны чалавечы фактар.

## Максімальна спрашчаецца работа IT-кампаній

Напрыклад, знешнеэканамічныя здзелкі можна заключаць у электронным выглядзе з выкарыстаннем інтэрнэту. Адмяняецца дазвольны парадак на адкрыццё рахункаў у банках-нерэзідэнтах. Акрамя таго, цяпер можна будзе афар-



НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

мляць пярвічныя ўліковыя дакументы, выкарыстоўвачы агульнасусветныя падыходы, у тым ліку ў аднабаковым парадку (без неабходнасці запатрабаваць подпіс у контрагента, калі гэта тэхнічна немагчыма).

У цэлым дэбюракратызацыя IT-бізнесу — выдатны сігнал не толькі для буйных інвестараў, але і для невялікіх кампаній, маладзёжных стартапаў. Важна, каб маладыя людзі канцэнтраваліся на сваім прадукце, а не адцягвалі ўвагу на бюракратычную цяганіну.

***Беларусь становіцца першай у свеце краінай з комплексным прававым рэгуляваннем бізнесаў на аснове тэхналогіі блакчэйн. У краіне змогуць працаваць крыптабіржы і крыптаабменнікі. А ў грамадзян і юрыдычных асоб з'явіцца магчымасць майніць, купляць, дарыць, абменьваць крыптавалюту***

## IT-кадраў будзе больш

Рэзідэнтам ПВТ дазваляецца займацца адукацыйнай дзейнасцю ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

— На базе адміністрацыі ПВТ плануецца распрацаваць прафесійна-кваліфікацыйныя стандарты, на падставе якіх сумесна з рэзідэнтамі парка ствараць сучасныя вучэбныя праграмы па падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў-айцішнікаў.

Акрамя таго, для рэзідэнтаў ПВТ істотна спрашчаецца аказанне спонсарскай дапамогі ўстановам адукацыі, уключаючы гранты для студэнтаў і выкладчыкаў.

# КАЛІ КАНКУРЫРАВАЦЬ — ТО ВА ЎСІМ СВЕЦЕ





ПАВЕЛ ЧУЙКО

У сярэдзіне сакавіка, яшчэ да ўступлення ў сілу дэкрэта “Аб развіцці лічбавай эканомікі”, рэзідэнтамі ПВТ сталі адразу 46 кампаній. Гэта абсалютны рэкорд за 13 гадоў існавання беларускай Крэмніевай даліны — колькасць кампаній узрасла адразу на чвэрць. Цяпер у Парку 238 рэзідэнтаў, сярод якіх ёсць і стартапы, і філіялы буйных замежных фірмаў. Напрыклад, рэзідэнт ПВТ ТАА “МэпДэйта” — цэнтр распрацоўкі амерыканскай кампаніі Mapbox, якая займаецца персанальнымі анлайн-картамі. А мінскі офіс будзе ствараць тэхналогіі для беспілотных аўтамабіляў. Яшчэ адно вядомае імя на сусветным IT рынку, холдынг Mail.Ru Group, прыйшоў у ПВТ як “Игро Тэк”. У гэтай кампаніі займуцца гульнявымі праектамі. Сярод “пачаткоўцаў” — 8 прадуктовых кампаній, а 21 спалучаюць распрацоўку ўласных прадуктаў з аўтсорсінгам. Гэта значыць, што ў Беларусі ў хуткім часе могуць з’явіцца цікавыя і запатрабаваныя тэхналогіі, якія стануць вядомыя ва ўсім свеце накшталт Viber або AlMatter, які купіў Google. Ужо цяпер сярод рэзідэнтаў ПВТ ёсць унікальныя праекты, пра якія варта расказаць.

## Сціраючы грань паміж лічбавым і рэальным светам

Кампанія “VRTEK” збіраецца сцерці адрозненні паміж рэальным і віртуальным светам. Іх галоўнае і ўжо шырока вядомае вынаходства — касцюм Teslasuit. Гэта вопратка будучыні, фактычна новая скура, якая праз электрастымуляцыю перадае адчуванні з віртуальнай рэальнасці. Першапачаткова Teslasuit ствараўся як касцюм для геймераў, але яго патэнцыял аказаўся значна шырэйшы. Аперацыйны дырэктар кампаніі Дзмітрый Міхальчук расказвае, што іх прадукт можа быць запатрабаваны ў медыцыне, спорце і касманаўтыцы. Касцюм аснашчаны сістэмай захопу рухаў, мноствам біяметрычных датчыкаў, ёсць нават клімат-кантроль. Teslasuit можа прымяняцца пры постаперацыйнай рэабілітацыі,

аднаўленні пасля інсульту, таму што дазваляе прапрацоўваць канкрэтныя мышцы, не напружваючы ўсе групы. У будучыні Teslasuit можа спатрэбіцца кожнаму з нас. Такая вопратка зможа счытваць стан нашага здароўя, сачыць за фізіялагічнымі паказчыкамі, а файл з дадзенымі можна будзе адразу адправіць урачу.

— Цяпер мы ўжо добра вядомыя, таму не пытаюць, ці маем мы дачыненне да Tesla Motors Ілана Маска, — прызнаецца Дзмітрый Міхальчук. — У Лас-Вегасе многія гаварылі нам, што электракары, акуляры VR (віртуальнай рэальнасці) — ужо старызна, а ваш праект — самы інавацыйны. У свеце няма прадукту ўзроўню Teslasuit, ёсць толькі асобныя тэхналогіі. Пры гэтым з'яўленне канкурэнцыі толькі сыграе нам на руку, пакажа, што сама ідэя працуе. Я ўпэўнены, што ў любым выпадку наша каманда зможа зрабіць лепш. Мы канкурыруем не ўнутры краіны, а ва ўсім свеце.

У "VRTEK" тры офісы — у Мінску, Брэсце і Лондане. У беларускай сталіцы праводзяцца распрацоўка і даследаванні. Цяпер тут працуюць каля 60 чалавек, але набіраюцца новыя супрацоўнікі і да канца года штат вырасце да ста. У кампаніі цяпер так шмат запытаў на інавацыйную вопратку, што чарга распісана на два гады наперад. Да даследаванняў прыцягваюць спецыялістаў з розных сфер — медыкаў, навукоўцаў, у прыватнасці нейрабіёлагаў, хочуць супрацоўнічаць і з Акадэміяй навук Беларусі.

Над Teslasuit поплеч працуюць праграмісты, швачкі, электроншчыкі… Паводле слоў Дзмітрыя, большасць паспяховых праектаў рэалізуе ідэі менавіта на стыку тэхналогій. Больш за тое, сёння стартапы аблічбоўваюць усе іншыя сферы эканомікі, а IT актыўна прымяняецца і ў рэальным сектары. І гэты прагрэс павінен павялічвацца з пераходам да лічбавай эканомікі. Але ці ўдасца Беларусі ўвасобіць усе амбіцыі стаць Крэмніевай далінай Усходняй Еўропы? Дзмітрый лічыць, што перспектывы ёсць:

— Нашы праграмісты ўжо зарэкамендавалі сябе на сусветным рынку. Раней менавіта нам аддавалі "немагчымыя" праекты, або занадта складаныя, або з невялікім бюджэтам. Так мы ў Амерыцы і ў Брытаніі ўжо забіраем вялікі аб'ём аўтсорс-заказаў. Аднак важная і дапамога дзяржавы. Калі не стымуляваць рынак з унутранага боку, то мы страцім канкурэнтаздольнасць на сусветным рынку. Сярод асноўных прычын, чаму мы цяпер уступілі ў ПВТ, не столькі падатковыя льготы, а ў першую чаргу, спрашчэнне адміністрацыйных працэдур. Дэкрэт №8 значна палягчае дакументаабарот, што дае магчымасць нам займацца непасрэдна IT, а не папяровай валакітай. Таксама надзвычай важнае ўвядзенне элементаў англійскага права, бо мы працуем на міжнародным рынку. Вельмі спадзяюся, што гэтая тэндэнцыя з ПВТ распаўсюдзіцца і ў іншыя сферы эканомікі.

## Тэхналогіі разумнага поля

Высокія тэхналогіі прыходзяць і ў сельскую гаспадарку, здавалася б, самы кансерватыўны сектар эканомікі. Тым не менш, калі сёння займацца традыцыйным земляробствам, то можна не толькі аказацца ззаду сваіх канкурэнтаў, але і губляць дзясяткі, а то і сотні тысяч долараў кожны сезон. Эканомію сродкаў і высокія ўраджаі дапаможа забяспечыць аграстартап OneSoil. Яшчэ ў 2013 годзе праграміст Вячаслаў Мазай і спецыяліст па геаінфармацыйных сістэмах Усевалад Генін прыдумалі анлайн-сэрвіс для маніторынгу



стану пасяўных плошчаў, павышэння ўраджайнасці і эканоміі рэсурсаў з дапамогай штучнага інтэлекту. Праект нацэлены на дакладнае земляробства, калі інавацыі робяць сельскую гаспадарку больш эфектыўнай. Для аналізу стартап выкарыстоўвае як адкрытыя дадзеныя, так і збірае іх з палёў, прымяняючы аэраздымку. У арсенале каманды — дрон, лятальнае крыло і бензінавы верталёт. Улетку большая частка работы заснавальнікаў OneSoil праходзіць менавіта ў палях.

— У Беларусі ёсць перадавыя гаспадаркі, якія разумеюць, што інавацыі неабходныя, — расказвае Вячаслаў. — Іх не трэба ўгаворваць, яны адразу згаджаюцца на супрацоўніцтва. За кошт такіх прыкладаў потым мы можам паказаць, што нашы тэхналогіі сапраўды працуюць. Так паступова ў аграрнай сферы пачынаюць мяняцца ўяўленні.

У планах кампаніі — выхад на еўрапейскі рынак, сваю экспансію беларусы пачнуць з Прыбалтыкі. Паводле ацэнак Вячаслава Мазая, на сусветным рынку ў OneSoil не шмат канкурэнтаў:

— Падобныя праекты ёсць у Паўночнай Амерыцы — ЗША і Канадзе, але мы пакуль туды не глядзім. У СНД ёсць адна або дзве кампаніі, але яны прапаноўваюць сістэмы накшталт "дзённіка агранома", а мы займаемся апрацоўкай спадарожнікавых здымкаў, аналізам вялікіх дадзеных, робім рэкамендацыі па ўнясенні ўгнаенняў. Мы на гэтым сканцэнтраваныя і гэтым адрозніваемся.

Што новы IT-дэкрэт дасць звычайным людзям?

У лістападзе мінулага года агратэхнічны стартап OneSoil атрымаў паўмільёна долараў інвестыцый ад венчурнага фонду Haxus, а таксама прадпрымальнікаў Юрыя Мельнічка і Леаніда Лознера. Заснавальнікі праекта пакуль не раскрываюць таямніцу, на што канкрэтна пойдуць сродкі, але інтрыгуюць, што гэта будзе распрацоўка рэвалюцыйнага рашэння для рынку. Вячаслаў гаворыць, што новы прадукт будзе звязаны з вялікімі дадзенымі і штучным інтэлектам.

стар. 26

стар. 25

## Рэпутацыя ў інтэрнэце — новы капітал

У новым наборы ПВТ аказаўся і яшчэ маленькі, але вельмі амбіцыйны праект Rocketdata. Менавіта так стартап апісвае яго сузаснавальнік Дар'я Данілава. Каманда Rocketdata распрацоўвае прадукт для маркетолагаў і ўласнікаў бізнесаў, які дапамагае кампаніям кіраваць анлайн-прысутнасцю і рэпутацыяй у інтэрнэце.

Ідэя з'явілася ў 2016 годзе, калі інвестары стартапа працавалі над каталогам кампаній TAM.BY. Аказалася, што інфармацыя аб прадпрыемствах у інтэрнэце сустракаецца ў дзясятках крыніц, ад праграм і карт да сацыяльных сетак. Гэтыя дадзеныя старэюць, з'яўляюцца памылкі — няправільныя тэлефоны і адрасы, якія могуць заблытаць патэнцыйных кліентаў. І ўсім гэтым трэба кіраваць, каб кантраляваць сваю прысутнасць у інтэрнэце. Такую паслугу і прапаноўвае Rocketdata — уся online-прысутнасць бізнесу будзе сістэматызавацца адным сэрвісам, які будзе яшчэ і адсочваць усе водгукі. Кампанія атрымае інтэрфейс, дзе зможа бачыць усе згадванні пра сябе, раскіданыя па прасторах інтэрнэту. Дар'я Данілава расказвае, што на стварэнне праекта яе падштурхнула знаёмства са стартап экасістэмай Ізраіля.

— Год назад падчас стартап-тура ў Ізраіль, я заўважыла, што гэтая краіна вельмі падобная да Беларусі — адносна невялікая, з добрымі кадрамі, адукацыяй і з маленькім рынкам. У Ізраілі бізнес у пэўны момант зразумеў, што трэба арыентавацца на глабальны рынак, што трэба рабіць вялікія маштабуемыя гісторыі, якія можна развіваць па ўсім свеце. І нам захацелася выйсці за межы беларускага рынку. Цяпер ні ў Беларусі, ні ў СНД, ні нават у Азіі такіх сэрвісаў, як Rocketdata, няма, таму мы ўбачылі перспектыўную нішу на рынку. Прадукт мы запусцілі ўсяго два месяцы назад, а ў красавіку плануем ужо выйсці на аперацыйную акупнасць. У нас гатовая бізнес-мадэль, а не мроі аб тым, што прыйдзе аднойчы Санта-Клаус і купіць нас. Я думаю, што для беларускага IT цяпер больш перспектыўна развіваць прадуктовую мадэль, таму што гэта ўжо не перапродаж працоўнай сілы, а стварэнне новых унікальных прадуктаў, кошт якіх на сусветным рынку можа кратна перавышаць укладзеныя інвестыцыі.



АЛЯКСАНДР КУШНЕР

# ЧАС, КАЛІ МЯНЯЮЦЬ КАРТУ НА СМАРТФОН

**Пераход ад наяўных грошай да электроннай формы аплаты — сусветная тэндэнцыя. Да пачатку гэтага года на тэрыторыі нашай краіны колькасць выпушчаных у абарачэнне картак дасягнула рэкордных 13,9 мільёна адзінак. Расце і колькасць аперацый у інтэрнэце. Многія ўжо апрабавалі сэрвісы, якія даюць магчымасць расплачвацца пры дапамозе мабільных устройстваў. Вось толькі ці навучыліся мы распараджацца шырокімі магчымасцямі бескантактнай аплаты без шкоды для асабістага бюджэту? Ці ўсе гатовыя да рэвалюцыйных пераўтварэнняў у плацежнай сферы?**

Нацбанк гаворыць, што тут за 20 гадоў наша краіна прайшла шлях па ўкараненні інавацый, якія іншыя дзяржавы праходзілі за 80. Вынік відавочны: доля безнаяўных аперацый з карткамі ў агульным аб'ёме за 2017 год дасягнула 83,1 працэнта па колькасці і 44,7 працэнта па суме аперацый. Для параўнання: па выніках 2016-га гэта было 79,8 працэнта і 38,6 працэнта адпаведна. Але прагрэс не стаіць на месцы, укараняюцца новыя плацежныя паслугі і прадукты. Да прыкладу, нядаўна ў Беларусі было аб'яўлена аб запуску плацежнага сэрвісу Samsung Pay. Пасля дабаўлення праграмы на сумяшчальны смартфон пры аплаце пакупак на любым плацежным тэрмінале ўжо не патрабуецца ўводзіць ПІН-код карты — трэба проста паднесці гаджэт. За мяжой ідуць яшчэ далей: у ЗША запушчаны пілотны праект па стварэнні біяметрычнай бескантактнай карты — замест ПІН-кода паролем служыць біяметрычны адбітак пальца.

— Беларускія спажыўцы ахвотна адгукаюцца на інавацыі, таму запуск на тэрыторыі краіны сістэмы плацяжоў




пры дапамозе смартфона — заканамернае рашэнне, — пераканаваны рэгіянальны менеджар Visa ў Беларусі, Азербайджане і Малдове Ігар Кавалёў. — У бліжэйшай перспектыве я чакаю далейшага росту электроннай камерцыі. Асяроддзе мяняецца: калі раней спажыўцы маглі здзяйсняць аперацыі ў інтэрнэце толькі з дапамогай персанальных камп'ютараў, то сёння на ўсю моц выкарыстоўваюцца смартфоны, планшэты, іншыя мабільныя ўстройствы. Смартфон змяніў паводзіны спажыўца, а яны, як вядома, стымулююць развіццё новых тэхналогій.

Сапраўды, лагічна, калі ўсюдыісны смартфон выконвае яшчэ і плацежную функцыю. Варыянтаў мноства — ад кантакту гаджэта з тэрмінальным устройствам да сканавання QR-кодаў або націску кнопкі ўнутры якой-небудзь праграмы. Ігар Кавалёў лічыць, што канцэпцыя "інтэрнэту рэчаў", якая з'явілася ў 1990-х, ужо ўвайшла ў наша жыццё:

— Што такое "інтэрнэт рэчаў"? Гэта наданне рэчам або прадметам магчымасці камунікаваць паміж сабою і са знешнім асяроддзем, у выніку чаго чалавек выключаецца з шэрага працэсаў. Ён, напрыклад, ужо можа не думаць аб правядзенні плацяжу.

Тэхнічна прасунуты спажывец ад падобных навінак, зразумела, у захапленні. Калі, вядома, мае сродкі на рахунку і ўмее кантраляваць свае траты. У адваротным выпадку бескантактныя плацяжы толькі на шкоду. А ўжо хто дакладна выйграе ад "інтэрнэту рэчаў", дык гэта банкі і вытворцы гаджэтаў. Намеснік старшыні праўлення Банка ВТБ (Беларусь) Дзмітрый Фралоў не скрывае: інавацыі ўкараняюцца за кошт буйных брэндаў, банкі і спажыўцы выступаюць як канчатковае звяно гэтага ланцуга. Дарэчы, недалёка тая гадзіна, калі на рынку з'явяцца карты без фізічнага носьбіта — затраты банкаў на іх выпуск несувымерна меншыя, чым пры выпуску пластыку і папяровых канвертаў з ПІН-кодамі.

Паводле слоў кіраўніка Samsung у Беларусі Аляксея Голуба, летась продажы смартфонаў выраслі на 20 працэнтаў:

— У краіне звыш 5 мільёнаў карыстальнікаў мабільных устройстваў, у той час як насельніцтва краіны — амаль 9,5 мільёна. І толькі 60 працэнтаў мабільных тэлефонаў — гэта смартфоны. Астатнія 40 працэнтаў карыстальнікаў — вось тая аўдыторыя, якая будзе купляць сабе смартфоны ў бліжэйшай будучыні. Захаванню дадатнай дынамікі продажаў спрыяе паніжэнне ўзроставага парога карыстальнікаў прасунутых гаджэтаў: калі раней такія ўстройствы набывалі для 13-15 гадовых, то цяпер сучасная тэхніка ёсць у многіх першакласнікаў.

На ўкараненне новых тэхнічных рашэнняў адгукаюцца ў першую чаргу моладзь і людзі сярэдняга ўзросту. Ці не таму даследаванне, якое правяло ў Беларусі агенцтва GfK Ukraine ў пачатку гэтага года па заказе Visa, ахапіла некалькі сотняў жыхароў краіны толькі ва ўзросце 25-55 гадоў, якія пражываюць у гарадах з насельніцтвам ад 100 тысяч чалавек і карыстаюцца інтэрнэтам. Вынікі паказальныя: плацежнымі дэбетавымі карткамі карыстаюцца 82 працэнты рэспандэнтаў, крэдытнымі — 31 працэнт, досвед аплаты праз інтэрнэт мае больш як палова апытаных. Спажыўцы выкарыстоўваюць некалькі ПІН-кодаў і пароляў да сваіх рахункаў і ўжо яўна не супраць скарыстацца біяметрычнай аўтэнтыфікацыяй асобы (сканаванне сятчаткі вока, распазнаванне адбіткаў пальцаў, ідэнтыфікацыя па малюнку вен і гэтак далей) як больш бяспечнай.

Аляксандр **Несцераў**

# ЗНАЙСЦІ СЯБЕ Ў IT

## ЦІ ЗМОЖА БЕЛАРУСЬ СТАЦЬ ДРУГІМ СІНГАПУРАМ?




ПАВЕЛ ЧУЙКО

**Летась, паводле дадзеных Bloomberg, IT-сектар стаў самай выгаднай галіной эканомікі: 57 чалавек, якія зарабілі ў гэтай сферы звыш 1 мільярда долараў, павялічылі свой капітал на трэць. Сёння гэтая сфера прыцягвае не толькі асобных бізнесменаў: будаўніцтва лічбавай эканомікі ў многіх краінах становіцца задачай дзяржаўнай важнасці. У гэтым напрамку рухаемся і мы. З красавіка ўступіў у сілу Дэкрэт № 8 "Аб развіцці лічбавай эканомікі" — унікальны дакумент, дзякуючы якому Беларусь можа стаць адной з лепшых у свеце пляцовак для развіцця высокатэхналагічнага бізнесу.**

Старонка ў сацсетках нямецкага праграміста Лукаса Кюна стракаціць рэпостамі навін з Беларусі. Яшчэ паўгода назад наша краіна была для яго terra incognita, а цяпер ён можа назваць з дзясятак буйных беларускіх гарадоў і прадпрыемстваў. І плануе прыезд у Мінск: хоча трапіць на экскурсію ў Парк высокіх тэхналогій, а ў перспектыве — запусціць свой блакчэйн-стартап:

— У хуткім часе ваша краіна можа стаць самай лепшай у свеце юрысдыкцыяй для стварэння такіх праектаў і не толькі. Мяне гэта вельмі натхняе. Плюс чыста на бытавым узроўні гэта выдатнае месца для пераезду.

Стварыць камфортныя ўмовы для IT-бізнесу сёння імкнуцца многія краіны. Нядзіўна: паводле дадзеных аналітыкаў Gartner глабальны рынак IT перавышае 3,5 трыльёна долараў, і гэтая лічба будзе расці. Упускаць грашовыя рэкі не хоча ніхто.

Да прыкладу, Кіпр, вядомы ўсім як афшор, даўно сышоў з крывой дарожкі. Цяпер краіна прэтэндуе на званне IT-раю: тут ужо шэсць гадоў дзейнічае спецыяльны рэжым IP Box, які стварае спрыяльны клімат для інтэлектуальных інвестыцый. Не стаіць убаку Польшча, дзе як грыбы пасля дажджу растуць тэхнапаркі, бізнес-інкубатары і акселератары. Фінансаванне яны атрымліваюць ад дзяржавы і ўніверсітэтаў.

Тыя, хто пачынаў раней, сёння служаць прыкладам. Сінгапур — горад-дзяржава плошчай усяго каля 720 квадратных кіламетраў. Штогод тут ствараюць прыкладна 2,5 тысячы высокатэхналагічных стартапаў, прыцягваючы больш за 1 мільярд долараў інвестыцый. Рэалізуецца праграма "Разумная нацыя": краіна становіцца пляцоўкай для тэставання новых тэхналогій.

Яшчэ адзін прыклад — Ізраіль. Дзяржава, блізкая да нас па тэрыторыі і колькасці насельніцтва, экспартуе IT-паслугі прыкладна на 40 мільярдаў долараў. Для параўнання: наш Парк высокіх тэхналогій толькі па выніках мінулага года ўпершыню перасягнуў парог у 1 мільярд

долараў. Разрыў, на першы погляд, непераадольны. Ці ўдасца паўтарыць поспех IT-дзяржаў? Ігар Мамоненка, генеральны дырэктар групы кампаній “БелХард”, лічыць, што мы знаходзімся на цікавым этапе:

— Параўнальна з Індыяй, якая ў свой час была найбуйнейшай сэрвіснай краінай, што распрацоўвала шмат софту на заказ. У працэсе тут сталі ўзнікаць уласныя ідэі і прадуктовыя IT-фірмы, якія сталі займаць сваю нішу на сусветным рынку. Мы цяпер таксама дабаўляем да сэрвіснай мадэлі прадуктовую. І патэнцыял у нас у гэтым плане вялікі. Гэта не афішыруецца, але ў Сіліконавай даліне шмат беларусаў, якія рэалізуюць там свае задумкі. Нам трэба стаць тэставай пляцоўкай, дзе будзе выпрабоўвацца маса не толькі нашых, але і сусветных стартапаў. І мы да гэтага ідзём.

**Усевалад Янчэўскі, дырэктар Парка высокіх тэхналогій:**

***— Сярод кампаній, якія ўступілі ў Парк нядаўна, вельмі шмат перспектыўных стартапаў і паспяховых кампаній. Тых, якія працуюць у сферы развіцця тэхналогій штучнага інтэлекту і машыннага навучання. Мы цяпер бачым, што і ў нашай краіны, і ў Парка высокіх тэхналогій ёсць усе шанцы стаць адным з такіх сур’ёзных еўрапейскіх цэнтраў у гэтай сферы.***

Некалькі тыдняў назад наш ПВТ прыняў рашэнне аб рэгістрацыі ў якасці рэзідэнтаў 46 новых кампаній. За ўсю гісторыю Парка такога істотнага аднамаментнага скачка яшчэ не было. Прычым адбыўся і якасны рост: у Беларусь прыйшлі кампаніі, занятыя ў распрацоўцы ПЗ у сферы штучнага інтэлекту і дапоўненай рэальнасці, вялікіх дадзеных, інтэрнэту рэчаў, дакладнага земляробства. Больш як палова гэтых новых фірмаў была створана з удзелам замежных інвестыцый. І гэта толькі пачатак, пераканаены Ігар Мамоненка:

— Калі першапачаткова гучала ідэя стварэння IT-краіны, планавалася, што ў гэтую сферу прыйдуць сотні тысяч чалавек. Цяпер гаворка ідзе ўжо пра мільёны. У традыцыйных галінах эканомікі становіцца ўсё складаней вытрымліваць канкурэнцыю. Развіццё сферы інфармацыйных тэхналогій дае шанц забяспечыць занятасць тых людзей, якія будуць вызваляцца з класічных сектараў, перанакіроўваючы іх у гэты сектар.

Зрэшты, тут ёсць свае нюансы. З аднаго боку, паводле ацэнак кампаніі McKinsey & Co, пры захаванні цяперашніх тэмпаў рабатызацыі і аўтаматызацыі да 2030 года больш як 375 мільёнаў чалавек у свеце застануцца без работы — іх заменяць машыны. Гаворка ідзе ў першую чаргу пра тых, хто заняты фізічнай працай або чыя работа звязана з выкананнем тыпавых задач — гэта касіры, аператары кол-цэнтраў, радавыя бухгалтары. З другога — якой бы ні была блізкай лічбавая будучыня, відавочна, што пакуль тэхналогіі не могуць поўнасцю замяніць настаўнікаў, урачоў, інжынераў, гаворыць эканаміст Антон Боўтачка:

— Ці не атрымаецца так, што IT-сектар перацягне на свой бок добрых спецыялістаў, сканцэнтруе частку капіталу, не даючы развівацца іншым галінам, якія таксама маюць патрэбу ў рэсурсах? Мы не павінны арыентавацца на тое, каб урачы, інжынеры, настаўнікі перавучваліся на праграмістаў.

Віктар Пракапеня, выканаўчы дырэктар VP Capital, прыводзіць такія лічбы: адно рабочае месца IT-спецыяліста стварае 3-4 рабочыя месцы ў іншых сферах, не звязаных з інфармацыйнымі тэхналогіямі. У сваю чаргу, рэзідэнтамі ПВТ могуць стаць і кампаніі з абласных гарадоў і практычна з любога пункта краіны.



— Дэкрэт — не “чароўная таблетка” ад усіх праблем, існуючых у эканоміцы, — тлумачыць эксперт. — Цікава, што ў сувязі з яго прыняццем мы будзем назіраць адразу некалькі працэсаў.

З аднаго боку, рост IT-галіны, з другога — пранікненне тэхналогій у іншыя сферы эканомікі, пачынаючы з прамысловасці, гандлю і заканчваючы медыцынай, адукацыяй.

У сучасных фермерскіх гаспадарках паліў, угнаенне і многія іншыя працэсы ўжо выконваюцца аўтаматычна. Рашэнне аб выдачы крэдыту, найманні на працу, інвестыцыях на біржы — задача штучнага інтэлекту.

Віктар Пракапеня ўпэўнены: укараненне тэхналогій у традыцыйныя сектары эканомікі — залог іх канкурэнтаздольнасці на рэгіянальных і сусветных рынках. І важна, каб дзяржава заахвочвала гэты працэс:

— Колькі кампаній у Беларусі цяпер выкарыстоўваюць Big Data ў сваім бізнесе? На колькіх укаранёныя IT-сістэмы кіравання бізнес-працэсамі? Нам яшчэ многае трэба зрабіць у гэтым напрамку. І наяўнасць у краіне моцнага IT-сектара гэтаму працэсу толькі дапаможа.

З уступленнем у сілу Дэкрэта № 8 работа па будаўніцтве IT-краіны не заканчваецца. Наадварот: нядаўна ў нас быў створаны Савет па развіцці лічбавай эканомікі, у перспектыве не выключана і з’яўленне профільнага міністэрства. Гэта важныя і патрэбныя крокі. Высокія тэхналогіі мяняюць свет — факт бясспрэчны. Але базавы прынцып у любым выпадку застаецца ранейшым: хто больш хуткі — той і ў выйгрышы.

Валерыя **Гаўрушава**

# "ВЕТЛАНДС" — НА КАРЫСЦЬ ЭКАЛОГІІ

**Пяцігадовы праект ПРААН з бюджэтам амаль у пяць мільёнаў долараў дапаможа Беларусі не толькі зрабіць кіраванне ляснымі і балотнымі экасістэмамі больш устойлівым у фінансавых адносінах, але і больш эфектыўным для захавання раслiннага і жывёльнага свету**

Праект "Ветландс" фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. Фактычна ён распачаў сваю дзейнасць у пачатку гэтага года. У рамках праекта будзе ўдасканалена прыродаахоўнае заканадаўства. Акрамя таго, "Ветландс" дасць магчымасць прадухіліць дэградацыю неэфектыўна асушаных тарфянікаў. Як мяркуецца, вынікі такой экалагічнай рэабілітацыі ў хуткім часе будуць відаць на плошчы звыш дзесяці тысяч гектараў.

Уласна кажучы, пяцігадовы праект "Устойлівае кіраванне ляснымі і водна-балотнымі экасістэмамі для дасягнення шматмэтавых пераваг" ("Ветландс") будзе звязаны з выкананнем шэрага дзяржпраграм, у тым ліку накіраваных на захаванне месцапражывання рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Ужо вядома, што праект будзе рэалізоўвацца на некалькіх асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, у ліку якіх — рэспубліканскія заказнікі "Сярэдняя Прыпяць", "Налібоцкі", "Спораўскі" і "Званец", "Жада", "Сервеч". Ён аб'яднае вакол сябе як дзяржаўныя, так і прыватныя структуры, прадстаўнікоў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, мясцовыя ініцыятывы.

## Лакальны праект з глабальным факусіраваннем

Адавочна, што "Ветландс" адпавядае як глабальным, так і нацыянальным экалагічным выклікам і будзе адпавядаць патрабаванням дзяржаўнай палітыкі ў галіне кіравання прыроднымі рэсурсамі. Нездарма ў фокусе праекта тры ключавыя напрамкі: удасканаленне прыродаахоўнага заканадаўства, устойлівае кіраванне ляснымі і водна-балотнымі экасістэмамі і стварэнне ўмоў для захавання такіх глабальна знікаючых відаў, як еўрапейскі зубр, вяртлявая чараціянка, вялікі падворлік ды іншыя.

**Мікалай Свідзінскі, начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі:**

— Выпрацоўка ўстойлівага выкарыстання рэсурсаў вельмі важная для балансу экалагічных і эканамічных інтарэсаў. Праект "Ветландс" будзе накіраваны на да-



сягненне шматмэтавых выгод — ад павелічэння папуляцыі знікаючых відаў да развіцця экалагічнага турызму. Акрамя таго, праект будзе звязаны з праграмай “Беларускі лес”. Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што ў яго мерапрыемствах прымуць удзел каля сарака лясгасаў. Падчас праекта будуць выяўлены асабліва каштоўныя ўчасткі лесу на тэрыторыях лясгасаў, якія ў далейшым будуць узятыя пад ахову.

**Ігар Чульба, каардынатар праектаў ПРААН у Беларусі:**

— Наш новы праект будзе засноўвацца на тых выніках, якія былі дасягнуты папярэднімі ініцыятывамі, рэалізаванымі ПРААН у Беларусі, і закране тыя праблемныя аспекты, якія не асвятляліся раней. Унікальнасць фінансуемага Глабальным экалагічным фондам праекта “Ветландс” заключаецца ў яго шматфокуснасці. Ён адначасова накіраваны на барацьбу са змяненнем клімату, дэградацыяй земляў і на захаванне ўстойлівай біяразнастайнасці. Асаблівы акцэнт будзе зроблены на атрыманне экалагічных выгод і эканамічнага складніка, які забяспечвае ўстойлівасць.

**Аляксей Арцюшэўскі, кіраўнік праекта “Ветландс”:**

— Асноўнай практычнай мэтай праекта стане выпрацоўка метадалогіі ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў і яе апрабацыя ў справе. З тым, каб у далейшым прадаставіць Ураду Рэспублікі Беларусь практычныя вынікі па выкарыстанні гэтых падыходаў. Акрамя таго, “Ветландс” будзе рэалізоўвацца паралельна з фінансуемым Еўрапейскім саюзам трансгранічным праектам “Life”, накіраваным на павышэнне ўстойлівасці вяртлявай чарацянкі, што забяспечыць сінергію прыродаахоўных актыўнасцяў у міжнародным маштабе.

## Чырванакніжны сімвал Беларусі альбо пра тое, як аздаравяць і зробяць устойлівай папуляцыю ў Налібоцкай пушчы

Нельга абмінуць той факт, што асаблівая ўвага праекта будзе ўдзелена паляпшэнню ўмоў пражывання мікрапапуляцыі еўрапейскага зубра ў заказніку “Налібоцкі” шляхам аднаўлення кармавых угоддзяў на тэрыторыі большай за трыста гектараў. Будзе, у прыватнасці, распрацавана і рэалізавана праграма па абмене асобінамі паміж мікрапапуля-

стар. 32

стар. 31 цыямі еўрапейскага зубра для паляпшэння генетычнага статусу налібоцкай мікрапапуляцыі.

**Васіль Шакун, загадчык лабараторыі папуляцыйнай экалогіі наземных пазваночных і кіравання біярэсурсамі:**

— Існуюць пагрозы, якія ў доўгатэрміновай перспектыве могуць прывесці да знікнення віду. Гаворка ідзе пра захаванне колькасці, аздараўленне існуючых папуляцый на генетычным узроўні. Праграма мерапрыемстваў у рамках праекта “Ветландс” прадугледжвае два напрамкі: паляпшэнне і падтрыманне высокапрадукцыйных натуральных кармавых умоў і прывязка зуброў да тэрыторый з круглагоднай забяспечанасцю зялёнымі кармамі, а таксама ацэнка генетычнага патэнцыялу і па магчымасці генетычнае аздараўленне.

**Аляксандр Казулін, загадчык сектара навукова-вытворчага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах, навуковы каардынатар праекта “Ветландс”:**

— Сёння ў Налібоцкай пушчы для паўнацэннага пражывання зуброў прыдатна крыху больш за




сто гектараў. Пасля рэалізацыі мерапрыемстваў праекта іх павінна стаць больш за трыста. Трэба вяртацца да зыходнага стану: падсяваць травы, выдаляць хмызнякі, ставіць стагі. Будзе закуплена ўся патрэбная для заказніка тэхніка, якая дасць магчымасць падтрымліваць неабходны для зуброў стан угоддзяў і пасля завяршэння праекта.

Беларусь унесла важкі ўклад у адраджэнне, павелічэнне колькасці і вывучэнне зубра. У лютым 2017 года колькасць зуброў у краіне складала 1615 асобін ці 24,6 працэнта адносна агульнай сусветнай колькасці, з іх 1557 зуброў жывуць на волі, а гэта 34,8 працэнта адносна вольна жывучых зуброў у свеце.

Так, у 2005 годзе Беларусь выйшла на другое месца ў свеце – пасля Польшчы – па колькасці зуброў, а з 2011 года стала лідарам па колькасці жывёл, якія жывуць на волі. У краіне распрацавана і рэалізуецца метапапуляцыйная стратэгія захавання еўрапейскага зубра, дзякуючы якой створана дзесяць вольна жывучых мікрапапуляцый. У цэлым гэта дазволіла зняць пагрозу знікнення віду на нацыянальным і сусветным узроўні. Але пакуль не забяспечвае даўга-



ВІТАЛІЙ ПІВАВАРЧЫК



часнага яго пражывання. Справа ў тым, што ў кантэксце захавання еўрапейскага зубра як віду ў доўгатэрміновай перспектыве яшчэ працягваюць заставацца праблемы. Асноўнымі з іх з'яўляюцца колькасць, тэрыторыя, генетыка і аздараўленне папуляцый. Гэтымі пытаннямі ўшчыльную і займецца праект "Ветландс".

У рамках праекта будуць распрацаваны і апрабаваны інавацыйныя меры, накіраваныя на ўстараненне найбольш значных праблем і пагроз для відаў, якія знаходзяцца пад пагрозай глабальнага знікнення. Будуць аднoўлены парушаныя месцапражыванні глабальна пагражальных відаў — вяртлявай чарацянкі, вялікага падворліка, дупеля, вялікага вераценіка — у найбольш значных, асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях. Мерапрыемствы па кіраванні папуляцыямі вяртлявай чарацянкі будуць рэалізаваны ў сінергіі з аналагічнымі ініцыятывамі, фінансуемымі праграмай ЕС "Лайф" у Літве, Германіі, Польшчы.

Дарэчы, што датычыцца лясных і балоцістых экасістэм, то ў адпаведнасці з праектам развіццё экалагічнага турызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях павысіць іх фінансавую ўстойлівасць. Акрамя таго, праект забяспечыць устойлівае кіраванне рэдкімі біятопамі, падлеглымі спецыяльнай ахове. А гэта плошча ні многа ні мала ў 150 000 гектараў.

А дэградацыя неэфектыўна асушаных тарфянікаў будзе прадухілена ў выніку распрацоўкі і рэалізацыі схемы іх устойлівага выкарыстання на землях ляснога фонду (260 000 гектараў) з вызначэннем канкрэтных напрамкаў прымянення кожнага такога тарфяніку.

Уладзімір **Міхайлаў**

# БАТАРЭІ ПРОСЯЦЬ ГРАФІТУ

## Літыевую залежнасць можна пераадолець, лічаць беларускія навукоўцы



У апошнія гады мусіруюцца чуткі, што эпоха энерганосьбітаў на аснове вуглевадародных матэрыялаў падыходзіць да свайго лагічнага завяршэння. Нетры Зямлі спусташаюцца, нафта заканчваецца. Самыя смелыя нават даюць прагнозы — пры цяперашніх аб’ёмах здабычы і дынаміцы спажывання выкапнёвага паліва нам ледзь хопіць на сотню гадоў. Што ж, на змену рухавіку ўнутранага згарання сямімільнымі крокамі ўжо спяшаецца электрычны. Праўда, тэхнічны прагрэс упіраецца ў дэфіцыт матэрыялу для вытворчасці галоўных кампанентаў новага транспарту — акумулятарных батарэй. Гаворка ідзе пра літый. Аналітыкі паспяшаліся ахрысціць гэты рэдкі шчолачны метал новай нафтай і бачаць у ім нядрэнную нішу для інвестыцый. У той жа час усё чалавецтва слушна асцерагаецца аказацца “на іголцы” манапалістаў — здабытчыкаў матэрыялу і шукае яму альтэрнатывы.

Генеральны дырэктар Аб’яднанага інстытута машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Паддубка выказвае сваё меркаванне: “Мы выдатна разумеем, што электратранспарт ужо не фантастыка. Больш за тое, менавіта за ім будучыня сусветнага аўтапрама”. Гэта не пустыя словы. Нядаўна нашы навукоўцы прэзентавалі электрамабіль на базе серыйнага аўтамабіля Geely SC7 беларускай жа зборкі. Як праходзіў працэс стварэння айчыннага ўзору “будучыні”? Набылі Geely, якая была ва ўжытку. Выкінулі з яе ўсе звязаныя з маторам сістэмы. Перавялі на электрычнасць рулявое кіраванне, тармазную і дапаможныя сістэмы. А вось саму батарэю запазычылі ў замежных партнёраў. Нядзіўна. Бо каменя, а дакладней металу спатыкнення, у нас няма.

У перспектыве маячыць жорсткая залежнасць ад сусветных здабываючых кампаній.

А вось генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра па матэрыялазнаўстве Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нацыянальнай акадэміі навук Валерый Федасюк схільны глядзець у будучыню з вялікім аптымізмам. І ў той жа час ён не такі катэгарычны наконт незаменнасці літыю:

[redacted]

[redacted]

— Колькасць гэтага металу абмежаваная. Рана ці позна (а пры падобным развіцці тэхналогій хутчэй рана) яго запасы скончацца. Акрамя таго, ужо сёння адчуваецца манаполія на яго здабычу. Асноўныя запасы літыю засяроджаны ў Кітаі. Там, бачачы попыт, які бурна павышаецца, за апошнія гады паднялі яго кошт у дзясяткі разоў, і гэта зусім не мяжа. Значыць, чалавецтва вымушана шукаць альтэрнатыўныя варыянты. Мы не стаім убаку ад гэтай глабальнай мэты.

Гаворка ідзе пра беларускае ноу-хау, якое прызналі не толькі ў краінах ЕС, але і ў тым жа Кітаі. Навукоўцы распрацавалі новы графенападобны матэрыял, які вельмі хутка, проста і вельмі танна выпрацоўваецца са звычайнага графіту. На аснове новага матэрыялу ўжо сканструяваны доследныя ўзоры суперкандэнсатараў новага пакалення.

Чым добрыя літыевыя батарэі?

***Беларускае ноу-хау прызналі не толькі ў краінах ЕС, але і ў Кітаі. Навукоўцы распрацавалі новы графенападобны матэрыял, які вельмі хутка, проста і вельмі танна выпрацоўваецца са звычайнага графіту***

...ліку і спосабы “злезці з літыевай іголкі”. Тым больш што распрацаваныя раней літыевыя батарэі — далёка не ідэал.

— Самы вялікі плюс Li-Ion у тым, што яны маюць вялікую ёмістасць. Аднак іх вялікі недахоп у абмежаванай колькасці цыклаў зарадкі-разрадкі — каля 1 тысячы, — гаворыць Валерый Федасюк. — З часам адбываецца крышталізацыя, замыкаюцца слаі. Пасля гэтага батарэю можна адпраўляць на памыйніцу. Нашы суперкандэнсатары з гэтага пункту гледжання практычна вечныя, падлік цыклаў ідзе на мільёны. Гранічна ясна адно: калі проста паўтараць тое, што ўжо прыдумалі ў свеце, мы заўсёды будзем толькі даганяць. Рэаліі сёння такія, што адступаць няма куды: трэба рабіць прадукт настолькі інавацыйны, каб ён апярэджваў свой час. У рэшце рэшт, гэта справа энергетычнай бяспекі краіны.

Сяргей **Мураўскі**



НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

У літыю паказчык назапашваемай удзельнай магутнасці — 200 ват-гадзін на кілаграм сухога рэчыва. Суперкандэнсатары папярэдніх пакаленняў, якія ствараюцца на аснове здробленага графіту, былі куды больш “сціплыя” — усяго каля 3 ват-гадзін на кілаграм. У нас жа на аснове графенападобнага матэрыялу атрыманы ўзоры, у якіх назапашваемая ўдзельная магутнасць ужо дасягае 20 ват-гадзін. Здавалася б, не багата. Але з улікам у прамым сэнсе слова капеечнай рыначнай вартасці і паўсюднай распаўсюджанасці сыравіны — графіту — аўчынка можа быць вартая вырабу. Тым больш што гэта не мяжа.

Розніца паміж кандэнсатарам і акумулятарам прынцыповая. Першы прызначаны хутка назапашваць і гэтак жа хутка аддаваць энергію, прынцып яго дзеяння заснаваны на дэфармацыі двайнога электрычнага слоя. Гэта фізіка. У “доўгайграючай” жа батарэі адбываецца хімічная рэакцыя. Працягваючы даследаванні, вучоныя Навукова-практычнага цэнтра па матэрыялазнаўстве высветлілі, што ў прадукцыі з нашага новага графенападобнага матэрыялу адбываецца не толькі фізічная “работа”, але, да ўсяго іншага, магчымая і хімічная. Гэтае адкрыццё дазволіла стварыць узоры чагосьці сярэдняга паміж кандэнсатарам і АКБ з назапашанай удзельнай магутнасцю ўжо 60-70 ват-гадзін на кілаграм. Так, гэта менш, чым у класічных літыевых батарэй, але ўжо ў некалькі разоў больш, чым, напрыклад, у свінцовых аналагаў.

Усё чалавецтва шукае альтэрнатывы сталым тэхналогіям. У тым...

## ЗАРАДКА ДЛЯ РУЛЯ

**Распрацоўкай суперкандэнсатараў — звыш’ёмістых назапашвальнікаў электраэнергіі з магчымасцю хуткай зарадкі — займаюцца не толькі ў Акадэміі навук. Сёлета вытворчасць батарэй новага фармату плануецца наладзіць і ў Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку “Вялікі камень”. Чакаецца, што прадукцыя будзе запатрабавана ў першую чаргу на прадпрыемстве “Белкамунмаш” пры будаўніцтве трамваяў, электробусаў і тралейбусаў.**




БЕЛТА

# АТАМНАЯ СТАНЦЫЯ Ў АСТРАЎЦЫ:
# У ЛЮСТЭРКУ СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Беларуская АЭС — адзін з найбуйнейшых энергетычных праектаў у Еўропе. Першы камень заклалі сем гадоў назад у Гродзенскай вобласці. Якімі тэмпамі ідзе будоўля, ці вытрымае рэактар удар цунамі і адкуль бяруцца будучыя атамшчыкі, расказаў галоўны інжынер Анатоль Бондар.**

## Шматступеньчатая абарона

*— Да запуску першага энергаблока засталося менш як два гады. Можна сказаць, што будаўніцтва ўжо на фінішнай прамой? Укладваецеся ў тэрміны?*

— Работы ідуць поўным ходам! Пяць тысяч чалавек пастаянна працуюць на аб'екце. Сорак розных кампаній удзельнічаюць у праекце. Дарэчы, ледзь не палова — васямнаццаць з іх — расійскія. Саму будоўлю амаль скончылі. На дзевяноста працэнтаў бетон ужо залілі. Корпус рэактара зманціравалі яшчэ

1 красавіка мінулага года. Да восені ўстанавілі цыркуляцыйны трубаправод, які звязвае абсталяванне ўсяго контуру першага энергаблока. Па ім ад сэрца станцыі будзе адводзіцца цяпло. Корпус рэактара другога энергаблока змантаравалі два месяцы назад. Цяпер уладкоўваем — устанаўліваем кандэнсатары і ахоўную абалонку купала.

***— Давайце якраз пра бяспеку пагаворым. Беларусь лепш за іншых ведае, якія наступствы могуць быць, калі нешта пойдзе не так.***

— Вядома! Таму бяспецы ўдзяляем двайную ўвагу. Праект Беларускай АЭС — гэта станцыя новага пакалення “3+”. Што гэта значыць? А тое, што тут закладзена разнастайнасць і раздзяленне сістэм бяспекі. Шматступеньчатая ўнутраная і знешняя абарона. Калі не спрацоўвае адзін бар’ер, на дапамогу прыходзіць другі. Яны не дазволяць радыеактыўным рэчывам выляцець у навакольнае асяроддзе. Галоўнае адрозненне ад праектаў-аналагаў і, вядома, ад больш старых станцый — гэта сістэмы пасіўнага дзеяння. Яны для таго, каб не дапусціць саму магчымасць цяжкіх аварыйных сітуацый — адводзяць цяпло ад парагенератараў і ахоўнай абалонкі, беспалымяна спальваюць вадарод, ёсць і “пастка расплаву”.

***— Гэта ўсё датычыцца хутчэй магчымых паломак унутры станцыі. А як наконт пагрозы звонку? Раптам ураган ці, не дай бог, самалёт упадзе?***

— Ад знешніх удараў выратуе двайная ахоўная гермаабалонка. Яна так распрацавана, што вытрымае нават нехарактэрныя для Астравецкага раёна стыхіі. Напрыклад, землятрус у восем балаў. Выстаяць энергаблокі перад самалётам, знешняй ударнай хваляй, затапленнем і нават смерчам. Надзейнасць станцыі не раз пацвярджалі спецыялісты Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі.

## Тэсты для зняцця стрэсу

***— МАГАТЭ свае выпрабаванні называе стрэс-тэстамі. Вам яны нервы таксама паматалі?***

— Сем гадоў таму Беларусь падпісала дэкларацыю Еўрапейскай групы рэгулятараў ядзернай бяспекі (ENSREG). Тым самым мы абавязаліся праводзіць стрэс-тэсты на станцыі па ўсіх еўрапейскіх стандартах. Летась у нас было дзевяноста праверак — усе прайшлі без нараканняў. Яны праводзіліся сумесна з падольскім вопытна-канструктарскім бюро “Гідрапрэс”, з Курчатаўскім інстытутам, пецярбургскім “Атампраектам” і расійскай інжынірынгавай кампаніяй “Атамбудэкспарт”. Яны не навічкі ў гэтай справе.

***— На што правяраюць у першую чаргу?***

— Мэта ўсіх стрэс-тэстаў — зразумець, ці вытрымае станцыя знешняе ўздзеянне, якое акажацца вышэйшым за закладзеную ў праект норму. Іншымі словамі, экстрэмальную сітуацыю. Напрыклад, летась у Астраўцы разыгралі падзеі аварыі 2011 года на японскай “Фукусіме”.

***— Гэта калі землятрус і цунамі паўплывалі на знешнія і рэзервовыя крыніцы электрычнасці, сістэмы ахаладжэння адключыліся і рэактарная зона расплавілася?***




Пасля заканчэння Белдзяржуніверсітэта Анатоль Бондар працаваў на Чарнобыльскай АЭС, потым на “Балакаваатамэнерга” ў Саратаўскай вобласці. Да прызначэння ў Астравец інжынер узначальваў праекты “Атамбудэкспарту” ў Кітаі і ў Індыі

> ***Праект Беларускай АЭС — гэта станцыя новага пакалення “3+”. Што гэта значыць? А тое, што тут закладзена разнастайнасць і раздзяленне сістэм бяспекі. Шматступеньчатая ўнутраная і знешняя абарона. Калі не спрацоўвае адзін бар’ер, на дапамогу прыходзіць другі***

— Іменна. Вынік жа выпрабаванняў у нас такі: пры любым варыянце развіцця фукусімскага сцэнарыя наша станцыя застанецца ў бяспецы. Нават у выпадку адмовы ўсіх актыўных сістэм бяспекі на дапамогу прыйдуць пасіўныя. Дарэчы, справаздачу па стрэс-тэстах можа паглядзець любы жадаючы. Яна ў адкрытым доступе (на сайце Дзяржатамнагляду. — Рэд.). У сакавіку чакаем чарговых гасцей. Васямнаццаць экспертаў з пятнаццаці краін свету прыедуць у Астравец, каб асабіста ацаніць аб’ект. Справаздача аб паездцы з’явіцца на сайце ENSREG у чэрвені.

***— Цяпер многія гавораць пра “паліва будучыні” — МОКС. Ці будуць яго прымяняць у Беларусі?***

— У нашым праекце выкарыстанне МОКС-паліва пакуль не прадугледжана. Але такая магчымасць не выключаецца, калі будуць для гэтага ўсе неабходныя абгрунтаванні. Тэхнічныя і эканамічныя.

Таццяна **Мысава**

# У БЕЛАРУСКІМ КУВЕЙЦЕ “ЧОРНАЕ ЗОЛАТА” — ... БЕЛАЕ

**Сярод традыцыйных нафтавых краін паміж Арабскімі Эміратамі і Венесуэлай рэдка ўсплываюць згадкі пра Беларусь. А дарэмна. “Чорнае золата” тут здабываюць ужо паўсотні гадоў. А ў 2018 годзе збіраюцца асвоіць унікальную тэхналогію здабычы каштоўнага выкапня з цвёрдых парод.**

## КРЫЛАТЫЯ ПАМПАВАЛКІ

Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці даўно называюць “беларускім Кувейтам”. Першае, што вы ўбачыце, калі трапіце на нафтавае радовішча ў Сінявокай, гэта станкі-пампавалкі, якія здалёк нагадваюць вялізныя малаткі, што нешта ўбіваюць у зямлю. На прафесійнай мове агрэгат называецца “Індывідуальны балансірны механічны прывод штангавай помпы”. Па-простаму пампавалка для нафты. Людзей каля іх няма, спецыялісты



БЕЛТА



назіраюць за працэсам па прыборах.

Пік здабычы ў Беларусі прыпаў на 1975 год, калі з зямлі атрымалі амаль восем мільёнаў тон нафты. Савецкія пяцігодкі спустошылі нетры Палесся. Да мінулых рэкордаў краіна больш не вярталася. Цяпер ужо некалькі гадоў гадавы аб'ём здабычы нафты трымаецца на ўзроўні каля 1,6 мільёна тон. Жыхары Гомельскай вобласці пахваляцца вам, што раней у гэтых краях нафта біла з зямлі фантанам, як у арабскіх краінах. Сёння, каб выціснуць сыравіну, даводзіцца ў спецыяльна адведзеныя свідравіны пад ціскам запампоўваць ваду.

Буравыя ўстаноўкі ў Рэчыцы відаць здалёк. Усе яны практычна навенькія. Пераўзбраенне пачалося сем гадоў таму. Штогод яны свідруюць больш за сто тысяч метраў цвёрдых парод. Рэкорд быў пастаўлены тры гады назад. Бур угрызся ў зямлю на глыбіню сем кіламетраў.

Работы ідуць пры любым надвор'і — у дождж, снег, спякоту, мароз, днём і ноччу, круглы год. Вахта па восем гадзін, потым столькі ж на адпачынак. Жывуць бурыльшчыкі ў бытоўках, у пакоях па двое, а сталавацца ходзяць у суседнюю цяплушку, якую жартам ахрысцілі вагонам-рэстаранам.

## ГРУЗАВІКІ ЗАПРАЎЛЯЛІ ПРАМА СА СВІДРАВІНЫ

У Беларусі здабываюць цяжкую і лёгкую нафту. Першая патрабуе дадатковай ачысткі, бо ў ёй утрымліваюцца непажаданыя прымесі — парафін. Другая складаецца з больш лёгкіх фракцый, з яе можна зрабіць многае пры перапрацоўцы — высокаактанавы бензін, авіяцыйную газу, якасныя маслы. Цэніцца яна больш, але ў свеце яе засталося няшмат.

Беларускія старажылы-буравікі ўспамінаюць, што на Рэчыцкім радовішчы першы час ішла лёгкая нафта амаль белага колеру. Якасць выдатная, можна адразу запраўляць ёю грузавікі, і нічога, працавалі і не ламаліся.

Сёння настае эра цяжкай нафты. Ды і дастаць гэтую сыравіну з-пад зямлі становіцца ўсё цяжэй. Даводзіцца праводзіць цэлыя спецаперацыі. Адна з іх — гідраразрыў пласта. Калі гаварыць зусім прымітыўна — старую свідравіну пад ціскам напаўняюць вадой і ўзрываюць, каб дабрацца да новых слаёў. Многія думаюць, што такімі распрацоўкамі могуць пахваліцца толькі вядучыя замежныя кампаніі. Але на самай справе беларусы аднымі з першых авалодалі гэтай тэхналогіяй. Выйшлі яны з гэтым ноу-хау на замежны нафтасэрвісны рынак яшчэ восем гадоў назад, а першым заказчыкам стала расійскае прадпрыемства "КагалымНафтаПрагрэс", для якога былі выкананыя ўсяго чатыры аперацыі. Цяпер "Беларуснафта" праводзіць больш за дзвесце гідраразрываў у год па ўсім свеце.

Сёлета нафтавікі Сінявокай бяруць новую планку. Упершыню ў гісторыі краіны пачнецца здабыча "чорнага золата" з цвёрдых парод. Паводле самых сціплых падлікаў, запасы раней цяжкадаступнай нафты на Рэчыцкім радовішчы складаюць да сямісот тысяч тон.

Але гэта толькі старыя запасы. Ёсць і свежая кроў зямлі. Летась пры непасрэдным удзеле беларускіх сейсмаразведчыкаў у рэспубліцы адкрылі Усходне-Макانавіцкае і Заходне-Гіраўскае радовішчы.

Паводле папярэдніх падлікаў, у іх можа быць засяроджана ад шасці да васьмі мільёнаў тон вуглевадародаў. Гэта забяспечыць работай беларускіх нафтавікоў яшчэ гадоў на трыццаць.

Дзмітрый **Нератаў**

ГІСТОРЫЯ

## СВІДРУЙЦЕ ТАМ, ДЗЕ ВАДА ГАРЫЦЬ

**Беларуская вёска Чорнае. Невялікая пустка. За ёю — царква і лекавыя крыніцы. Недалёка ад дарогі — валун. На ім памятная дошка заснавальніку беларускай нафтаразведкі Міхаілу Грамыку. Менавіта ён першым загаварыў пра існаванне "чорнага золата" ў Рэчыцкім краі.**

Пачалося ўсё, як у казцы, з цудаў. Неяк падчас паездкі Грамыка звярнуў увагу на незвычайныя назвы вёсак непадалёк ад гарадка Рэчыца — Чорнае, Гарывада. Ды і мясцовыя жыхары расказалі, што вакол іх паселішчаў адбываюцца незвычайныя рэчы. То чорная вязкая жыжка з-пад ног працякае, якой нават колы тут змазваюць, то каля Гарывады балоты загараюцца. Геолаг адразу зрабіў здагадку пра залежы нафты. У сярэдзіне 30-х гадоў, узброіўшыся кіркай і рыдлёўкай, ён разам з беларускім географам Мікалаем Арбузкіным адправіўся ў экспедыцыю ў Рэчыцкі павет. Навукоўцы ўжо намецілі магчымыя тэрыторыі залежаў, але праверыць свае тэорыі Міхаіл Грамыка не паспеў — трапіў пад рэпрэсіі. Рэабілітавалі толькі ў 1957 годзе. Але пасля лагераў да пошукаў падземных кладавых ён ужо не вяртаўся. А праз гады, у шасцідзясятых, яму патэлефанавалі знаёмыя навукоўцы і расказалі, што забіў першы фантан беларускай нафты. Менавіта там, дзе ён і меркаваў.

— Калі б яго не рэпрэсавалі і не саслалі, то нафту ў Беларусі пачалі б здабываць ужо ў трыццатыя гады — на трыццаць гадоў раней, — гавораць у Рэчыцкім краязнаўчым музеі.

# УРАЧЫ НА ПАРОЗЕ ЭРЫ АДКРЫЦЦЯЎ



ПАВЕЛ ЧУЙКО

**Робаты-хірургі, медыцынскія трэнажоры і сімулятары, сучасныя тамографы, партатыўныя і стацыянарныя УГД-сканеры і датчыкі, электракардыёграфы і холтэраўскія сістэмы, а таксама новыя лекі і касмецэўтыка... Пад купалам Мінскага футбольнага манежа дэманстраваліся апошнія дасягненні медыцыны на XXV міжнароднай спецыялізаванай выставе "Ахова здароўя Беларусі". Сваю прадукцыю на буйнейшым аглядзе навінак для ўрачоў і пацыентаў прадставілі 230 удзельнікаў з 17 краін.**

Адкрываючы форум, Міністр аховы здароўя Валерый Малашка адзначыў: бліжэйшая будучыня сістэмы аховы здароўя краіны — гэта яе лічбавая трансфармацыя. Сэрвісы дыстанцыйнага ўзаемадзеяння з урачом, гаджэты для аддаленага маніторынгу жыццёвых паказчыкаў, лічбавыя медкарты пацыентаў і бальнічныя лісткі — усё гэта вось-вось увойдзе ў наша жыццё. Ужо ў наступным годзе мы павінны ўбачыць, як




ПАВЕЛ ЧУЙКО

працуе на практыцы электронная ахова здароўя. Што яшчэ нас чакае?

## Першы айчынны камп'ютарны тамограф

Гэты апарат беларускай вытворчасці Ventum паказалі на выставе супрацоўнікі кампаніі "Адані". Менеджар прадукту Лізавета Дрозд гаворыць, што 64-зрэзавая сістэма дасць магчымасць у тым ліку правесці якасную ангіяграфію — даследаванне крывяносных сасудаў — і вывучыць, як працуе сэрца пацыента. Дзякуючы хуткім і дакладным сканерам урачы могуць разгледзець нават драбнюткія сасуды і праверыць сценкі артэрый на бляшкі. А яшчэ навінка пакажа асаблівасці крывацёку ў тканках мозга, лёгкіх... Праграмнае забеспячэнне тамографа дапамагае праглядаць малюнкі ў 2D, а таксама рабіць 3D- і мультыпланарную рэканструкцыі, гэта значыць ствараць выявы адразу ў трох плоскасцях. Абяцаюць, што ўжо сёлета тамограф з'явіцца ва ўстановах аховы здароўя. Паводле слоў Валерыя Малашкі, цана такога абсталявання на 30-40 працэнтаў ніжэйшая, чым у імпартных аналагаў.

## Штучная скура

Над біямедыцынскім клетачным прадуктам — "штучнай скурай" — спецыялісты Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук працавалі больш за два гады. Ён ужо прайшоў дзяржаўную экспертызу і даклінічныя выпрабаванні і цяпер — на клінічных выпрабаваннях.

— Тканкавы эквівалент скуры, як мы называем нашу распрацоўку, дапамагае фарміравацца сапраўднай скуры. На падкладцы, якая дыхае, мы размясцілі клеткі дэрмы — фібрабласты канкрэтнага пацыента — і кератынацыты, якія дапамагаюць фарміраваць эпідэрміс, — знаёміць з тонкасцямі старшы навуковы супрацоўнік інстытута, кандыдат біялагічных навук Сяргей Пінчук. — І калі раней, напрыклад, пацыенту з апёкамі, каб перасадзіць кавалак уласнай скуры, яго трэба было цалкам узяць з іншага ўчастка цела, то дзякуючы нашай тэхналогіі можна і вырасціць. У лячэнні наступстваў апёкаў гэта, вядома, вельмі дапаможа.

## Кабінет урача агульнай практыкі

Прыборы для вымярэння вочнага ціску і артэрыяльнага, узроўню цукру ў крыві, ацэнкі функцыянальнага стану дыхальнай сістэмы, ЭКГ і даследавання барабаннай перапонкі — вось чым у хуткім часе абсталююць кабінет урача агульнай практыкі. І на месцы, у аднаго доктара можна будзе прайсці ўсе тыя абследаванні, якія раней выконваліся адразу некалькімі вузкімі спецыялістамі. Дацэнт кафедры агульнай урачэбнай практыкі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Наталля Мароз-Валадажская ўпэўнена, што такі падыход дазволіць разгрузіць профільных урачоў, ды і пацыенту ў паліклініцы будзе больш камфортна — справа пойдзе хутчэй.

Вольга **Карнеева**

Год малой радзімы



# ДЗВЕ МЕЛОДЫІ Ў СЭРЦЫ МАІМ

**Нататкі пра тое, як аўтар гэтых радкоў, ураджэнка Украіны з Харкаўшчыны, здабыла яшчэ адну малую радзіму ў вёсачцы Яцкаўшчына, што ў Ляхавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, непадалёк ад Нясвіжа**

## Цукеркі і газета…

У Мінску, дзе ў свой час апынулася ў сувязі з замужжам, першы год быў неверагодна цяжкім для мяне: прастудныя хваробы апаноўвалі адна за другой. Беларускае надвор'е не радавала: халаднаватае лета, трэць года льюць дажджы, за вокнамі туман, мала сонца — шэрасць… Як цяпер разумею, для мяне, народжанай на паўднёвым усходзе Украіны, дзе лета было сухім і гарачым, а зімы халодныя і сонечныя, прывыкнуць да вільготнага клімату Беларусі аказалася няпроста. І сама сабе нагадвала я вырванае з жыватворнай глебы дрэва, якое ніяк не можа прыжыцца ў чужой краіне.

Не скажу, што гэтая краіна мяне не цікавіла. Пра Беларусь, якая і ў студэнцкія гады ў Кіеве падавалася мне далёкім замежжам, пачула яшчэ ў пяцігадовым узросце. У памяці захавалася карцінка…

…Ваўчанск, гарадок майго дзяцінства і юнацтва… Цёплы летні вечар…Я сяджу на лаўцы каля нашага цагляна-чырвонага дома па вуліцы Падгорнай і з захапленнем гляджу ў неба на піруэты вучэбных самалётаў, якія асвойваюць курсанты лётнага - пра тое пазней мне раскажа брат-лётчык. І чакаю яго: абяцаў зайсці… Кідаю позірк да павароткі, за якой дарога налева вядзе ў цэнтр горада, а направа — да аэрадрома. І бачу "дзядзечку", выйшаў да нас, размахваючы вялізнай зялёнай каробкай…

Гэта быў мамін родны брат, якога мы чакалі ў госці ў яго адпачынак. Вось так мой дзядзька Іван і пазнаёміў мяне — праз цукеркі гомельскай фабрыкі "Спартак" з Беларуссю. Я паглынала іх з натхненнем пяцігадовага дзіцяці, якое не часта песцілі салодкім, тым больш — з такой прыгожай каробкі, на якой збоку маленькімі чорнымі літарамі было напісана: Гомель. Прачытанае мною па складах слова чамусьці падавалася вельмі дзіўным. А потым доўга лезла ў галаву, пакуль бацькі не сказалі, што гэта вялікі горад у Беларусі.

А ўслед за Гомелем у свядомасці з'явіўся і Мінск, і не менш смешныя і дзіўныя словы — "дзе", "гэта", "калі", якія я прачытала ў газеце ў сябра бацькі, таксама музыканта, якога, як і дзядзьку, звалі Іванам. Памятаю, як мы "дзекалі" ды рагаталі разам з яго сынам і дачкою: такімі забаўнымі падаваліся нам гукі хоць і незнаёмай, але падобнай да ўкраінскай мовы.

Вось так, напэўна, паступова, зведаўшы ў дзяцінстве яркія ўражанні, у чым пераконваюць нас і сучасныя псіхолагі, мы і выбіраем адну з лёсавызначальных дарог. А потым, калі была студэнткай Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, я пазнаёмілася з беларусамі, адзін з якіх стаў маім мужам… Так апынулася ў Мінску.

## Вёска як стан душы

У Беларусі жыву даўно. Але ўжо, хоць па-ранейшаму і "сонцазалежная", лёгка пераношу туман, сырасць, дажджы. І нават радуюся, калі здараюцца цёплыя зімы: гэта значыць, што і выездаў у Яцкаўшыну, дзе нас чакае даўно апусцелая хата бацькоў мужа, дарэчы, таксама Івана, будзе больш. Ездзім мы туды, за 160 кіламетраў ад Мінска, часта, як правіла, у выхадныя. Я люблю нашу брэсцкую трасу М1/У3, міганне лясоў, пералескаў за шыбкаю аўто. Калі не спяшаемся, то абавязкова збочваем з яе на старую дарогу, што пралягае праз Стоўбцы, Нясвіж… І тады выезд у вёску ператвараецца ў цэлы рытуал. Па дарозе спыняемся, снедаем, п'ём гарбату з тэрмаса, слухаем цішыню, калі гэта восень, і чароўны спеў птушак вясною, які пачынаецца ў красавіку. Нядаўна бачылі касякі гусей, якія вяртаюцца дадому… Ёсць у нас і свае "хлебныя мясціны" пры дарозе — вёсачкі, дзе мы купляем у гаспадынь і малако, і яйкі…

Калі снежныя зімы з маразамі зацягваюцца, я сумую па Яцкаўшчыне і па маіх пажылых прыяцельках, з якімі заўсёды цікава перакінуцца парай слоў. Засталася з іх ўжо толькі адна, былая звеннявая Вольга Круглік.

Сумую і па нашым старым садзе. Сёлета чакаем ўраджай яблык: гэта здараецца раз на два гады. І мы абавязкова паедзем туды ў маі, калі яблыні зацвітуць. І водар будзе на ўсю вёску — райскі, прыпраўлены салаўінымі трэлямі. Відовішча — не перадаць, як гаварыла мая маці. Дарэчы, яна любіла беларускія вёскі ды, параўноўваючы іх з украінскімі сёламі, гаварыла: тут такі парадак, а агароджы каляровыя, а кветнікі якія прыгожыя…

Сумую я і па кошцы-прыгажуні, якая прыбілася да вёскі. Яцкаўцы гавораць: відаць, нехта з-за непатрэбнасці кінуў з машыны. І яна, жывучы ў цёткі Вольгі Круглік, часцяком ходзіць па дварах, дзе кошку, як гэта мы робім, частуюць хто малаком, хто нават сухім кормам. Але асабліва Айша, так я назвала яе, любіць каўбасу "Нясвіжскую": спецыяльна для яе купляем у Клецку.

Яцкаўшчына — не тыповая вёсачка. Яна месціцца па абодва бакі гасцінца, што вядзе з Клецка ў Ляхавічы. І калі пралятаць на вялікай хуткасці, што некаторыя "аўтагоншчыкі" і робяць, то яе можна і не заўважыць: хаты стаяць метраў за 50 ад дарогі, схаваныя ад людскога вока вялізнымі ліпамі, клёнамі, бярозамі, дубамі, а таксама густымі кустамі язміну і бэзу ў палісадніках перад дамамі. А двароў зусім няшмат, каля 12. Некаторыя пустуюць. Жыхароў цяпер у "старой" і "новай" Яцкаўшчыне ўсяго толькі — шасцёра. Яшчэ пара чалавек, як і мы, прыязджаюць у бацькоўскія "гнёзды" час ад часу, а то і на лета.

Да 1959 года хаты Яцкаўшчыны стаялі ў адным месцы — за чыгуначным пераездам, удалечыні ад трасы. Цяпер там жывуць чатыры чалавекі. А на праваслаўнае свята Ушэсце загарэлася адна з хат ад удару стар. 44


ІВАН ЖДАНОВІЧ

У старым садзе, удалечыні ад гарадской мітусні — сапраўдны рэлакс

стар. 43

маланкі. Пажар перакінуўся і на суседнія восем хат, адной з іх была і хата бацькоў мужа. Яны, як і іншыя вяскоўцы-пагарэльцы, пабудавалі новае жыллё на новым месцы, ля гасцінца. І дрэвы пасадзілі…Здорава, расказваў мой свёкар Іван, тады мясцовы калгас дапамог і будматэрыяламі, і грашовымі сродкамі, і збожжам…

## Яцкаўшчына жывая

Цяпер калгас “Беларусь”, да якога адносіцца і наша вёска — гэта ААТ “Жарабковічы”, перадавая гаспадарка ў Брэсцкай вобласці. Доўгі час, з верасня 1982 года, яе ўзначальваў Віталь Бусько, светлая памяць яму: нядаўна пайшоў з жыцця. Больш за 30 гадоў Віталь Іванавіч кіраваў гаспадаркай, якая не толькі славіцца стабільна высокімі паказчыкамі, але і шмат у чым, як гаворыцца, робіць пагоду для ўсяго Ляхавіцкага раёна. У былога старшыні шмат заслуг. Але самая галоўная — удзячнасць і памяць людзей, якім ён вельмі дапамагаў: тое ўласціва і бацькам, якія любяць сваіх дзяцей. Пра яго неаднаразова пісалі журналісты. І мы ў іх ліку. Не абышоў увагай у свой час гэтую вялікую гаспадарку Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Прыязджалі сюды і калегі Віталя Іванавіча: пераймаць досвед. Пры ім у жыццё ўваходзілі новыя тэхналогіі. А як ганарыўся старшыня і новай набытай тэхнікай: маўляў, цяжкая праца вяскоўцаў аблегчыцца. А яшчэ радаваўся, што ўдалося развіць такую галіну, як авечкагадоўля. Уяўляеце, гаварыў ў 2015-м, наш СВК “Жарабковічы” (у той час сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў) папоўніў свой статак за кошт 350 галоў высокапародных авечак мерыналанд з Аўстрыі. Памятаю, як з гонарам ён зачытваў свае словы з цудоўнага пра яго нарыса майго старэйшага калегі Леаніда Екеля: “Ніколі не варта дзяліць людзей на добрых і дрэнных. Груба парушыў дысцыпліну, праштрафіўся, пракраўся — атрымай па заслугах з усімі вынікаючымі наступствамі. Але не здзекавацца ж з чалавека, не зневажаць яго годнасць! Не можа быць шчаслівым той, хто не любіць людзей…”

А яшчэ памятаю, як радасна ён цытаваў самога сябе, чытаючы радкі з таго ж артыкула. У той момант мы, даўно пасябраваўшы з сям’ёй Бусько, сядзелі за сталом у гасцінным доме старшыні, пілі гарбату. І дарослыя яго блізняты-сыны Аляксандр з Іванам, і жонка Рэгіна слухалі ды дапаўнялі галаву сямейства.

Усё, гаварыў ён, правільна напісаў ваш журналіст. І пра тое, што ўсё на зямлі здабываецца цяжкай працай і вялікай энергіяй людзей. Як золата, як вугаль, як нафта. Але карысныя выкапні бяруцца ўжо ў гатовым выглядзе. А мы прадукты — ствараем. І калі любуешся дружнымі ўсходамі і падаецца, што ад іх паветра становіцца злёгку зеленаватым; ці стаіш на краі жытняга поля, над якім струменіцца марыва; ці ва ўборачную, калі ўдыхаеш цудоўны пах хлеба, што хваля за хваляй накатвае ад камбайна, — ты шчаслівы. Ты ў цэнтры ўсёй гэтай

***Ва ўборачную ўдыхаеш цудоўны пах хлеба, што хваля за хваляй накатвае ад камбайна, — і ты шчаслівы. Ты ў цэнтры ўсёй гэтай кругаверці. Ты варышся ў ёй, бязлітасна марнуеш сябе і ў ёй жа чэрпаеш сілы. Але аддаеш заўсёды больш, чым атрымліваеш. Усё па законе кругазвароту...***



Вёска Яцкаўшчына ўвосень

ІВАН ЖДАНОВІЧ



ІВАН ЖДАНОВІЧ



Прыкметы і дары вясковага жыцця

кругаверці. Ты варышся ў ёй, бязлітасна марнуеш сябе і ў ёй жа чэрпаеш сілы. Але аддаеш заўсёды больш, чым атрымліваеш. Усё па законе кругазвароту...

Гэтаму і сыноў сваіх, Аляксандра ды Івана, з маленства вучыў.

А зблізіліся мы з Віталем Іванавічам ды ўсёй яго сям'ёй адразу ж пасля знаёмства, пасля таго, як павазіў ён нас, журналістаў, па палях і фермах, паказваючы сваю гаспадарку. А пасля і ў дом павёў на абед. Дагэтуль мы наведваемся да Рэгіны Сцяпанаўны, перазвоньваемся, абмяньваемся навінамі з Ванем і Сашам, якіх па чарзе і ажанілі. І артыкул пра вяселле Аляксандра пад назвай "Добрая справа — ажаніць сыноў", які быў апублікаваны ў газеце "СБ. Беларусь сегодня" — адзін з маіх любімых.

Праз сям'ю Бусько ды іх аповеды пра нялёгкую вясковую працу я спасцігала напружанае, што называецца, у поце твару, жыццё вёскі. А таксама праз нябожчыка свёкра Івана, які касіў траву з вялікай хуткасцю, а я за ім ледзь паспявала, разбіваючы пракосы, і праз іншую радню мужа, з якой разам убіралі бульбу ці буракі… А свёкар мой — у мінулым механізатар — ну прама-такі быў энерджайзерам, як цяпер гавораць: ні хвіліны не мог пасядзець спакойна, пакуль сілы былі. На касьбу мог падняць і нас у чатыры раніцы: маўляў, не горача, ды і памятаць трэба, што дзень год корміць. А то і мог пры гэтым нагадаць, што лянота — маці ўсіх заган… І моцнае слоўца, бывала, часам ужываў, калі муж мой замаруджваўся. І ніякім чынам не прымаў мае тлумачэнні, што чалавек можа і павольным быць па характары, гаварыў: праца ёсць праца, і яе трэба рабіць хутка. Але мяне паважаў, калі бралася я, скажам, яблыкі збіраць альбо што іншае рабіць па садзе або хаце — за хуткасць ды за смачныя стравы.



Унукі вяскоўцаў любяць бегаць у аўтакраму па духмяныя абаранкі

Вось так паступова Яцкаўшчына запаўняла прастору маёй душы. І там, у душы, цяпер жывуць дзве малыя радзімы. Мелодыю і адной зямлі, і другой я адчуваю. Адна, украінская — мажорная, гарачая, а другая — беларуская — лагодная і спакойная…

Што я, журналістка, магу зрабіць карыснага для другой сваёй малой радзімы? Перш за ўсё — расказаць пра яе ўсяму свету, будучы ўпэўненай, што гэтая вёска будзе жыць дзякуючы аб'яўленаму ў краіне Году малой радзімы. Можа, і мецэнат які, выхадзец з гэтых месцаў, аб'явіцца… А пакуль да вяскоўцаў, якія засталіся ў Яцкаўшчыне, прыязджаюць іх дзеці, унукі і праўнукі, нават з Сан-Францыска, і па меры сіл падтрымліваюць заведзены здаўна парадак: дапамагаць старым. Таму вёсачка захоўвае сваё прывабнае аблічча: хаты і сядзібы — дагледжаныя, сады незакінутыя, палі, дзякуючы традыцыям умелага і прафесійнага гаспадарання на зямлі — у поўным парадку. Дарэчы, узначальвае гаспадарку пасля Віталя Бусько дырэктар Антон Букаты, з мясцовых. Людзі кажуць: толк у рабоце ведае…І дарогі рамантуюцца па вёсках: за гэтым сочыць Жарабковіцкі сельсавет. І трава косіцца своечасова пры дарогах, а таксама пры гасцінцы ля кожнай хаты. Гэта ўжо клопат кожнага вяскоўца. І мы, гараджане, у іх ліку. А ў цяперашні час з мужам збіраем кнігі, каб перадаць іх у Жарабковіцкую школьную бібліятэку. Хоць камп'ютары і актыўна ўвайшлі ў жыццё сельскіх школьнікаў, але ведаем: яны, асабліва малодшыя, любяць хадзіць у бібліятэку.

Валянціна **Ждановіч**




# ПРЫГОЖЫ ВА ЎСІХ АДНОСІНАХ ГОРАД

## ПЯЦЬ ПРЫЧЫН ПАЕХАЦЬ У ЛУНІНЕЦ

### 1. ПАБЫВАЦЬ У ВЯЛІКІМ КАНЬЁНЕ

Зусім не абавязкова ляцець праз паўсвету, каб убачыць Вялікі каньён. Ён ёсць і ў Мікашэвічах, што за 20 кіламетраў ад Лунінца. Гэта кар'ер найбуйнейшага ў Еўропе прадпрыемства па здабычы каменю "Граніт". Глыбіня — каля 140 метраў, перыметр — большы за тры кіламетры. Пейзаж касмічны — нагрувашчванне камянёў усіх мажлівых і неймаверных памераў і адценняў: ад пяшчотнаружовага да чорнага. Вострыя скалы і горныя вадаспады. А па дарогах перасоўваюцца гіганцкія "БелАЗы", якія з вышыні агляднай пляцоўкі нагадваюць дзіцячыя цацкі.

"Каньён" даўно аблюбавалі не толькі турысты, але і кіношнікі. Тут здымалі карціну "Чорны сабака", серыял "Маёр Ветраў". Горныя краявіды настолькі натуралістычныя, што нават мясцовыя людзі, паглядзеўшы фільм, не здагадваюцца, што гэта не Каўказ. Так што, калі шукаеце нябанальны фон для сэлфі, сардэчна запрашаем на "Граніт". Толькі не ў пятніцу — у гэты дзень у кар'еры ідуць узрыўныя работы.


ТАЦЦЯНА КАНАПАЦКАЯ

### 2. ПАСПРАБАВАЦЬ "САЛОДКАГА ЖЫЦЦЯ"

Горад — неафіцыйная клубнічная сталіца краіны. У сезон "чырвонае золата" адсюль вязуць тонамі ва ўсе куткі Беларусі і Расіі. Цэнтр "вытворчасці" — вёска Дварэц. Тут у канцы чэрвеня — пачатку ліпеня праводзяць грандыёзны фестываль клубніц, на які з'язджаюцца знатакі ягад з усёй краіны. Сталы ломяцца, стравы з сезоннага ласунку вылічаюцца дзясяткамі: салаты, торты і пірожныя, пірагі і піражкі, варэнне і джэмы, кісялі і морсы...

Вялізныя клубнічныя плантацыі сталі тут з'яўляцца ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, але цяга да "дольчэ віта" ў мясцовых была заўсёды. Нават першае згадванне Лунінца — у 1449 годзе — з салодкім прысмакам: жыхары плацілі не якую-небудзь, а мядовую даніну!





ВІКТАР ДРАЧОЎ

## 3. ДАВЕДАЦЦА ПРА САКРЭТ “ЧЫРВОНАЙ” ЦАРКВЫ

Самыя ўважлівыя турысты, гуляючы каля гарадской Крыжаўзвіжанскай царквы, могуць заўважыць адно дзівацтва. На купалах храма ў ніжняй частцы крыжоў відаць марскія якары. Адкуль? Лунінец ніколі партовым горадам не быў! Па адной з версій, гэта таму, што руку да ўзвядзення царквы прыклаў сам святы праведны Іаан Кранштацкі. У 1897 годзе, праязджаючы праз Лунінец, ахвяраваў на будаўніцтва дзвесце рублёў.

Пабудаваны з рэдкай для гэтых месцаў чырвонай цэглы храм выглядае, як і сто гадоў назад. Гавораць, сакрэт дзіўнай стойкасці ў незвычайным растворы для муру. Па старадаўнім рэцэпце яго замешвалі без вады — на курыных яйках.

## 4. ПАЧУЦЬ ЖЫВУЮ ПАЛЕСКУЮ “ГАВОРКУ”

Этнографы вылучаюць палешукоў у асобную народнасць.

І ёсць падставы: і культура самабытная, і мова свая ёсць. З’ездзіце ў вёску Лобча, дзе жыве дзіўная жанчына Анастасія Якавец, кіраўнік фальклорнага ансамбля “Лабчанка”. Паслухайце аўтэнтычныя “паляшуцкія спевы”, паўдзельнічайце ў абрадах. Жывую палескую “гаворку” не кожны беларус адразу зразумее. А вядомая паляшучка “по-лобэцку” піша песні, прыказкі, прымаўкі.

Пра што ні спытай Настассю, на ўсё адкажа ў рыфму і з гумарам. На адным са “Славянскіх базараў” яна са сваім ансамблем выклікала сапраўдны фурор, гледачы літаральна заходзіліся з рогату.

Лунінецкі край наогул спрыяе творчасці. Вядома, што менавіта ў Лунінцы класік беларускай літаратуры Якуб Колас пачаў пісаць адзін з самых вядомых сваіх твораў “Сымон-музыка”.

## 5. АДШУКАЦЬ ТАЯМНІЧУЮ ЛАБЕЛІЮ ДОРТМАНА

Прыроднага хараства на Лунінеччыне столькі, што можна пазычаць. Але адзін з самых унікальных помнікаў прыроды — возера Белае. Ідэальнай авальнай формы з крышталёва чыстай вадой. Такі феномен для Палесся — не проста рэдкасць, а нонсэнс. Бо вадзічка ў рэках і вадаёмах Прыпяцкай нізіны карычнева-балотнага колеру. А тут, як у казцы, сярод дрымучага лесу крыштальнае возера. А на ім цэлыя астраўкі надзвычайнай прыгажосці кветак — Лабеліі Дортмана, занесенай у Чырвоныя кнігі Расіі і Беларусі. Зрэшты, і ўзімку тут ёсць на што паглядзець: жывёлы і птушкі без страху выходзяць знаёміцца да гасцей. Для рыбакоў і паляўнічых — і зусім сапраўдны рай!

Калі хочацца драйву, едзьце на раку Прыпяць. Сплаў на байдарках па ёй будзе круцейшы за марскі сёрфінг. Навакольная прырода таксама не расчаруе — лясы ўздоўж берагоў практычна не кранутыя чалавекам..

Ганна **Курак**



Цясніна, вядома, рукатворная, але вадаспады тут — самыя сапраўдныя



НАТАЛЛЯ БАГРАЦОВА

# ЦІКАВЫЯ ХРОНІКІ ВЯЛІКАГА

**Вялікі тэатр Беларусі — гэта не толькі рэпертуарныя і прэм’ерныя спектаклі, але і многія іншыя цікавыя ды крэатыўныя праекты**

### Прыцягальная, як добры бестсэлер

Так-так, гэта я пра адну з апошніх прэм’ер Вялікага тэатра — пра “Тоску” Джакама Пучыні, якая нядаўна бліскуча прагучала на праслаўленай сцэне. У які раз пастаноўшчыкі — Міхаіл Панджавідзэ, рэжысёр-пастаноўшчык, і Аляксандр Касцючэнка, мастак-пастаноўшчык, прадэманстравалі свой, сказала б, фірменны стыль. А гэта значыць і размах, і ўражлівая маштабнасць, ад якіх займае дух, як толькі раскрываецца заслона. Усякі раз, калі Панджавідзэ і Касцючэнка працуюць над спектаклем, мімаволі лаўлю сябе на думцы аб тым, што ў застылых архітэктурных збудаваннях, ці гэта стылізаваныя калоны каталіцкага сабора, як у “Тосцы”, ці іншыя дэкарацыі, як правіла, пульсуе жыццё. Быццам энергія страсцей тут ужо кіпела і напоўніла сабою выяўленча-пластычны вобраз спектакля. Засталося толькі па новай адпусціць спружыну... Лічу, што падобныя адчуванні нараджаюцца, калі ўсё ў спектаклі згарманізавана і пабудавана ў адпаведнасці з музыкай, калі рэжысёр-пастаноўшчык сам добра адчувае і разумее музыку.

Чаму Міхаіл Панджавідзэ зноў узяўся за “Тоску”? Вось як ён гэта тлумачыць:

— “Тоска” — вялікі твор, у якім дзіўным чынам у адзінае цэлае сплятаюцца драматургія і музыка. Талент Віктар’ена Сарду, памножаны на геній Джакама Пучыні, фенаменальна ўздзейнічае на гледача. Зусім не выпадкова менавіта гэтая опера — адна з самых папулярных у свеце, таму і мы не можам надоўга забыць яе. Па гэтай прычыне “Тоска” зноў у рэпертуары тэатра. Вялікі ставіць яе ў шосты раз, а я асабіста ў гэтым тэатры — другі. Героі “Тоскі” — рэальныя асобы XIX ста-

годдзя са сваімі пачуццямі, страсцямі, слабасцямі… Вобраз галоўнай гераіні ў маёй новай інтэрпрэтацыі — гэта вобраз паўшага анёла. Кіруючыся сваімі страсцямі, яна ў выніку паслядоўна становіцца здрадніцай, забойцай і самазабойцай, праходзячы ўвесь шлях смяротных грахоў…

Гэта опера, у якой, як выказаўся напярэдадні прэм'еры Аляксандр Касцючэнка, стаўленне да жыцця будзе паказана праз вобразы анёлаў — белых і чорных, што, дарэчы, знайшло адлюстраванне і ў маляўнічай афішы да спектакля. Так, новая "Тоска" з яе напружаным сюжэтам, які імкліва развіваецца, пачуццёвай, выразнай і глыбокай музыкай Пучыні захапляе настолькі, як калі б ты перачытваў любімы бестсэлер. Здаецца, і канец вядомы, але зноў і зноў рухацца за пачуццямі герояў, ім суперажываць як у першы раз, паглыбляючыся ў віртуальны свет — у гэтым вялікая магія опернага мастацтва.

Паводле слоў Панджавідзэ, "Тоску" ён вярнуў разам з камандай. Гэта значыць, акрамя італьянскага маэстра Джанлука Марчана, галоўнага запрошанага дырыжора Вялікага тэатра, над "Тоскай" працавалі яшчэ і два лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі, згаданы Аляксандр Касцючэнка, уладальнік медаля Францыска Скарыны, і хормайстар-пастаноўшчык Ніна Ламановіч, народная артыстка Беларусі. Дарэчы, хор, як заўсёды, на вышыні. На гэты раз ён гучыць за кулісамі. Партыю Флорыі Тоскі ў той вечар выконвала Ніна Шарубіна, народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Страсная, імпэтная, імпульсіўная, па-дзіцячаму раўнівая, эгаістычная і адначасова даверлівая — гэта ўсё яна, Тоска, якая ідзе на повадзе ў сваіх неўтаймаваных пачуццяў. Цудоўны і вакал мастака Марыа Каварадосі, каханага Тоскі ў выкананні Аляксея Мікуцеля, лаўрэата міжнародных конкурсаў, чый голас крыштальны і свежы. Вядома, пра магутны барытон народнага артыста Беларусі Уладзіміра Пятрова (Барон Скарпія, які ўцягнуў Тоску ў эпіцэнтр палітычных інтрыг) гаварыць не даводзіцца: яго майстэрства і артыстызм добра вядомыя прыхільнікам оперы. Але вобраз, на жаль, агідна каварны і нават мярзотны.

## Успаміны пра Мексіку і пра іншыя гастролі

Яны вельмі прыемныя для Юрыя Траяна, мастацкага кіраўніка балета Вялікага тэатра, народнага артыста Беларусі. Але замежныя гастролі, паводле яго слоў, гэта не толькі задавальненне, але і вялікая праца, напружанне і адказнасць.

— Мы разумеем, наколькі яна вялікая: за намі ж не толькі тэатр, але і Беларусь. Па нас мяркуюць пра яе, мы фарміруем гэтае ўяўленне не толькі аб узроўні нашага харэаграфічнага мастацтва, але і людзях. Нас прымалі з натхненнем, цеплынёй і захапленнем у Берліне, Брэмене, Франкфурце, Гановеры, Лейпцыгу, Штутгарце, Мюнхене, Вене, Зальцбургу — у сёмы раз мы пабывалі ў гэтых ды іншых гарадах Аўстрыі і Германіі, дзе кожны спектакль праходзіў з аншлагамі. І гэта пры такіх вялікіх залах, разлічаных на паўтары-дзве тысячы чалавек! — гаворыць Юрый Антонавіч. — Што цікава, у гэты перыяд, да прыкладу, у Германіі гастралявалі і іншыя балетныя трупы, а нашы залы былі поўныя. Хіба гэта не сведчыць пра цікавасць патрабавальнай нямецкай публікі да беларускага майстэрства харэаграфіі! Дарэчы, сярод гледачоў можна было ўбачыць і тых, хто паўторна прыйшоў на балет. Усім вядома, наколькі нямецкая публіка — публіка дасведчаная, адукаваная, сур'ёзная і патрабавальная, шмат чаго пабачыла. І ёй ёсць з чым параўноўваць нашы спектаклі. Таму мы зведваем вялікае задавальненне ад таго, што выступаем перад такім гледачом, які да таго ж праводзіць артыстаў бурнымі, доўга не змаўкальнымі апладысментамі. Пагадзіцеся, што гэта лепшая ўзнагарода за нашу працу!

Для многіх артыстаў Вялікага тэатра, як піша часопіс "Партэр", студзеньскія гастролі былі не першымі. А вось Арцём Банькоўскі, вядучы майстар сцэны Вялікага тэатра, на вялікія гастролі адправіўся ўпершыню. І чаму Юрый Траян паставіў яго танцаваць адкрыццё — спектакль "Лебядзінае возера"? Ну, далі б чалавеку асвоіцца, падумалася мне. Траян тлумачыць: "Арцём — таленавіты артыст, малады чалавек з вялікімі перспектывамі. І партыю Зігфрыда станцаваў на добрым узроўні".

Што тычыцца "Лебядзінага возера", спектакль быў пастаўлены ў Мінску ў 1986 годзе. Выкарыстана класічная харэаграфія Льва Іванова, Марыуса Петыпа і Аляксандра Горскага. Пяць гадоў назад пастаноўка змянілася: новую рэдакцыю зрабілі балетмайстры Юрый Траян і Аляксандра Ціхамірава.

Пасля Германіі і Аўстрыі беларускія стар. 50



НАТАЛЛЯ БАГРАЦОВА

Каварадосі — Аляксей Мікуцель і Тоска — Ніна Шарубіна

стар. 49 танцоўшчыкі з аднадзённымі гастролямі пабывалі ў Вільнюсе. І нацыянальны балет "Вітаўт" паказалі ў зале "Сіменс Арэны". І зноў поспех, пра што, як гавораць у тэатры, красамоўна сведчылі незмаўкальныя авацыі шматтысячнай аўдыторыі. І, як выказаўся ў адным з інтэрв'ю Траян, у "Вітаўце" расказваецца не гісторыя сям'і — там закручаны справы дзяржаўныя. Бацька Вітаўта, Кейстут, вялікі князь, быў вельмі вядомым воінам. Сам Вітаўт і яго стрыечны брат Ягайла, галоўныя героі балета, — гэта два героі знакамітай Грунвальдскай бітвы, калі славяне перамаглі тэўтонскіх рыцараў, спынілі іх на пэўным рубяжы. Юрыя Антонавіча як пастаноўшчыка цікавіла станаўленне гэтага вялікага князя, які пражыў доўгае жыццё. Гэты балет ён назваў бы гісторыяй пра маладога Вітаўта, які з простага юнака паступова ператвараўся ў дзяржаўнага дзеяча. І перш чым ім стаць, герою трэба было праз многае прайсці.

На мой погляд, поспех балета "Вітаўт" у Літве быў прадказальны. Бо спектакль, які апавядае пра Вялікае Княства Літоўскае, пра чалавека, які пашыраў межы і абараняў гэтыя землі ад тэўтонскіх рыцараў з аднаго боку, ад татараў з поўдня, ад лівонскіх рыцараў з поўначы і гэтак далей, не мог не выклікаць цікавасці ў нашых добрых суседзяў-літоўцаў. Бо гэта наша агульная вялікая гісторыя.


"Лебядзінае возера". Такатошы Мачыяма — Блазан

НАТАЛЛЯ БАГРАЦОВА

А зусім нядаўна балетная трупа Вялікага тэатра вярнулася з Мексікі. Гастролі, другія па ліку ў гэтай краіне, доўжыліся практычна да канца сакавіка. У мінулы раз мексіканцы захоплена прымалі спектакль "Дон Кіхот".

Напярэдадні адкрыцця гастроляў у Мехіка прайшла вялікая прэс-канферэнцыя для мясцовых СМІ з удзелам нашых артыстаў і мастацкага кіраўніка Юрыя Траяна. У Мексіцы пабывалі вядучыя артысты балета Вялікага тэатра Беларусі: Ірына Яромкіна, Яна Штангей, Аляксандра Чыжык, Надзея Філіпава, Ягор Азаркевіч, Арцём Баньkоўскі, Антон Краўчанка, Канстанцін Геронік, Такатошы Мачыяма. Першы спектакль "Лебядзінае возера" Пятра Чайкоўскага ўражваў публіку на сцэне тэатра ў Канкуне. А потым былі тэатральныя пляцоўкі самых розных гарадоў Мексікі: Мерыда, Вілья-Эрмоса, Селая, Ірапуата, Пуэбла, Марэлія, Гвадалахара, Агуаскальентэс, Сакатэкас, Тарэон, Чыўаўа, Хуарэс, Матаморас, Нуэва-Ларэда, Тампіка, Веракрус, Аахака, Кερэтара, Сан-Луіс-Патосі, вядома, і Мехіка ды іншыя.

Больш як паўтара месяца гастроляў, на працягу якіх сыграна 35 спектакляў, вялікія пераезды па краіне і яркія ўражанні, звязаныя з экзатычнымі традыцыямі Мексікі, з цёплым надвор'ем, якое нагадвае беларускае сухое сонечнае лета, калі яно выдасца недажджлівым.

— З балетам "Лебядзінае возера" нас сустракалі гэтак жа добразычліва, як і з балетам "Дон-Кіхот", — гаворыць Юрый Траян. — Як вядома, мова балета, мова інтэрнацыянальная. Таму яна зразумелая ў любой краіне свету. А мексіканскія гледачы — надзвычай адкрытыя, дружалюбныя, усмешлівыя і тэмпераментныя. Дарэчы, мексіканцы вельмі любяць танцаваць, цяга да танцаў у іх у крыві. Яшчэ і таму яны лёгка ўваходзяць у рэзананс з выканаўцамі. Мастацтва балета ім вельмі блізкае. Нашых артыстаў сустракалі і праводзілі авацыямі ўсюды, дзе б мы ні былі, і падоўгу не адпускалі са сцэны.

## Два ў адным

У дзень святкавання Міжнароднага Дня тэатра ва ўтульнай Мастацкай галерэі "Універсітэта культуры" было шматлюдна. У гонар гэтага



"Лебядзінае возера". Арцём Банькоўскі — Зігфрыд

выдатнага свята, а таксама з нагоды 85-гадовага юбілею Вялікі тэатр Беларусі прадставіў арыгінальны праект "Тэатр. Insight" — выставу экспанатаў тэатральнага рэквізіту, эскізаў і касцюмаў да опер і балетаў. У асобнай зале можна было ўбачыць дэкарацыі і касцюмы да спектакляў Вялікага тэатра, якія былі ўдастоены высокіх дзяржаўных узнагарод. "Сівая легенда" Дзмітрыя Смольскага, "Царская нявеста" Рымскага-Корсакава, балет "Вітаўт" Вячаслава Кузняцова. Акрамя таго, ярка глядзеліся і касцюмы, і эскізы да балетаў "Маленькі прынц", "Каханне і Смерць", а таксама да опер "Аіда" і "Набука".

Вялікая частка экспазіцыі прысвечана і дзіцячаму рэпертуару. Прадстаўлены касцюмы, прадметы бутафорыі і маляўнічыя афішы да спектакляў "Віні-Пух", "Айбаліт", "Чароўная музыка", "Церам-Церамок", "Чыпаліна". Выставу ўпрыгожылі і яркія афішы, фотаздымкі і бутафорыя.

Дарэчы, галерэя "Універсітэта культуры" — адно з падраздзяленняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, многія выпускнікі якога працуюць у Вялікім тэатры. Ні многа ні мала — іх каля 60. І адзін з іх — Юрый Траян, ён таксама выйшаў са сцен гэтай ВНУ, якая падчас яго вучобы называлася Інстытутам культуры. Таму так камфортна ў сценах галерэі адчувалі сябе тыя, хто быў звязаны з універсітэтам культуры і мастацтваў, зрэшты, як і іншыя запрошаныя госці. Бо было на што паглядзець!

— Як мне падаецца, наш тэатр выбраў добрую падставу так арыгінальна адзначыць прафесійнае свята акцёраў, рэжысёраў, сцэнографаў, грымёраў, касцюмераў, а таксама інжынераў ды іншых работнікаў праслаўленай сцэны, сумясціўшы яго з 85-гадовым юбілеем Вялікага тэатра, — гаворыць намеснік генеральнага дырэктара Вялікага тэатра Святлана Казюліна. — І на мой погляд — гэта выдатная ідэя.

***Вялікі тэатр Беларусі — адзін з самых наведвальных тэатраў краіны: на яго спектаклях і канцэртах за мінулы 2017 год пабывала каля 228 тысяч гледачоў.***

— Мы прадставілі наведвальнікам выставы гісторыю тэатра, якому споўнілася 85 гадоў, а галоўнае — яго сённяшні дзень. Вялікі тэатр Беларусі — нацыянальны гонар, адзін з сімвалаў краіны, візітная картка нашай сталіцы, — так выказаўся на адкрыцці выставы Уладзімір Грыдзюшка, генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі.

Нагадаю чытачам: Міжнародны дзень тэатра адзначаюць з 1961 года ва ўсім свеце. У Беларусі ў гэты дзень праходзяць дзясяткі святочных мерапрыемстваў. А ў Мінску, дарэчы, Саюз тэатральных дзеячаў Беларусі ў асобе старшыні Саюза драматурга Аляксея Дударава традыцыйна ўручаў тэатральныя прызы — "Хрустальная

стар. 52


МІХАІЛ НЕСЦЕРАЎ

На выставе з нагоды 85-гадовага юбілею Вялікага тэатра і Міжнароднага дня тэатра ў мінскай галерэі "Універсітэт культуры"

стар. 51

кветка", "Хрустальны анёл", "Хрустальная зорка" і "Хрустальная Паўлінка". Цырымонія ўручэння праходзіла на гэты раз у Доме дружбы. Галоўны, 25-ы, юбілейны прыз, быў прысуджаны старэйшай актрысе Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, народнай артыстцы Беларусі Зінаідзе Зубковай.

А тым часам у галерэі "Універсітэта культуры" народныя артысты Беларусі ды іншыя вядучыя салісты ў касцюмах сваіх персанажаў віталі гасцей і ахвотна адказвалі на пытанні журналістаў. Да прыкладу, Ніна Шарубіна, якая з'явілася ў вобразе Лэдзі Макбет з аднайменнай оперы, прызналася, што яна зведвае незнаёмае пачуццё: знаходзіцца ў вобразе і адначасова, як глядач, разглядваць знаёмыя касцюмы і рэквізіты спектакля ў выставачнай зале. А Уладзімір Пятроў прагульваўся як Жэрмон з "Травіяты". Нехта з маіх калег, звяртаючыся да Пятровай і Анастасіі Масквіной, якая была адзета ў касцюм Сенты з "Лятучага галандца", спытаў жартаўліва: ці не адчуваюць сябе народныя артысты Беларусі Пятроў і Масквіна экспанатамі выставы сярод бутафорскіх нацюрмортаў. Гэтае пытанне, вядома, выклікала ўсмешкі і саміх артыстаў, і гасцей галерэі. Уладзімір Пятроў, як сапраўдны джэнтльмен, адказ узяў на сябе і сказаў прыкладна наступнае: на выставе мы ў сваім асяроддзі — умоўным, тэатральным, значыць, у роднай стыхіі. Прыхільнікі опернага мастацтва ведаюць сваіх любімцаў, сочаць за іх творчасцю. Пятроў, дарэчы, працуе ў Вялікім тэатры амаль чвэрць стагоддзя, кар'еру пачынаў з партыі Яўгенія Анегіна, а Масквіна — больш за пятнаццаць гадоў. Упершыню яна выйшла на сцэну Вялікага ў ролі Іаланты ў аднайменнай оперы. А ў чэрвені Анастасія, з чым яна ахвотна падзялілася з журналістамі, адправіцца ў Японію, у Токіа, дзе разам з Расійскім нацыянальным аркестрам пад кіраўніцтвам Міхаіла Плятнёва будзе спяваць партыю Іаланты.

З задавальненнем мы мелі зносіны і з іншымі персанажамі опер і балетаў, любаваліся серыяй жывапісных работ "Страсці па "Лебядзіным возеры" Кацярыны Булгакавай, мастака па касцюмах, а таксама фотаздымкамі да многіх спектакляў Вялікага тэатра, якія адлюстроўваюць гісторыю іх стварэння Валянцінай Філімонавай, Анікай Нядзелькай і Міхаілам Несцеравым, фатографамі, якія супрацоўнічаюць з Вялікім тэатрам.

Ад Міхаіла Панджавідзэ, уладальніка медаля Францыска Скарыны, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі і галоўнага рэжысёра Вялікага, мы даведаліся і пра планы тэатра, у прыватнасці і пра тое, што ў цяперашні час ён напружана працуе над музычнай драмай Рыхарда Штрауса "Саламея". Мяркуецца, што ў пачатку верасня новы 86-ы сезон адкрыюць прэм'ерай гэтага спектакля. А пакуль што ў канцы красавіка чакаем новую "Багему" Джакама Пучыні.

Валянціна **Ждановіч**



Салісты Вялікага тэатра ў вобразах сваіх герояў на выставе адчувалі сябе натуральна

**Гаўрыіл Вашчанка — з катэгорыі прыкметных постацяў сучаснай беларускай культуры. За паўстагоддзя натхнёнай працы мастак стварыў палотны, якія, без перабольшвання, з'яўляюцца нацыянальнай эстэтычнай каштоўнасцю.**



# ГАЎРЫІЛ ВАШЧАНКА: ТАМ, ДЗЕ Ў МАСТАЦТВЕ ГУБЛЯЕЦЦА ДУША, ГУБЛЯЕЦЦА І САМО МАСТАЦТВА

Яму не трэба было хваляваца аб прызнанні. Яго ў творцы было спаўна. Гаўрыіл Вашчанка — народны мастак Беларусі. Гэтага дастаткова, каб гаварыць пра творчую асобу, якая атрымала вышэйшую ацэнку свайго таленту і грамадзянскай пазіцыі.

Ён нарадзіўся на Палессі. І назаўсёды застаўся пранікнёным песняром-жывапісцам роднага краю, усёй Беларусі. Так, Гаўрыіл Вашчанка з таго пакалення, якое гартавалася ў полымі апошняй сусветнай вайны, а потым, дзесьці з шасцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя, рашуча ламала тагачасныя псеўдамастацкія догмы.



Палотны Гаўрыіла Вашчанкі пераканаўча сведчаць: высокае мастацтва пачынаецца з жывых нацыянальных каранёў. Цераз асобу, цераз нераўнадушнае адчуванне сваёй зямлі ён сказаў непаўторнае слова і пра нашу мінуўшчыну, і пра сённяшнія дні.

Між тым, творы Гаўрыіла Вашчанкі — гэта філасофскае спасціжэнне будучыні. Сустракаўся з і хаўтарам неаднойчы. Але апошняя размова з мастаком неяк па-асабліваму яго адкрыла: шчырага ў сваіх памкненнях занатаваць радзіму не вокам староннята назіральніка, а з сапраўдным душэўным хваляваннем. Ва ўсялякім выпадку так падаецца цяпер, праз гады, калі няма з намі Майстра. У гэтым пераконваюць і ягоныя адказы на тагачасныя пытанні, што засталіся на дык-

стар. 54



стар. 53 тафоне. Я мусіў толькі іх перанесці спачатку на камп'ютар, а потым і на паперу. Прапаную той дыялог вашай увазе.

— Скажыце, калі ласка, што для вас у творчасці становіцца пабуджальным імпульсам, які заахвочвае звярнуцца да той ці іншай тэмы?

— Мне падаецца слушнай думка вялікага фізіёлага Паўлава: калі ў галаве нараджаюцца ідэі — вочы бачаць факты. Асноўным імпульсам для мяне бываюць проста разважанні пра тыя ці іншыя падзеі, пра мае адносіны да іх. А потым пачынаецца збіранне фактаў, якія б пацвердзілі гэтую ідэю. Так, напрыклад, была напісана карціна "Балада пра мужнасць". Гэта адбылося праз трыццаць гадоў пасля вайны. Для мяне было важным асэнсаванне таго, як я праз дзесяцігоддзі ўспрымаю ваеннае ліхалецце, якое напаткала маю краіну, сведкам якога стаў я сам. У той час пра вайну пісалі шмат: франтавікі, людзі, якіх вайна непасрэдна зачапіла... Мне ж захацелася зірнуць на падзеі менавіта з вышыні часу. Але трэба было знайсці пластычнае вырашэнне тэмы. Пошукі цягнуліся доўга. Неяк пайшоў у лес, стаміўся, лёг пад дрэвамі і пабачыў уверсе, як самкнуліся хвоі. Вось тады і з'явіўся даволі нечаканы пункт гледжання на карціну. Адны падзеі — калі я гляджу зверху: з адлегласці ў 30 гадоў. І другія — калі я сам іх сведка. Гэта быў прынцып пабудовы карціны.

— Калі падсумаваць, то што ўсё ж з'яўляецца звычайна першасным паводле стварэння мастацкага твора?

— Тут адназначна адказаць нельга. Таму што ў адным выпадку гэта бывае мая развага пра жыццё. У іншым — факт жыццёвы з'яўляецца штуршком для развіцця тэмы. Але бывае і так: бяссонная ноч, перад вачыма праходзяць нейкія падзеі. Прыходзіш на наступны дзень у майстэрню, ставіш палатно на мальберт, праводзіш дзве лініі і цябе пацягнула зусім у іншы бок. Мабыць, нейкая падсвядомасць працуе паралельна.

— Усе вашы работы маюць выразны філасафічны падтэкст. Што адбываецца спачатку: нараджаецца канцэпцыя твора альбо пішацца палатно, да якога дадаюцца пэўныя аўтарскія развагі?

— Не заўсёды аднолькава ідзе працэс работы. Як правіла, у майстэрню ўжо прыходзіш падрыхтаваны. Калі сустракаешся з палатном, тут уключаецца працэс падсвядомасці. Напрацоўваеш, а ў канцы ці назаўтра пачынаеш аналізаваць.

— Для вас кожная карціна — гэта вынік напружанай працы, ці ўсё занадта працсей?

— Карціны, як вершы, бывае, ідуць, бывае — не. Іншы раз зробіш палатно на адным дыханні. А іншы — перарабляеш, перарабляеш... Напрыклад, я пісаў палатно "Грунвальдская бітва", якое памерам два на чатыры метры з вялікай колькасцю фігур, зброяй. Вельмі доўга ішоў працэс збірання матэрыялу: гэта і бібліятэкі, і альбомы... А потым, калі ўжо ўвесь матэрыял быў падрыхтаваны, я за паўгода напісаў гэтае палатно.

— А калі вы ў рэшце рэшт знайшлі сябе ў мастацтве жывапісу? Калі адчулі, што не маеце патрэбы ў кардынальных зменах стылю і мовы сваіх твораў?

— У мяне атрымалася двайное нараджэнне. Я скончыў інстытут і ўжо быў лаўрэатам некалькіх конкурсаў маладых мастакоў, удзельнічаў у рэспубліканскіх выставах. Але сапраўдным творцам сябе адчуў, калі пераехаў з Малдовы ў Мінск — на радзіму. Я пісаў нацюрморт "Галінка цыкламена". Я яго не спісваў, а ствараў. Толькі тады адчуў, што я творца. Гэта было маё фармальнае сцвярджэнне. Я знайшоў сваё разуменне пластыкі, свой почырк. А грамадзянскае сцвярджэнне я адчуў, калі напісаў карціну "Маё Палессе". Гэта былі людзі, якіх я бачыў на Піншчыне, Гомельшчыне.

— Складваецца ўражанне, што ў беларускім жывапісе у балансе формы і зместу, калі так можа сказаць, наперадзе ўсё ж крочыць форма. Падаецца, што менавіта яна — асноўны рухавік у творчасці многіх беларускіх мастакоў. Ці добра гэта? Ці не губляецца нешта ў мастацтве, калі ісці такім шляхам?

— У мастацтве заўсёды была рэч, якая характарызавала тую ці іншую эпоху і аўтара. Гэта часцей ішло менавіта праз форму. Але форма, як я лічу, гэта толькі сродак для выказвання тых ідэй і думак, якія хоча раскрыць аўтар. Калі форма не з'яўлялася выразнікам думак, то гэта называлі фармалізмам. Гэта форма дзеля формы. Альбо мастацтва ні аб чым. Бывае, калі ідэі пераважаюць над формай і бывае калі проста мастакі шукаюць новыя формы. Адны шукаюць іх для адлюстравання сваіх думак. Іншыя лічаць, што жывапісны твор — гэта перш за ўсё форма, фактура, колер. Зусім адмовіць такі падыход таксама нельга. Бывае, на дадзеным этапе аўтар не зрабіў цэласнага твора, але для роздуму, для развагі палажыў каменьчык. Іншыя пакаленні возьмуць гэты каменьчык і пабудуюць цэласны будынак.

— Ці з'яўляецца крытэрый прыгажосці ў сучасным мастацтве важным?

— Па-першае, прыгажосць — досыць абстрактнае разуменне, у розныя часы па-рознаму фармулюецца. Калі разглядаць прыгажосць з нашага разумення, з нашага веку, то яна патрэбна мастаку перш за ўсё дзеля таго, каб цябе пачулі, звярнулі ўвагу. Калі твор сваім знешнім выглядам не прыцягвае гледача, ён застаецца неразгледжаным. Калі твор прыцягвае, тады глядач пачынае ўглядацца ў глыбіню: аб чым там ідзе гаворка.

— Увогуле, сёння жывапіс актуальны? Ці не страціў сваёй прыцягальнай сілы ў параўнанні з ранейшымі часамі?

— Наш век электроннай інфармацыі, зразумела, шмат забраў. Раней канцэнтрацыяй думак былі музеі. Сёння можна не выходзіць з дому. Жадаем мы таго ці не, сучасны чалавек вельмі інфармаваны. Але ж у вялікім творы чытач больш пазнае праз радкі, чым у радках. Пісьменнік пакідае яго пры роздуме. Глядач, які прыходзіць у музей і сутыкаецца з арыгіналам, таксама фарміруе самастойны погляд на жыццё, на ўспрыманне мастацтва. Ніякія сродкі масавай інфармацыі не перадаюць тое хваляванне жывапісу, тую энергію, якія закладвае мастак у карціну.

— Што было найбольш істотным, што ўплывала на вашу творчасць? Час? Людзі? Вашы асабістыя думкі?

— Першымі, як і, напэўна, ва ўсіх у жыцці, былі дзіцячыя ўражанні. Потым — паэзія, музыка, літаратура, сустрэчы з людзьмі. У Кіеве я вучыўся ў вучылішчы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, потым у Львове — на фалькультэце манументальнага жывапісу. То быў час фарміравання нацыянальнай свядомасці. Вось тады і стаў задумвацца, хто я, чым буду займацца, над чым працаваць.

— У вас багаты творчы шлях. Зрабілі шмат работ. Сталі народным мастаком Беларусі. І ўсё ж, як самі ацэньваеце гэты шлях. Наколькі ён быў удалы? Ці здолелі рэалізаваць сябе?

— Самаацэнкай цяжка займацца. Дзякуй Богу, што даў мне даўгалецце. 80 гадоў — гэта салідна. Я вельмі рады, што за гэты час здолеў рэалізаваць тое, што было задумана. Што тычыцца майго ўкладу ў беларускае мастацтва: я, перш за ўсё, ганаруся тым, што стварыў аддзяленне манументальнага жывапісу ў Акадэміі і падрыхтаваў больш за дзвесце вучняў. Яны цяпер вядучыя майстры выяўленчага мастацтва Беларусі.



Канешне ж, я задаволены тым, што мае творы атрымалі прызнанне: і на радзіме, і за мяжой.

— Што найболей вызначае асобу мастака? Што больш уплывае на яго творчы партрэт?

— Час заўсёды ўплывае. Іншы раз пішуць аб тым, што мастак апярэдзіў час. Не, ён застаецца прадстаўніком менавіта свайго часу. Іншая справа, што ягонымі адкрыццямі карыстаюцца будучыя пакаленні, здабыткі сапраўднага творцы на многія часы застаюцца. Але ён усё ж з'яўляецца мастаком свайго часу. Я больш за 40 гадоў выкладаю. Мяне часта пыталіся: ці перашкаджае педагагічная праца творчасці? Я заўсёды адказваю: так, з аднаго боку педагагічная праца забірае шмат часу, але з другога боку, калі ты сустракаешся з моладдзю, ідэі, рытм жыцця іншага пакалення перадаюцца табе, прымушаюць трымаць форму, сачыць за тымі кірункамі, якія ўзнікаюць у моладзі. Атрымліваецца, што з аднаго боку я ім даю свае веды, з другога — яны падсілкоўваюць мяне даволі смелымі поглядамі на рэчаіснасць. Так і ў сучасным мастацтве.

— Вы разумееце маладых мастакоў? Як успрымаеце іх творчасць?

— Адных я ўспрымаю нармальна, з іншымі спрачаемся. Гэта закон жыцця, ад яго нікуды не схаваешся.

— Творы беларускіх мастакоў адрозніваюцца ад мастацтва замежнага? Наогул, ці важна тое, дзе чалавек жыве?

стар. 56

***У мастацтве заўсёды была рэч, якая характарызавала тую ці іншую эпоху і аўтара. Гэта часцей ішло менавіта праз форму. Але форма, як я лічу, гэта толькі сродак для выказвання тых ідэй і думак, якія хоча раскрыць аўтар. Калі форма не з'яўлялася выразнікам думак, то гэта называлі фармалізмам. Гэта форма дзеля формы. Альбо мастацтва ні аб чым***



*Я ўсё ж такі мастак XX стагоддзя. А ад мастакоў-сучаснікаў чакаю таго, як яны сфармулююць XXI стагоддзе. На жаль, пакуль гэта пошукі болей фармальныя. Яны не адлюстроўваюць у поўнай ступені тыя праблемы, якія хвалююць чалавека. Ёсць непачатыя, нераскрытыя тэмы. Жадаю, каб доўга не замыкалася ў фармальных пошуках моладзь, выйшла на сваю тэму, знайшла свайго гледача*

стар. 55

— Ёсць разуменне мастацтва і цывілізацыі. Цывілізацыя — гэта здабыткі розуму. Мастацтва — душа чалавека. А душа гэта заўсёды адлюстраванне менталітэту народа. Там, дзе ў мастацтве губляецца душа, а пачынае пераважаць розум, губляецца само мастацтва. На жаль, прыматам сённяшняга дня чалавецтва абрала цывілізацыю. У айчынным выяўленчым мастацтве мы не згубілі, бадай, галоўнае — школу. Вось чаму яно з'яўляецца канкурэнтаздольным і за мяжой. У Амерыцы, Еўропе таксама пачынаюць усведамляць гэта і імкнуцца адрадзіць школу. Малевіч, Кандзінскі экспарціравалі мастацтва за мяжу. І яно там знайшло сваю глебу, распаўсюдзілася, — у асноўным у еўрапейскім асяродку, але школу там згубілі. Цяпер пачынаюць вяртаць.

— А ці ёсць беларуская школа жывапісу?

— Ёсць. Асабліва гэта было зразумела, калі яшчэ існаваў Савецкі Саюз і часцяком ладзіліся ўсесаюзныя выставы. Лёгка было адрозніць беларусаў ад малдаван, грузін.

— Чым жа вылучаецца беларуская школа жывапісу? Чым яна, у прыватнасці, кранае замежнага гледача?

— Перш за ўсё, нашы творы адрозніваюцца высокім прафесіяналізмам, каларыстычнай адметнасцю, кампазіцыйнай трактоўкай.

— Мастак павінен быць чалавекам свабодным? Сённяшні час дае мастаку магчымасць рэалізаваць сябе?

— Мне здаецца, што ў мастацтве заўсёды павінна натхняць нацыянальная ідэя. Калі яна ёсць, тады ствараюцца вялікія творы.

— Вам больш блізкае мастацтва, якое адлюстроўвае рэчаіснасць? Ці тое, якое будуецца на асацыятыўнасці? Уласна кажучы, вы за рэалізм у мастацтве ці за фігуратыўнасць?

— Я не згодны, ніколі не прызнаю за шчырасць, калі мастак кажа, што я пішу для сябе. Калі я паставіў палатно, то хачу падзяліцца з кімсьці думкамі. Я напісаў карціну, прынёс яе на выставу, бо я хачу размаўляць з гледачом. Але для гэтага я павінен карыстацца мовай, з дапамогай якой мяне б зразумелі. Інакш, для таго, каб размаўляць, трэба навучыцца размаўляць.

— А размаўляць пра што?

— Я размаўляю пра гісторыю свайго народа, пра сваю радзіму.

— Суразмоўцу якім вы ўяўлялі?

— Арыентаваўся на людзей, якія цікавяцца выяўленчым мастацтвам, любяць яго.

— Што асабліва важна для сучаснага мастака?

— Я ўсё ж такі мастак XX стагоддзя. А ад мастакоў-сучаснікаў чакаю таго, як яны сфармулююць XXI стагоддзе. На жаль, пакуль гэта пошукі болей фармальныя. Яны не адлюстроўваюць у поўнай ступені тыя праблемы, якія хвалююць чалавека. Ёсць непачатыя, нераскрытыя тэмы. Жадаю, каб доўга не замыкалася ў фармальных пошуках моладзь, выйшла на сваю тэму, знайшла свайго гледача.

— Што ж, гэта было б цікава. Бо і мы гэтага чакаем.

Вось такі тады адбыўся дыялог. Для мяне ён падаецца змястоўным і сёння. Бо тыя адказы мастака — гэта не толькі разважанні таленавітага творцы, чалавека з вялікім жыццёвым досведам, адданага роднай старонцы. Гэта таксама погляд сучасніка на будучыню ў яе грунтоўным спалучэнні з мінулым. А такая філасофія, такая дыялектыка заўсёды заслугоўвае павагі.

Уладзімір **Міхайлаў**

# НОВАЯ АДМЕТНАСЦЬ




**Часопіс для тых,
хто жадае ведаць больш**



*На Алімпіядзе ў Пхёнчхане Ганна Гуськова заваявала золата, выканаўшы праграму так, што нікому не верылася, што ў лыжную акрабатыку дзяўчына трапіла шмат у чым дзякуючы збегу абставінаў*

# ПЕРАЗАГРУЗКА ДЛЯ БІЗНЕСУ

## Дэкрэт аб развіцці прадпрымальніцтва кардынальна мяняе правілы дзелавой гульні

На днях решил провести небольшой эксперимент. Обратился в налоговую инспекцию. Мол, хочу открыть на дому мастерскую по ремонту компьютеров, к кому обращаться, с какими документами и так далее. Приготовил бумагу, ручку, чтобы записать пошаговую инструкцию. Вошел в образ и мысленно настроился на то, что придется побегать по инстанциям, чтобы собрать необходимые справки и разрешения. Однако доброжелательная сотрудница инспекции сразу же успокоила: время и нервы на открытие своего дела тратить теперь не придется. Достаточно просто подать уведомление, заплатить единый налог (в моем случае 97 рублей) и можно хоть завтра приступать к работе. Всего определено около двадцати видов деятельности, которые теперь можно осуществлять без государственной регистрации в качестве индивидуальных предпринимателей. В том числе выпечка и продажа кондитерских изделий, дизайн интерьеров, ремонт обуви, пошив одежды, облицовка стен, штукатурные и малярные работы, кладка печей и каминов, парикмахерские и косметические услуги. И это далеко не единственная новация для бизнеса.

